№ 40 (446) 28 кастрычніка 2005 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Фонд выданьня газэты «Наша Ніва». Выходзіць штотыднёва, у пятніцы

## З чым Мілінкевіч едзе ў Расею

«Выдатна, калі яны таксама будуць шчырымі».

старонка 3

## Фёдар Іваноў і самалёт Сідорскага

Суд над былым кіраўніком Дзяржавіяцыі.

старонка 4

## «Я ў іх веру, іх люблю»

Інтэрвію Зянона Пазьняка «НН».

старонка 12



### КУЛЬТУРА

**Міхаіл Фінберг: Некаторыя артысты выбіраюць лёгкі шлях**

Кіраўнік Нацыянальнага аркестру адказвае на пытаньні карэспандэнта «НН». **Старонка 10.**

### МУЗЫКА

**«Бабры» адпелі сваё**

У Бабруйску прайшоў фэстываль «Рок за баброў». Зь Міністэрства культуры былі атрыманы афіцыйны дакумэнт, што міністэрства нічога ня мае супраць выступу беларускіх рок-гуртоў. **Старонка 8.**

### СТЫЛЬ ЖЫЦЬЦЯ

**Юбэрсэксуалы**

Мужнасьць ізноў у модзе. На месца заклапочаных фрызурамі і адзеньнем мэтрасэксуалаў прыходзяць самцы, настроеныя на якасьць ва ўсіх сфэрах жыцьця, — пішуць аўтары кнігі «Будучыня мужчыны». Але самцы адказныя і грамадзянскія. Як Бона ці Клуні. **Старонка 21.**

### ЛІТАРАТУРА

**Сыліконавая канава**

П'еса Аляксандра Апона. Дзеючыя асобы: Антон Сяргеевіч — акадэмік. Сева — малады чалавек, гадоў пад сорак. Іван Іванавіч — ідэалягічны работнік пры райвэртыкалі, кароценькі з пузанятам. Цётка Гэля — у бруднай сукенцы і галёшах на босую нагу, вельмі спраўная. **Старонка 19.**

**Многія чытачы**

скардзяцца, што стала цяжка купіць «НН» у шапіках. Рэч у тым, што дзяржаўным распаўсюдніцкім арганізацыям забаронена павялічваць колькасьць асобнікаў «НН» у продажы. Улады спрабуюць падперці кіем гару — стрымаць нацыянальнае станаўленьне Беларусі. Што рабіць чытачам? Ласкава прасіце кіяскёрак замаўляць больш асобнікаў газэты. А таксама — падпісвайцеся! Гэта можна зрабіць на любой пошце. Падпісны індэкс «НН» 63125. Падпіска каштуе 4510 рублёў на месяц. Падпіска на шапікі «Белсаюздруку» таньнейшая: 3440 руб. на месяц. «Наша Ніва» — гэта 24 старонкі праўдзівай інфармацыі і вострых камэнтароў штотыдзень.

# Дзяды

Як беларусы памінаюць продкаў — **старонка 2**. Блізкія і далёкія: у Дзень Задушны з тымі, хто без пары паляглі дзеля Айчыны — **старонка 17**. Подзьвіг Леаніда Маракова: вяртаньне імёнаў ахвяраў тэрору — **старонка 16**.



АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

**«Калі сыдуць мае дзяды, Мяне таксама стане меней...» Вершы Ўсевалада Сьцебуракі — старонка 2.**

## І Чавэс такі малады

Аляксандар Лукашэнка на мінулым тыдні прымаў міністра замежных справаў Вэнэсуэлы, бо марыць пра сустрэчу **з прэзыдэнтам Чавэсам**, пастаўшчыком таннае нафты на Кубу. Рэпартаж спэцкара «НН» **Лёліка Ўшкіна з Вэнэсуэлы,** новай саюзьніцы Беларусі па антыамэрыканскім альянсе.

Яшчэ на Кубе мне ўсе вушы пракампасьціравалі рэвалюцыяй у Вэнэсуэле. На кожным кроку — плякат з выявай тандэму Фідэля і Чавэса. Ходзіць нават анэкдот, што Уга і Фідэль — палюбоўнікі. Адпраўляючыся ў Каракас, ужо несьвядома рыхтуесься да кубінскіх міязмаў сацыялізму, накшталт дэфіцыту макароны.

Працяг на старонцы 11.

## Дацкі ўзор для беларускай сельскай гаспадаркі

Дацкая сельская гаспадарка ўтрая больш эфэктыўная за беларускую. Хоць клімат той самы. Як ператварыць Беларусь у Данію? Вярнуцца да ідэяў Прышчэпава. Піша эканаміст **Уладзь Калупаеў.**

У 1920-я гады сярод эканамістаў БССР была папулярнай ідэя разьвіцьця сельскай гаспадаркі паводле ўзору Даніі. Тагачасны наркам земляробства Зьміцер Прышчэпаў нават казаў: «Беларусь у разьвіцьці сельскай гаспадаркі мусіць стаць Даніяй на ўсходзе Эўропы». Але ў верасьні 1929 г. Прышчэпаў быў зьняты з пасады народнага камісара земляробства па абвінавачаньні ў «правым ухіле», а масавае стварэньне калгасаў паставіла крыж на праекце беларускіх эканамістаў. Калі мы хочам сапраўднага адраджэньня беларускай вёскі, самая пара вярнуцца да «дацкага праекту».

Працяг на старонцы 5.

# Як беларусы памінаюць продкаў

Перад Дзядамі абавязкова ішлі на могілкі, прыбіралі магілы, а ў хаце перад самым сьвятам мылі вокны. Вымытая й прыбраная хата чакае сваіх былых жыхароў. На стале мусіць быць багата страваў, што сымбалізуюць спрадвечныя беларускія ўяўленьні пра сытасьць: кілбасы, кумпякі, сыры, сала.

Галоўнай памінальнай стравай лічылася куцьця. Яе запраўлялі салам або маслам, варылі халадзец, пяклі бліны. Памінальнай стравай былі і клёцкі, запраўленыя скваркамі з цыбуляй ці сьмятанай.

Па кавалачку кожнай стравы пакідалі на асобнай талерцы продкам. Гэта было як прычашчэньне з усімі продкамі. Налівалі дзядам і чарку. Галава сям'і клікаў: «Сьвятыя дзяды, ідзіце сюды!»

Зрэшты, можна абысьціся і без традыцыйнага стала. Дзяды — глыбока асабістае сьвята. У гэты дзень у храмах праходзяць набажэнствы. Таму проста наведайце 2 лістапада храм, прынясіце адтуль асьвячоную сьвечку, запаліце яе дома ды памаліцеся. Згадайце добрым словам сваіх дзядоў ды паразважайце пра мінуўшчыну і будуыню.

**Сяргей Будкін**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

### Дзяды ў Курапатах

Гэтым разам Дзяды прыпадаюць на рабочы дзень (сераду), таму жалобныя сьвецкія мерапрыемствы пройдуць у выходныя.

**29 кастрычніка**, а 10-й раніцы Партыя БНФ ладзіць у Курапатах талаку. А 12-й ва ўрочышчы будзе ўсталявана шыльда на памятным камені. А 12-й жа кветкі ў Курапатах ускладзе лідэр Аб'яднаных дэмакратычных сіл **Алесь Мілінкевіч**.

У нядзелю **30 кастрычніка** свае мерапрыемствы ў Курапатах ладзіць Кансэрватыўна-хрысьціянская партыя БНФ. У 10.30—11.00 удзельнікі шэсьця зьбяруцца на бульвары Талбухіна (ст.м.«Парк Чалюскінцаў»), пройдуць па маршруце праспэкт Скарыны—Каліноўскага—Сядых—Карбышава—Мірашнічэнкі. Мітынг пройдзе ля Народнага мэмарыялу памяці ахвяраў бальшавіцкага тэрору (14.30—17.00). Шэсьце і мітынг дазволены ўладамі.

### Дзяды на радзіме Каліноўскага

У райцэнтры Сьвіслач (Гарадзенская вобласьць) **30 кастрычніка** пройдзе традыцыйнае ўшанаваньне памяці братоў Каліноўскіх. Пачатак а 11.30. Збор ля касьцёлу Сьв.Францыска Асыскага, дзе пройдзе набажэнствы. Будуць таксама ўскладзены кветкі да магілы Віктара Каліноўскага, помніку Кастусю Каліноўскаму і Рамуальду Траўгуту, мяркуецца выезд у былы маёнтак сям'і Каліноўскіх у Якушоўку. Да Сьвіслачы можна даехаць з Горадні рэйсавым аўтобусам.

### УСЕВАЛАД СЬЦЕБУРАКА

ДЗЯДЫ

Калі сыдуць мае дзяды,
зь зямлі адыдзе пакаленьне,
ў якога вырас на каленях,
пакіне на крыжах каменных
свае імёны і гады.

Калі сыдуць мае дзяды,
у тое ж самае імгненьне
уключыцца адлік забвеньня —
ці будзе мне ставаць цярпеньня
ў адведкі езьдзіць на клады?

Калі сыдуць мае дзяды,
адчуўшы сэнс у слове «страта»,
заўважу, як старэе тата,
якой пустой здаецца хата
бяз гукаў іхняе хады.

Калі сыдуць мае дзяды,
мяне таксама стане меней,
падоўжацца ад сьвечак цені
і падмацуюцца сумненьні,
што й я ужо не малады.

## Штуршок языкам

«**Справа Ганчара** аднаўленая», — заявіў дэпутат палаты прадстаўнікоў **Анатоль Салаўёў**, выступаючы 24 кастрычніка ў парлямэнце. Напярэдадні ён паведаміў гэтую навіну сваім эўрапейскім калегам на асамблеі Міжпарлямэнцкага саюзу ў Жэнэве. Жонка зьніклага палітыка **Зінаіда Ганчар** гэтую «сэнсацыю» рашуча абвяргае: справу ніхто не прыпыняў увогуле. «Я сёньня размаўляла са сьледчым гарадзкой пракуратуры Пухаронкам, пыталася, адкуль зьявілася інфармацыя пра аднаўленьне справы. Ён параіў мне спытацца ў таго, хто пра гэта гаварыў». Як высьвятляецца, сьледзтва па справе Ганчара як вялося, так і вядзецца — без аніякага выніку. На думку З.Ганчар, заява пра тое, што расьсьледаваньне зьнікненьня Ганчара набыло новы штуршок, — пусты гук і пусканьне пылу ў вочы замежным палітыкам.

Ці не баіцца З.Ганчар таго, што ў выніку перамогі дэмакратыі ў Беларусі з гучнымі справамі адбудзецца тое ж, што і ва Ўкраіне, дзе іх ніяк ня могуць ці не жадаюць давесьці да канца? «Натуральна, баюся, — кажа яна. — У мяне былі вялікія спадзевы, што **Юшчанка** прыйдзе і злачынцы будуць пакараныя. А цяпер складваецца ўражаньне, што там нічога не зьбіраюцца рабіць. І гэта крыўдна: ня толькі я мела надзеі, што пакараньне забойцаў **Гангадзэ** зробіцца своеасаблівым штуршком для беларусаў. Тым больш што ва Ўкраіне, як і ў нас, у арганізацыі забойства абвінавачвалі высокае кіраўніцтва». Пра стварэньне **Людмілай Карпенкай** грамадзкага міжнароднага трыбуналу, што будзе займацца расьсьледаваньнем злачынстваў, З.Ганчар кажа коратка: «Робяць — і дзякуй богу».

**Алесь Кудрыцкі**

## Канфлікт Кучынскага з Тозікам: працяг


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**У беларускіх вярхах працягваецца вайна за перадзел сфэраў уплыву над прыбытковымі прадпрыемствамі. 24 кастрычніка дырэктар Беларускага мэталюргічнага заводу** Мікалай Андрыянаў (на фота) **заявіў, што можа зьвярнуцца ў суд у адказ на ліст эканаміста БМЗ, абнародаваны дэпутатам Віктарам Кучынскім. У лісьце дырэктара БМЗ абвінавацілі ў «прыпісках» і некампэтэнтным кіраваньні прадпрыемствам, што прывяло да шматмільённых стратаў. Аўтар ліста таксама заявіў, што Андрыянаў мае асабістыя камэрцыйныя інтарэс з С.Сідорскім і А.Тозікам.**

### «Transparency International»: Беларусь у адным шэрагу з Гандурасам

Міжнародная арганізацыя «Transparency International», якая вывучае карупцыю і змагаецца з ёй, абнародавала сваю справаздачу за гэты год. Яе высновы несуцяшальныя для Беларусі. Адпаведны паказчык склаў сёлета для Беларусі 2,6. Краіна патрапіла ў адзін шэраг з Гандурасам, Зымбабвэ, Украінай. Праўда, паказчыкі Расеі яшчэ горшыя.

Ступень карумпаванасьці ў Беларусі расла ўсе апошнія гады. З 1998 па 2002 год адпаведныя індэксы для Беларусі вагаліся ў раёне 4-х, і краіна заставалася ў сьпісе 50-ці найменш карумпаваных краінаў сьвету. У 2004 годзе яна скацілася на 74-е месца, у 2005-м — на 107-е.

Хлопцы нажываюцца, як перад канцом?

## Польшчай кіруе фізык і крэсавяк

Продкі новага прэм'ер-міністра Польшчы **Казімежа Марцінкевіча** паходзяць з усходняй Беларусі.

Там за царскім часам яны мелі 60 гектараў зямлі «недзе між Менскам і Смаленскам». У 1920 г. сям'я Марцінкевічаў — родавае прозьвішча прэм'ера тое самае, што ў клясыка беларускай літаратуры, — уцякла ад бальшавікоў пад Ліду. Пасьля Другой сусьветнай вайны зноў уцёкі — гэтым разам на землі, забраныя ў Нямеччыны пасьля 1945 г.

Прэм'еру-кансэрватару — 46 гадоў, па адукацыі ён — настаўнік фізыкі. У 1980-х — сябра «Салідарнасьці» і выдавец некалькіх пэрыёдыкаў. Сталеньне Марцінкевіча адбылося ва ўмовах уздыму каталіцкага касьцёлу, і вядома, што на яго погляды моцна паўплывау ксёндзэзуіт. Для прэм'ера важнымі зьяўляюцца сямейныя каштоўнасьці (ён выхоўвае чацьвярых дзяцей), і адначасова непрымальныя аднаполыя шлюбы ды іншыя заганы эўрапейскай дэмакратыі. У 1990-х Марцінкевіч увайшоў у партыю «Права і справядлівасьць».

У Польшчы прэм'ер мае паўнамоцтвы, практычна роўныя прэзыдэнцкім. У мінулую нядзелю прэзыдэнтам палякі (54% галасоў) абралі правага палітыка **Леха Качыньскага**. Паводле некаторых зьвестак, дальнія продкі Л.Качыньскага паходзяць з-пад Баранавічаў.



**СБ**


PHOTO BYMEDIA.NET

### Званы Сафіі—2005

**30 кастрычніка ў Полацку** пачнецца X Міжнародны фэстываль арганнай музыкі «Званы Сафіі». Ён прысьвечаны 20-годзьдзю аргана Сафійскага сабору. Імпрэзы працягнуцца да 27 лістапада — канцэрты будуць праходзіць выключна ў выхадныя дні. 30 кастрычніка ў Сафійцы выступяць адразу пяць арганістаў, у тым ліку славуты аўстрыец **Ёган Трумэр**. Беларусь прадставяць **Канстанцін Шараў, Уладзімер Неўдах і Ксенія Пагарэлая**. Усе канцэрты пачынаюцца а 15-й. Кошт білетаў — 10 тыс.

## ЗІМОВЫ ЧАС

Не забудзьцеся, што ў ноч **з 29-га на 30-га** Беларусь пераходзіць на зімовы час. Стрэлкі пераводзяцца на гадзіну назад.

### «ARCHE»: з Новага году штомесяц

У часопісе «ARCHE» вы знойдзеце аналіз палітычных і культурных тэндэнцый, агляды новых кніг, гістарычныя адкрыцьці, нонканфармісцкую літаратуру. Сярод аўтараў «ARCHE» — беларускія інтэлектуалы і знаўцы Беларусі зь іншых краінаў. Падпісны індэкс часопісу «ARCHE» 00345. Падпісацца можна на любой пошце. З Новага году часопіс будзе выходзіць штомесяц.

## IN MEMORIAM

### Сяргей Чысьцік

Ня стала Сяргея Чысьціка. Ён быў звычайным паваенным хуліганам менскага цэнтру. Пацаны — галеча сталінскага «шчасьлівага дзяцінства» — у адбеленых зубным парашком драных палатняных чаравіках шпацыравалі па цэнтры места, а ўначы тэрарызавалі суседзяў-жыдоў у Доме масонаў, запускаючы ў фортку ўначы котку з лапамі, заклеенымі ў палавінкі грэцкіх арэхаў на смале.

Служба ў Белпалку, шабашкі ў Магадане, а затым Сяргей сустрэў сьветлай памяці Вольгу Церашчатаву, заснавальніцу і дырэктарку ўнікальнага Музэю старажытнабеларускай культурыі. І ўсё зьмянілася ў жыцьці. Дзясяткі абразоў, скульптур, карцін прайшлі празь ягоную майстэрню. Вернутыя да жыцьця ягоным клопатам шэдэўры экспануюцца ў музэях па ўсім сьвеце. Цяжкі характар Сяргея Чысьціка не даваў яму спрацавацца з постсавецкімі хамаватымі начальнікамі. Калі пайшла з жыцьця Церашчатава, Сяргей быў вымушаны пакінуць музэй. Ён спрабаваў застацца прафэсіяналам, і часам гэта ўдавалася. Год — у Польшчы, год — у Грэцыі. Але тыповая хвароба нашага недалечанага грамадзтва, чакала яго. Ён многа піў.

Ягоны дом быў утульным для сяброў.



Сюды заўсёды можна было завітаць і трошкі адыхацца. І я сюды абавязкова прыйду на Дзяды. Пухам табе зямля, Сяргей.

**Аляксей Хадыка**

# З чым Мілінкевіч едзе ў Маскву

Новы лідэр апазыцыі вязе прапанову адмовіцца ад папулізму ў адносінах Беларусі і Расеі. «Выдатна, калі яны таксама будуць шчырымі». Мадэль Мілінкевіча: «Што выгадна для Расеі і для нас — тое робім». Піша **Алесь Кудрыцкі.**



СЯРГЕЙ ГРЫЦ

Будучы візыт адзінага кандыдата ў сталіцу Расеі інтрыгуе таямнічасьцю: дагэтуль не паведамляюцца ні канкрэтная дата, ні прыкладны сьпіс расейскіх суразмоўцаў новага лідэра беларускай апазыцыі. Сам Мілінкевіч не выключае, што некаторыя зь іх папросяць не афішаваць факт сустрэчы. Не гаворыць Мілінкевіч і пра тое, хто менавіта яго запрашае: «Прапрацоўваецца візыт. Будуць сустрэчы — можа, у Адміністрацыі, можа, у Думе. Трэба ехаць. Чаму не?»

Для чаго Мілінкевіч едзе ў Маскву? «Галоўная мэта вельмі простая, — кажа ён. — Трэба бурыць вобраз ворага. Лукашэнка ўвесь час кажа, што калі ня ён, дык прыйдуць гэтыя нацыяналісты, кітайская сьцяна пабудуецца, газапravод перакрыюць. Поўная хлусьня».

У Маскве Мілінкевіч зьбіраецца давесьці наступнае: «У Беларусі ёсьць нацыянальны інтарэс. Для абсалютнай большасьці — захаваньне дзяржавы. Яны павінны аб гэтым ведаць». Але ці будуць здольныя расейскія палітыкі гэта зразумець? «Фундамэнтальная праблема дачыненьняў беларускай апазыцыі з Расеяй — не ў самой апазыцыі і яе (нібыта) антырасейскасьці, — кажа палітоляг Віталь Сіліцкі. — Праблема ў тым, што ў Расеі нават на ўзроўні «лібэральных адшчапенцаў» накшталт Нямцова не існуе ўспрыманьня Беларусі як незалежнай дзяржавы».

Свае пазыцыі А.Мілінкевіч ад пачатку акрэсьліваў ясна. Новая ўлада будзе выбудоўваць з Расеяй выключна сяброўскія адносіны. Расея павінна стаць стратэгічным партнэрам Беларусі. Але ніякіх фантомаў «саюзнай дзяржавы». Бо «незалежнасьць — гэта сьвятое», і любы гандаль ёю будзе спынены.

А.Мілінкевіч верыць, што супольную мову з расейскім палітычным бамондам можна знайсьці на грунце здаровага прагматызму. «Мне здаецца, што трэба апэляваць у першую чаргу да тых людзей, для якіх прагматычная палітыка на першым месцы, — кажа ён. — Што выгадна для Расеі і для нас — тое робім. Калі ня выгадна — ня робім. Вось такі падыход».

У прагматызьме расейскіх палітыкаў сумнявацца не даводзіцца. Але ці гатовыя расейскія палітыкі прызнаць права на прагматызм за сваімі беларускімі калегамі? «Многім расейскім палітыкам цяжка зразумець, што ў Беларусі таксама могуць быць свае інтарэсы. У многіх палітыкаў з гэтым праблема», — прызнае А.Мілінкевіч.

Козыр А.Мілінкевіча ў тым, што ён вычувае і выражае настроі беларускай палітычнай і бізнэс-элітаў. У іх няма русафобіі, але няма і жаданьня інтэграцыі. Тым часам сацыёлягі цьвердзяць, што большасьць беларусаў кажа «так» сяброўству і з Расеяй, і з Эўразьвязам, але цьвёрда арыентуецца на незалежнасьць.

«Стаўка на будучыню можа выйграць, — напісаў у камэнтары сайт «Наша думка». — Лепей не прапаноўваць Расею замест Захаду, але прапанаваць новую канцэпцыю адносінаў і з Расеяй, і з Захадам». (Падрабязьней пра дыскусію на тэму расейскае стратэгіі Аб'яднаных дэмакратычных сілаў — старонка 4.) Мілінкевічавы думкі маюць падобны напрамак: «Тое, што з Расеяй нам выгадна мець добрыя адносіны, — зразумела, — перакананы ён. — Толькі вар'ят будзе псаваць гэтыя адносіны, калі яны выгадныя для абодвух бакоў».

Ці пасьпеў Мілінкевіч нажыць сабе ворагаў у Расеі? «Ворагаў у Расеі я ня маю, — мяркуе ён. — З партыяй улады трэба размаўляць», — ставіць задачу Мілінкевіч. Размова тая ня будзе лёгкай. «Цяжка сказаць, як там выйдзе. Баяцца яны. Баяцца яны дэмакратычнага руху», — кажа адзіны кандыдат.

Трэба адзначыць, што першы візыт А.Мілінкевіча ў Расею ў якасьці лідэра апазыцыі рыхтуецца рознымі кіраўнікамі штабу кандыдата. Гэта першая для А.Мілінкевіча магчымасьць праверыць на справе эфэктыўнасьць працы штабу.

Ці паверыць Масква Мілінкевічу? «Хацеў бы, каб паверылі, — адказвае ён. — Хлусіць нявыгадна. Кажуць, што палітыка павінна быць на мяжы папулізму. Я так ня думаю. Я буду абсалютна шчырым. Выдатна, калі яны таксама будуць шчырымі і змогуць зразумець нашы інтарэсы».

**Якою павінна быць расейская стратэгія Аб'яднаных дэмакратычных сілаў? Працяг тэмы на старонцы 4.**

### Мілінкевіч павіншаваў Качыньскага

Аляксандар Мілінкевіч павіншаваў Леха Качыньскага зь перамогай на прэзыдэнцкіх выбарах у Польшчы. «Беларусы і палякі, маючы даўнюю і супольную гісторыю, ёсьць братнімі нацыямі. Менавіта таму досьвед польскага народу, які 15 гадоў таму пазбавіўся таталітарнага прыгнёту і дабіўся права свабодна абіраць будучыню, натхняе нас, беларусаў, сёньня», — гаворыцца ў віншаваньні беларускага палітыка. Днём раней прэзыдэнт Беларусі А.Лукашэнка павіншаваў Рамана Абрамовіча зь пераабраньнем начальнікам Чукоткі. Кожнаму сваё.

## СЬЦІСЛА

### П'яных кіроўцаў – у турму

Вадзіцелі, што кіруюць транспартным сродкам у нецьвярозым стане, будуць прыцягвацца да крымінальнай адказнасьці. Гэтая норма прадугледжана папраўкамі ў Крымінальны кодэкс, прынятымі палатай прадстаўнікоў 26 кастрычніка. Адказнасьць «запрацуе» пры паўторным цягам году кіраваньні аўтмабілем у нецьвярозвым стане альбо пры адмове прайсьці мэдагляд. Парушальнік будзе наказваца пазбаўленьнем правоў займаць пэўныя пасады, штрафам або арыштам да шасьці месяцаў ці выпраўленчымі працамі тэрмінам на два гады.

### Беларускамоўны сайт знаёмстваў

З 24 кастрычніка запрацаваў беларускамоўны сайт знаёмстваў «Мара» (www.mara.by). Арганізатары сайту кажуць, што рэсурс будзе выконваць важную функцыю па запаўненьні беларускага кантэнту ў сецыве.

### Казуліна пагналі

26 кастрычніка ў Менску, у Палацы воднага спорту, адбылося пасяджэньне прысьвечанае выступу беларускіх фрыстайлістаў на Зімовай алімпіядзе — 2006 у Турыне. Відовішчны фрыстайл — дысцыпліна, якая можа прынесьці беларусам мэдаль на гульнях. Прысутных пазнаёмілі з новым кіраўніком Беларускай фэдэрацыі фрыстайлу, намесьнікам міністра фінансаў Анатолем Сьвержам. Дагэтуль намінальна пасаду старшыні займаў экс-рэктар БДУ, а цяпер палітык Аляксандар Казулін.

### Статкевіча не пускаюць у Менск

Адміністрацыя Баранавіцкай спэцкамэндатуры адмовіла Міколу Статкевічу ў кароткатэрміновым адпачынку. Сам сп. Статкевіч мяркуе, што міліцыянты выконваюць распараджэньне зьверху, «помсьцячы» за тое, што палітыка часта наведваюць аднадумцы, журналісты, дыпламаты. Паводле заканадаўства, калі асуджаны не парушаў правілаў унутранага распарадку і ня меў заўваг, яму маюць даць трохдзённы адпачынак церазь месяц пасьля пачатку адбыцьця пакараньня.

**АР; afn.by, charter97.org**

# Чаму беларусы не прарасейцы

**Русафобафобія:** напярэдадні паездкі Аляксандра Мілінкевіча ў Маскву ўспыхнула новая дыскусія на тэму расейскага ўплыву ў Беларусі.

У інтэлектуальных колах назіраюцца дзіўныя зьявы: аналітыкі, што не аднойчы сябе да праўладных, актыўна вышукваюць у апазыцыі «празаходнікаў» і «антырасейцаў», пагражаючы ім, у найлепшым выпадку, правалам на выбарах-2006. На аналітычным інтэрнэт-рэсурсе «Наша думка» распалілася сапраўдная інтэлектуальная бойка. Дакладней, зьбіцьцё — там прыхільнік «расейскага праекту» знайшоўся толькі адзін. У ролі баксёрскай ігрушы аказаўся палітоляг **Андрэй Суздальцаў**.

«З гадамі на палітычным подыюме расейскай сталіцы сфармавалася сапраўднае беларускае «мадэльнае агенцтва», дзе, выбіваючыся зь сілы, зьмяняючы адзін аднаго, беларускія дзеячы дэманструюць сваё імкненьне трапіць у так званую «беларускую абойму» Крамля», — піша А.Суздальцаў у аналітычным трыпціху «Менск—Масква». Яўген Абзаваты, даўні праціўнік Суздальцава, не пагаджаецца: «Паведамленьні пра наведваньне расейскай сталіцы прадстаўнікамі апазыцыі зьяўляліся дастаткова рэгулярна. Аднак большасьць такіх сустрэч адбывалася па ініцыятыве самой Масквы. Гэта сьведчыць, хутчэй, пра цікавасьць расейскай палітычнай эліты да сытуацыі ў нашай краіне, чым пра папрашайніцтва з боку тутэйшых палітыкаў».

А.Суздальцаў закідае апазыцыі няздатнасьць стварыць прарасейскі праект, які склаў бы альтэрнатыву прарасейскаму праекту **А.Лукашэнкі**. «Прарасейскі праект», на ягоную думку, мусіць прадугледжваць поўную адмову ад кантактаў з Захадам — як у Лукашэнкі. Ідэя стварэньня «прарасейскага праекту» ня новая. Ёй некалькі гадоў. Але ніхто з палітыкаў, апроч Лукашэнкі, ня тое што ў кааліцыі, а нават па-за яе межамі ня кажа пра патрэбу ўвесьці адзіную валюту ды стварыць адзіную дзяржаву. Хіба што **Валер Фралоў**, які зрабіў падобную заяву ў артыкуле «З Расеяй ці без?», надрукаваным у «Народнай волі». Здавалася б, расейскі палітычны бамонд мусіў ухапіцца за прапанову Фралова як за выратавальную саломінку. Але Масква маўчыць. «Расейская ўлада ў канчатковым выніку прызнае тых, хто ўжо прызнаны», — мяркуе іншы аналітык «Нашай думкі». Дэкляраваньне сваёй прарасейскай пазыцыі зусім не гарантуе падтрымкі Крамля. Крэмль паважае толькі сілу.

«**Глеб Паўлоўскі** цяпер працуе, каб стварыць сваю кліентуру ў Беларусі. Але згадваецца 2002 г., калі так ці інакш у падтрымку Пуціна (калі той прапанаваў Беларусі ўвайсьці ў склад Расеі абласьцямі. — **Рэд.**) выступілі толькі **Сініцын** і **Ярашук**. Іх амаль што затапталі», — кажа **Віталь Сіліцкі**. «Я быў у Маскве, бачыў, чым займаецца Паўлоўскі, і пераканаўся: гэта працуе на ўтрыманьне статус-кво», — сьцьвярджае галоўны рэдактар часопісу «Arche» **Валер Булгакаў**.

На артыкул «Нашай Нівы», у якім расказвалася пра спробы Масквы раскалоць беларускіх дэмакратаў і пра спробы асобных апазыцыянэраў спадабацца Маскве, адрэагавала **«БелГазета»** артыкулам «Масква шызам ня верыць. А апазыцыя — масквалям». Калі парада беларускім палітыкам не пачынаць сваю кампанію ад Спаскай вежы — шыза, то як назваць такую параду ад «БГ»: «Перад Масквой яна (палітычная сіла, якая выставіла кандыдата на выбары. — **Рэд.**) павінна высьвіліцца яшчэ мацней, чым перад Брусэлем і Вашынгтонам». Добры спосаб заваяваць беларускага выбаршчыка.

«БелГазета» апраўдвае адсутнасьць раўнапраўнага дыялёгу з Масквою тым, што апазыцыя ня выйграла за дзесяць год у Беларусі ніводных выбараў. Як быццам, у нас цягам дзесяцігодзьдзя праводзіліся паўнавартасныя выбары. І няўжо гэты дыялёг пачнецца, калі беларускія палітыкі пачнуць весьці сябе, падобна да дыванчыкаў для ног?

«І ня Фонд эфэктыўнай палітыкі павінен падладжвацца пад беларускіх нацыяналістаў. Самі нацыяналісты павінны шчасьліва ўсьміхацца пры слове «Эўразія», — павучае «БелГазета».

«Па гэтай лёгіцы той, хто прышчурана глядзіць на Маскву, той нацыяналіст», — кажа В.Булгакаў. Так і ўсю прэзыдэнцкую раць з Лукашэнкам на чале ў нацыяналісты запісаць можна. Указвала ж нядаўна расейскім ідэолягам **«Беларусь сегодня»**, што яны «крыўдзяць нас сваімі цалкам мядзьведжымі ўхваткамі».

«Калі блізкія да Крамля структуры сапраўды заняліся пошукам «больш сучасна думаючага палітыка», нацыяналістам, якіх цалкам задавальняе адзіны кандыдат ад апазыцыі А.Мілінкевіч, трэба актыўна пераконваць Расею ў тым, што ён такім зьяўляецца», — піша «БелГазета». А як не пераканае, то што? Ну ж Расея не падтрымае адзінага кандыдата так, як падтрымлівала Януковіча, Мілошавіча ды Акаева, а будзе процідзейнічаць, як Ючшанку й Вароніну? Ото ўжо гора сербанём! — рэзюмуе камэнтатар сайту «Наша думка».

**«Людзі, якія прафэсійна займаюцца нацыянальным адраджэньнем, зазвычай, інтэлігенты і ведаюць мовы», — пад'юлдыквае «БелГазета».** Хацелася б чакаць гэтага і ад тых, хто прафэсійна займаецца журналістыкай. А то выходзіць, што аўтар «БГ» з тыповым імем Радыён Раскольнікаў, падглядзеўшы ў «НН» спэцыфічны тэрмін расейскіх паліттэхнолягаў («Эўраўсход», перакладае яго зь беларускай на расейскую як «ЕС» («Эўрасаюз»).

**Алесь Кудрыцкі**

## Л.Заіка: Лукашэнка правільна задушыў беларускую мову

На мінулым тыдні ў Менску прайшла прэзэнтацыя кнігі «Беларусь: Дорога в будущее».

Над кнігай, што аналізуе становішча Беларусі, працавалі 30 чалавек. Прэзэнтацыю праводзілі рэдактары выданьня — намесьнік старшыні АГП Яраслаў Раманчук і кіраўнік аналітычнага цэнтру «Стратэгія» Леанід Заіка.

Паводле аўтараў кнігі, у Беларусі ёсьць тры шляхі далейшага развіцьця: увайсьці ў эўрапейскую супольнасьць; далей інтэгравацца ва ўсходнім кірунку; разьвівацца самастойна. Аўтары кнігі найбольш рэалістычным называлі трэці варыянт. У найбліжэйшай будучыні ў Эўразьвязе нас не чакаюць, мяркуючы ўкладальнікі. На думку Леаніда Заікі, «займацца сабой — ня самы горшы варыянт. Мы і так многае пераймаем: купляем патрыманыя аўтамабілі, носім вопратку сэканд-хэнд, палітыкі паўтараюць жарты, сказаныя іншымі…».

Зрэшты, пытаньне «беларусацэнтрычнасьці сьвету» застаецца для Л.Заікі цьмяным. Так, на прэзэнтацыі ён заявіў: «Лукашэнка зрабіў вельмі карысную рэч, што спыніў усе дыскусіі наконт беларускай мовы». Кіраўнік «Стратэгіі» актыўна карыстаўся тэрмінам «Эўраўсход», прыдуманым Глебам Паўлоўскім, што абурыла палітоляга Віталя Сіліцкага: «Давайце выбіраць тэрміны, зручныя нам, а не карыстацца чужымі».

Аналізуючы стан сацыяльна-эканамічнага разьвіцьця краіны, Я.Раманчук зазначыў утапічнасьць ідэі Крэмніевай даліны: у экспарце Беларусі доля высокатэхналягічных тавараў складае толькі 4%, тады як у Малайзіі — 58%. Гаворачы пра неабходнасьць татальных рэформаў, Я.Раманчук зазначыў: хто б іх ні праводзіў, масавага беспрацоўя можна пазьбегнуць. «У нас ня монаэканоміка, каб абрынуцца адразу».

Манаграфію аўтары даслалі кожнаму дэпутату з абедзьвюх палатаў парлямэнту. Праз чатыры гады яны абяцаюць выдаць новую кнігу.

**Аркадзь Шанскі**

# Фёдар Іваноў: эпізоды

24 кастрычніка ў Вярхоўным судзе пачаліся слуханьні па справе экс-старшыні Дзяржкамітэту па авіяцыі Фёдара Іванова. Агульную шкоду ў выніку ягоных дзеяньняў сьледзтва ацаніла ў 1,859 млрд руб. Падсудны просіць зьмяніць яму меру стрыманьня дзеля сына.

Яго абвінавачваюць па ч.3 арт.424 КК (злоўжываньне службовымі паўнамоцтвамі, учыненае праз асабістую зацікаўленасьць асобай, якая займае адказную пасаду) па чатырох эпізодах. Разам з галоўным авіятарам краіны на лаве падсудных апынуліся Іван Шыманец — генэральны дырэктар РУП «Белаэранавігацыя» і былы выканаўца абавязкаў дырэктара аэрапорту «Менск-1» Васіль Лазар.

Суд пачаўся з таго, што была спынена вытворчасьць па справе І.Шыманца. Гендырэктар РУП «Белаэранавігацыя» абвінавачваўся ў «неналежным выкананьні службовых паўнамоцтваў і нанясеньні шкоды ў буйных памерах», аднак тэрмін даўнасьці з моманту ўчыненьня проціпраўнага учынку (два гады) прайшоў. Затое суд адхіліў хадайніцтва Ф.Іванова наконт паўторнай тэхнічнай экспэртызы салёну самалёта «Як-40». Менавіта пераабсталяваньне салёну і дало матэрыял для крымінальнай справы.

Дзяржкамавіяцыя атрымала заданьне ад прэм'ера Сяргея Сідорскага: зрабіць салён павышанай камфортнасьці для ўрадавых мэтаў. Падтрымаў ідэю прэзыдэнт, загадаўшы выдзеліць зь бюджэту 893 тыс. даляраў на рамонтныя работы.

Ф.Іваноў вырашыў скарыстацца паслугамі маскоўскай кампаніі «Квант». Абвінавачаньне так і адзначае: «Ён загадзя ведаў, што панясе страты, але дазволіў выконваць работы». Грошай не хапіла, і Іваноў распарадзіўся ўзяць сродкі зь небюджэтнага фонду (391 тыс. даляраў), а потым змусіў Менскі авіярамонтны завод набыць адноўлены салён. У выніку дзяржава і згаданы завод панесьлі немалыя страты, а кіраўнік Дзяржкамавіяцыі ўтаіў ад сп.Сідорскага рэальны кошт рамонту.

Другі эпізод абвінавачваньня тычыцца складскога памяшканьня. Паводле сьледзтва, Іваноў загадаў Івану Шыманцу прадаць склад у Берасьці па заніжаным коштце (70 млн руб.). Рэальная цана складу была вызначана ў 306 млн (плюс кошт абсталяваньня — 233 млн). Потым склад быў перапрададзены за 323 млн руб. Дзеля чаго гэта рабілася — невядома

Трэці эпізод закранае тагачаснага в.а. дырэктара аэрапорту «Менск-1» В.Лазара. Іваноў нібы абавязаў Лазара ўвесьці ў эксплюатацыю паліклініку, якая знаходзілася на балянсе аэрапорту, нягледзячы на тое, што інвэстар, які мусіў правесьці капітальны рамонт, ня выканаў сваіх абавязкаў. Нанесеная шкода ацэнена ў 54,4 млн руб.

І, нарэшце, апошні ланцужок у гэтай справе. Паводле вэрсіі абвінаваўцы, Іваноў стварыў штучную вытворчую нагрузку перад прыездам Лукашэнкі на Аршанскі авіярамонтны завод, каб схаваць рэальнае становішча спраў у сваёй галіне, паказаўшы наяўнасьць заказаў. Дзеля гэтага ён загадаў «Белавія» накіраваць самалёт «Ту-134а» на рамонт у Воршу, хоць той рамонт і ня быў мэтазгодны. «Белавія» не заплаціла за выкананыя работы, а Аршанскі завод ня здолеў да канца адрамантаваць самалёт. Прыйшлося запрашаць спэцыялістаў зь Менскага авіярамонтнага. Агульная шкода ў выніку такіх дзеяньняў была ацэнена ў 1,859 млрд рублёў.

Фёдар Іваноў на судзе віны не прызнае, заяўляючы пра загадзя сплянаваную правакацыю: «Згаданыя акалічнасьці мелі месца, але я дзейнічаў не наўмысна і ніякай шкоды дзеяньнямі не прынёс». Выступаючы на судзе, Іваноў дэманстраваў сваю адданасьць дзяржаўным інтарэсам і шмат разоў згадваў Лукашэнку: спасылаўся на яго станоўчыя ацэнкі, артыкулы ў прэсе, нават прыводзіў яго словы («Прэзыдэнт сказаў, што Іваноў узьняў авіяцыю!»). Выкарыстоўваў эмацыйныя пасланьні («Абвінавачваць мяне — значыць не паважаць свой народ!») і рытарычныя воклічы («Як я мог нанесьці шкоду заводу, дзе працаваў 30 год?!»).

Былому галоўнаму авіятару краіны пагражае максымум да васьмі год пазбаўленьня волі з канфіскацыяй маёмасьці і забаронай займаць пэўныя пасады.

Тым часам адвакат падсуднага папрасіў зьмяніць яму меру стрыманьня. Рэч у тым, што былы кіраўнік авіяцыі знаходзіцца пад хатнім арыштам, а прысутнасьць міліцыянта ў доме выклікае прыступы агрэсіі ў сына Ф.Іванова, інваліда другой групы, які пакутуе ад псыхічнага захворваньня. Хлопцу патрэбны догляд і проціпаказаная прысутнасьць чужых людзей у хаце.

**Сяргей Будкін**

**Іваноў стварыў штучную вытворчую нагрузку перад прыездам Лукашэнкі**

**на Аршанскі авіярамонтны завод, каб схаваць рэальнае становішча спраў у сваёй галіне, паказаўшы наяўнасьць заказаў. Дзеля гэтага ён загадаў «Белавія» накіраваць самалёт «Ту-134а» на рамонт у Воршу, хоць той рамонт і ня быў мэтазгодны.**

**Дзяржаўны камітэт па авіяцыі**

**падначальваецца Савету міністраў, а старшыня па свайму статусу адпавядае міністру. Паўнамоцтвы старшыні вызначаюцца загадам прэзыдэнта. У структуру камітэту ўваходзяць восем аэрапортаў, Менскі і Аршанскі авіярамонтныя заводы, Вышэйшы авіяцыйны каледж, авіякампаніі «Белавія», «Трансэкспарт», «Гомельавія», шэраг прыватных авіякампаній.**

# Дацкі ўзор для беларускай сельскай гаспадаркі

**Працяг са старонкі 1.**

### Краіна-блізьнятка

Паводле кліматычных умоў Данія вельмі блізкая да нашай краіны, Полацак і Капэнгаген ляжаць на адной шыраце. Значная колькасьць дацкіх земель ляжыць на марэнах, сфармаваных тым жа ледавіком, што пакінуў сьлед у Беларусі. Таму ў нашых краінах падобныя глебавыя і ляндшафтныя характарыстыкі, а сельскагаспадарчыя надзелы Даніі — знаёмыя нам кавалкі зямлі ад 3 да 30 га, якія ляжаць на схілах. Хоць клімат у скандынаваў больш акіянічны, колькасьць сярэднегадавых ападкаў прыкладна аднолькавая — 650 мм, тэмпэратурныя паказчыкі розьняцца на адзін пункт, і бываюць зацяжныя пераходныя пэрыяды паміж летам і зімой. Амаль аднолькавая ў нас вага сельскага насельніцтва — 25% у Даніі супраць 28% у Беларусі. Але ў Даніі меншы адсотак занятых у сельскай гаспадарцы 4% (у Беларусі — 11%), і большая шчыльнасьць насельніцтва (124 чалавекі на 1 км$^2$, супраць 48 у Беларусі).

### Дзьве дарожанькі

У першыя гады савецкай улады сельская гаспадарка Беларусі ішла шляхам заходнеэўрапейскіх краін. Гаспадаркі, заснаваныя да калектывізацыі, арганізоўваліся на падставе распрацаванай беларускімі эканамістамі — А.Смоліч, Я.Кісьлякоў, С.Ждановіч — тэорыі арганізацыі беларускай сялянскай гаспадаркі й канцэпцыі разьвіцьця «Беларусь—Данія».

За калгасным часам такія разьлікі сталі нікому не патрэбныя. Лічылася, што ніякія фактары не перашкодзяць плянаваму разьвіцьцю калгасных вёсак: калі трэба, будуць падведзены ўсе дарогі, выдзелены ўгнаеньні, знойдзены рынкі збыту. Так было, покуль савецкую плянавую гаспадарку не напаткаў сыстэмны крызіс. Адразу высьветлілася, што ў рынкавых умовах калгасы існаваць ня могуць, бо шмат якія вёскі знаходзяцца далёка ад рынкаў збыту, транспартных магістраляў і нават гарадзкіх пасёлкаў, якія маглі б забясьпечыць іх неабходнай кааперацыйнай падтрымкай. Такія вёскі ў новых умовах аказаліся асуджанымі на выміраньне. Гэты вынік яшчэ да пачатку калектывізацыі прадказвалі беларускія эканамісты Тодар Плятнэр і Гаўрыла Гарэцкі.




**Сярэдняя ўраджайнасьць асноўных культураў за 2001—2005.**

У Даніі сельская гаспадарка ўвесь час ішла па шляху разьвіцьця сялянскіх гаспадарак, якія й сёньня ў сваёй большасьці застаюцца дробнымі, — сярэдні надзел зямлі складае 50 га, 90% маюць у сваім складзе аднагочатырох працаўнікоў, фактычна працуе адна сям’я. У адрозьненьне ад Беларусі ў скандынаўскай краіне адсутнічаюць буйныя жывёлагадоўчыя комплексы, а вытворчасьць вядзецца пераважна на сямейных фэрмах.

### Там не ваююць з ураджаем

Сёньня Данія мае адну з самых разьвітых сельскіх гаспадарак у сьвеце. Каля 200 тыс. чалавек, занятых у сельгасвытворчасьці, вырабляюць колькасьць прадукцыі, якой хапіла б на 16 млн чалавек (насельніцтва Даніі — 5,3 млн). Дзьве трацыны сельгаспрадукцыі экспартуецца ў 160 краін. У сельскай гаспадарцы задзейнічана ў некалькі разоў менш працаўнікоў, чым у Беларусі, але малака ў агульнай вазе яны вырабляюць столькі ж, а мяса — у чатыры разы больш. Пры ўтрая меншай плошчы збожжавых зерня ў Даніі зьбіраецца больш за 9 млн т (лічба, на якую беларускі ўрад пляную выйсьці не раней 2010 году). Прычына — ва ўраджайнасьці, якая ў Даніі амаль па ўсіх культурах у 2—3 разы вышэйшая, чым у нас. Па збожжы яна складае каля 60 ц/га (у Беларусі сярэдняя ўрадлівасьць за апошнія 5 гадоў была 23,6 ц/га), па бульбе — 410 ц/га (150 ц/га), па цукровым буракам — 565 ц/га (295 ц/га).

### Сьвінячы рай

Сельская гаспадарка Даніі мае выразны жывёлагадоўчы ўхіл. Па ўзроўні спажываньня сьвініны на душу насельніцтва Данія займае першае месца ў сьвеце. У краіне гадуецца 21 млн сьвіней (у Беларусі — 3,4 млн). Ня дзіўна, што па ўзроўні спажываньня сьвініны Данія займае першае месца ў сьвеце, па экспарце — 8-е (1,2 млн т).

Краіна — буйны экспартэр масла й сыру. На адну карову ў Даніі ў сярэднім атрымліваюць 7350 кг малака (у Беларусі ў сярэднім за апошнія пяць гадоў — 2765). У абедзьвюх краінах вырабляецца аднолькавая колькасьць малака (4,7 млн т), але ў Даніі кароў утрая меней. Для атрыманьня такіх паказчыкаў вытворчасьці выкарыстоўваецца 2,72 млн га зямельнай плошчы (66% тэрыторыі краіны), у той час як у Беларусі задзейнічана 8,85 млн га (44%), зь іх 7,4 млн га знаходзяцца пад калгасна-саўгаснымі палеткамі.

### Разьвянчаньне стэрэтыпаў

Новая праграма адраджэньня беларускай вёскі зноў робіць стаўку на буйную сельгасвытворчасьць — быццам за савецкім часам яна была высокаэфэктыўная. Але Беларусь толькі цяпер дасягнула ўрадлівасьці зерня і бульбы ўзроўню Даніі васьмідзесяцігадовай даўніны. Прычым сярэдняя ўрадлівасьць пшаніцы за апошнія пяць гадоў у Беларусі (25,6 ц/га) усё яшчэ была ніжэй узроўню Даніі 1923 году — 28,9 ц/га. Прычым адставаньне за гэты час не скарацілася: ураджайнасьць пшаніцы ў Беларусі па ранейшаму амаль у 3 разы ніжэйшая, чым у Даніі. Па бульбе, якая лічыцца традыцыйнай беларускай культурай, адставаньне нават вырасла: калі 80 гадоў таму ўрадлівасьць бульбы ў Беларусі была ніжэйшая, чым у Даніі, у два разы, то цяпер — амаль у тры разы.

Агарарадкі чакае той самы лёс, што напаткаў цэнтральныя калгасныя сядзібы. Як толькі спыніцца фінансаваньне з боку дзяржавы, скончыцца і разьвіцьцё агарарадкоў.

Падмуркам сучаснай праграмы адраджэньня вёскі павінна стаць дзяржаўная *падтрымка адраджэньня сялянскіх гаспадарак*. Адродзяцца прыватныя гаспадаркі — узьдмецца ў сельскай мясцовасьці і жыцьцё. Але недастаткова толькі даць фэрмэру кавалак зямлі і эканамічную свабоду, чакаючы, што ён дасягне эфэктыўнасьці вытворчасьці, як яго замежны калега-фэрмэр. Абавязак улады — хоць прыблізна стварыць фэрмэрам тыя ўмовы, якія яны мелі перад калектывізацыяй.

На першым этапе дзяржава павінна стварыць мэханізм выгаднага крэдытаваньня такіх гаспадарак, дапамагаць з набыцьцём неабходнай тэхнікі, арганізаваць аградапамогу, пры патрэбе ўзяўшы на сябе выдаткі і дапамагаючы з рамонтам тэхнікі, дастаўкай тавараў на рынак, панесьці іншыя выдаткі па аднаўленьні кааперацыйных сувязяў у сельгасвытворчасьці. Неабходна стварыць крытычную масу фэрмэрскіх гаспадарак. На момант калектывізацыі налічвалася звыш 400 тыс. хутароў. Але ў XX ст. у Эўропе назіралася тэндэнцыя да ўзбуйненьня гаспадарак і памяншэньня іх колькасьці. Таму цяпер гэта лічба будзе меншая. Напрыклад, сёньня ў Даніі працуе 48 тыс. фэрмэраў, якія валодаюць зямельнай плошчай у 2,7 млн га, а ў Беларусі — 2,3 тыс. гаспадароў, і выкарыстоўваюць яны 148 тыс. га зямлі. Таму крытычнай масай для Беларусі будзе 100 тыс. фэрмэрскіх гаспадарак з валоданьнем зямельнай плошчай каля 6 млн гектараў. У гэтым выпадку фэрмэры будуць самі здольныя наладзіць і падтрымліваць неабходныя кааперацыйныя сувязі. І тады пачнецца другі этап, калі дзяржава зможа адысьці і засяродзіцца на пытаньнях падтрымкі эканамічнай стабільнасьці, свабоды гаспадараньня і канкурэнцыі, абароны прыватнай уласнасьці.

Замест падтрымкі стратных калгасаў і галіновых праектаў, дзяржаўныя сродкі павінны выдзяляцца фэрмэрам на рэалізацыю канкрэтных бізнэс-плянаў. Калі б 6 млрд даляраў разьмеркаваць на 100 тыс. фэрмэраў, то 60 тыс. даляраў на аднаго фэрмэра стала б для многіх істотнай падтрымкай.

### Новая «прышчэпаўшчына»

Аграрную палітыку, якую праводзіў наркамзем Зьміцер Прышчэпаў, называлі «прышчэпаўшчынай». Наркам лічыў, што ліквідаваць векавую адсталасьць беларускай сельскай гаспадаркі ад Даніі і іншых заходнеэўрапейскіх краін можна, толькі калі запазычыць, іншымі словамі, *прышчапіць* ёй прагрэсіўныя мэтады і тэхналёгіі гаспадараньня. Прышчэпаў ня змог рэалізаваць ідэі. У ліпені 1930 г. яго арыштавалі па справе «Саюзу вызваленьня Беларусі» і асудзілі на дзесяць гадоў лягераў, выслаўшы на будаўніцтва Беламорканалу. У 1939 г. прысуд перагледзелі, і былога наркама Сталыпіна прыгаварылі да вышэйшай меры пакараньня. Расстраляць не пасьпелі, Прышчэпаў памёр у турэмнай больніцы ў Менску.

Сёньня пераход сельскай гаспадаркі да рынкавых умоў ёсьць адлюстраваньнем яе адваротнай трансфармацыі — ад рынку да пляну — у 1920-я. Таму няма патрэбы ў нейкім асаблівым тэарэтычным абгрунтаваньні гэтага працэсу. Дастаткова спалучыць канцэпцыю «Беларусь—Данія» і распрацаваную раней тэорыю арганізацыі сялянскай гаспадаркі.

Перад дзяржавай стаіць задача сфармаваць сельскую гаспадарку, падмуркам якой будуць фэрмэры, і прышчапіць ёй тыя неабходныя інстытуцыянальныя элементы, якія дазволяць трывала атрымліваць рэнту зь зямлі. Гэта дапаможа пазбавіцца ад эфэкту «непрэстыжнасьці пражываньня ў сельскай мясцовасьці», дасягнуць больш раўнамернага разгрупаваньня насельніцтва і даходаў па тэрыторыі ўсёй краіны, што з часам дазволіць ператварыць Беларусь у Данію.

## СЬЦІСЛА

### Свая нафта лепш грэе

У найбліжэйшыя дні пачнецца эксплюатацыя Дзянісаўцкага радовішча нафты (Калінкавіцкі раён). Паводле словаў спэцыялістаў прадпрыемства «Белгеалёгія», пад канец году стане дакладна вядомы аб’ём запасаў сыравіны на радовішчы.

### Пашырэньне Жлобінскага заводу

У сакавіку наступнага году на Жлобінскім мэталюргічным пачнецца мантаж абсталяваньня па вытворчасьці бясшоўных горачакатаных трубаў. Пасьля гэтай інвэстыцыі БМЗ мае заняць 1,5% сусьветнага рынку гэтай прадукцыі.

### МАЗ+«Лукойл»=сябры

Менскі аўтамабільны завод падпісаў пагадненьне аб тэхнічнай супрацы з расейскай нафтавай кампаніяй «Лукойл». Згодна зь ім, змазачныя алівы вытворчасьці «Лукойлу» будуць уключаны ў тэхнічныя кніжкі аўтамабіляў МАЗ.

### Ідэалёгія ў мэтро

Днямі ў менскім мэтрапалітэне мусіць распачацца трансьляцыя навін БТ і СТБ. Праект па ўстаноўцы 34 плязьменных маніtoраў, што будуць разьмяшчацца на платформах, каштаваў $450 тысяч. Арганізавала праект прыватная фірма «БелРосРэкляма». З 20 станцый мэтро тэлевізараў ня будзе толькі на станцыях «Парк Чалюскінцаў», «Першамайская» і «Моладзевая», што ня маюць дастатковага пасажырапатоку.

### Сыліконавае Ўручча

Парк высокіх тэхналёгій разьмесьціцца ў сталічным мікраранёне Ўручча. Беларуская «крэмніевая даліна» на базе Акадэмгарадку зойме плошчу ў 50 га.

**ЗД, afn.by, interfax.by**

ЛІСТЫ ЗЬ ЛЕСУ

# Лесапавал і кошыкі



ПАВАЛ СЕВЯРЫНЕЦ

Раніца. У маласіценскім лесапункце — урачысты сход. «Полацаклесу» — 75 гадоў. Выступае начальнік лесапункту:
— Цяпер наша аб’яднаньне перажывае ня лепшыя часы…
Народ маўчыць.
— Але справы не зусім кепскія, — падпускае аптымізму галоўная бухгальтарка. — Гэты год «Полацаклес» скончыў з прыбыткам 175 млн рублёў.
Народ маўчыць.
— А яшчэ трэба сказаць, — завяршае выступ мясцовы пажарны, — дысцыпліна ў нас кульгае. А тут скарачэньні ідуць…
Маўчаньне павісае ў паветры, агромністае, як варожы цэпэлін.
— Пытаньні? — начальнік пільна аглядае залю.
— Ясна, — выдыхае нехта з далёкіх радоў, — пайшлі ў лес.
Грамада шумна ўстае, бярэ бэнзапілы, шуфлі ды «ссабойкі» і брыдзе да гаражу, па машынах.
Што «Полацаклес» перажывае ня лепшыя часы, даўно не навіна. Заробкі па 100—200 тысяч, няспынныя паломкі, пажары, калецтвы. Начальства перакананае, што галоўная праблема — хранічнае невыкананьне пляну нарыхтовак. Вінаваціць «нэгатыўныя зьявы», кадыфікаваныя ў дырэктыве №1, сьпірт «максімку».
Аб тым, што ўся сыстэма «Полацаклесу» (і яшчэ тузіна такіх жа «…лесаў» па Беларусі) стратная ў прынцыпе, мала хто задумваецца.
Насамрэч тое, чым займаецца «Полацаклес», на любой з моваў Эўразьвязу называецца «барбарскае вынішчэньне нацыянальнага багацьця». Нават не даючы спушчанага зь Менску пляну, аб’яднаньне штогод вывозіць з тутэйшых лясоў 4,5 тыс. вагонаў дрэва. Ільвіная доля «круглякоў» ідзе за капейкі на экспарт, астатняе — на фанэрныя, мэблевыя й цэлюлёзна-папяровыя прадпрыемствы «Беллеспраму». Хвойны лес павінен сьпець 70 гадоў, а яго высякаюць у 20—30 (цяпер валяць якраз пасаджанае за Машэравым) — і гэта нікога не хвалюе. Лясныя дзялянкі пасьля такое высечкі выглядаюць апакаліптычна — быццам пасьля бамбардзіроўкі мэтэарытамі. Уздоўж дарог на пнішчах застаюцца толькі драўляныя вышкі — там начальства, што прыязджае з абласнога цэнтру ці сталіцы, палюе на дзікоў. Праз колькі дзесяцігодзьдзяў беларускі лес ператворыцца проста ў закінутую прамзону, зарослую падлескам.
Каму ж выгадны Вялікі Беларускі Лесапавал? Вугорцам, якія робяць зь беларускай хвоі ды бярозы мэблю, а потым вязуць прадаваць сюды. Італьянцам, якія лушчаць беларускую асіну і плятуць са стружкі цудоўныя сувэнірныя кошыкі для турыстаў. Нарэшце, фінам, якія вывозяць сырую драўніну ў краіны Балтыі, Заходнюю Эўропу — розьніца ў цэнах ад 1,5 да 3-х разоў, а хто ў нас выдае ліцэнзіі на такі гандаль, мы добра ведаем.
Няўжо Госпад Бог даў Беларусі такія бары, гаі ды пушчы, каб сячы іх на вываз ці зводзіць на шпалы?.. Няўжо беларусы ня ўмеюць самі пілаваць, габляваць, цяслярыць ды плесьці кошыкі?
Мінімальная замена сыравіннага канвэеру на алешчынскай эстакадзе — тартакі. Піловачнік на сусьветным рынку прынамсі ўдвая даражэйшы за круглае дрэва — дык можна хаця б скараціць маштабы высечкі.
Яшчэ лепш — мэблевая фабрыка. І аб’ём драўніны расходуецца на парадак меншы, і прыбытак дасьць большы, і працоўных месцаў дабавіць, і заробкі павысіць.
А зусім цудоўна — майстэрні па вырабе сувэніраў, абсталяваньня для агратурызму, тых жа кошыкаў для садавіны, ды хоць кітайскіх палачак для ежы. Тады беларускі лес зможа вольна ўздыхнуць на поўныя грудзі й спакойна сьпець да свайго часу.
Натуральна, ёсьць толькі адзін шанц уратаваць беларускую дрэваапрацоўку. Перамагчы ў 2006-м.

*Малое Сітна*



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Актывіста Саюзу палякаў Беларусі журналіста Андрэя Пачобута міліцыянты затрымалі ў Горадні 20 кастрычніка і ўручылі яму дакумэнт з падпіскай аб нявыезьдзе з прычыны ня выплачанага да канца штрафу за ўдзел у несанкцыянаваным пікеце. Журналіст ня стаў яго падпісваць, заявіўшы пра сваю нязгоду з такой мерай стрыманьня. Штраф складае 5,1 млн руб. Журналісту ўдалося назьбіраць 4,6 млн. Рэшту ён пакуль не сплаціў.**

## СЬЦІСЛА

**Бабруйскія геройствы**

18 кастрычніка ў Бабруйску двое невядомых спрабавалі сілай зацягнуць у машыну кіраўніка мясцовай філіі АГП **Уладзімера Куртукова**. Выратавалі знаёмыя, якія былі непадалёк.

На рок-канцэрце ў Бабруйску 22 кастрычніка затрыманы маладафронтаўцы **Дзяніс Буйніцкі** й **Сяржук Лацінскі**, якія ўзьнялі бел-чырвона-белы сьцяг. На іх склалі пратакол за «хуліганства». Чатырох маладафронтаўцаў, якія зладзілі пікет у падтрымку затрыманых каля міліцыі, завялі ў пастарунак, але адпусьцілі праз тры гадзіны без складаньня пратаколаў.

**Сьледчым няма чаго рабіць**

Сьледчыя прыходзілі 20 кастрычніка «на размову» да актывіста незарэгістраванага «Маладога фронту» **Сержука Марчыка** ды ягонага аднагрупніка **Андруся Юруця** — студэнтаў Баранавіцкага ўнівэрсытэту. Іх цікавілі маладафронтаўскія ўлёткі, разьвешаныя ў Баранавічах.

**У Кобрыні баптыстаў мучаць**

20 кастрычніка ў Кобрыні прадстаўнікі райвыканкаму, пажарнай інспэкцыі й санстанцыі склалі пратаколы на пастараў незарэгістраваных суполак цэркваў Хрысьціянаў веры эвангельскай **Мікалая Радковіча** й Эвангельскіх хрысьціянаў-баптыстаў **Сьцяпана Канавальчука**. Радковіча за парушэньне правілаў пажарнай бясьпекі аштрафавалі на 25 тыс.руб.

**Сарваны моладзевы форум**

Тры мікрааўтобусы з дэлегатамі **моладзевага форуму**, якія ехалі ў Горадню, затрымалі 21 кастрычніка пад Валожынам. Міліцыянты сьпярша шукалі выбуховыя рэчывы, потым заявілі, што аўтобусы перагружаныя. Тым часам на турбазу пад Горадняй прыбылі амапаўцы і супрацоўнікі КДБ зь відэакамэрамі.

**Доктарка змагаецца за праўду**

Жыткавіцкі раённы суд 21 кастрычніка адхіліў пазоў галоўнай лекаркі Тураўскага шпіталю **Ірыны Сяргейчык** да адміністрацыі раённага мэдаб’яднаньня. Яе звольнілі, заявіўшы, што досьвед і веды не адпавядаюць займанай пасадзе, аднак папярэдні суд аднавіў лекарку на працы. Тым часам І.Сяргейчык стварыла пры шпіталі рэабілітацыйны цэнтар.

**Гарадзенскія штрафы**

Суд Кастрычніцкага раёну 13 кастрычніка абавязаў ТДА «Альбатрос» выплаціць чальцу прафсаюзу РЭП **Вячаславу Сьцяшкевічу** 1 274 770 руб.: ён зволніўся з прадпрыемства, аднак пры звальненьні зь ім не правялі поўны разьлік.

**У Берасьці налёт на Шыманскага**

Берасьцейская філія **ГА «Фонд імя Лява Сапегі»** 18 кастрычніка выканала патрабаваньне Мін’юсту й зьмяніла статус, адмовіўшыся ад права юрыдычнай асобы.

Кіраўнік Берасьцейскага фонду падтрымкі моладзевых ініцыятыў «Дзедзіч» **Зьміцер Шыманскі** 20 кастрычніка падаў скаргу ў пракуратуру на дзеяньні міліцыянтаў. За тыдзень да таго яны ўварваліся ў памяшканьне арганізацыі, спаслаўшыся на інфармацыю, што там «адбываецца бойка», і канфіскавалі друкаваныя выданьні.

**Леванеўскі ў Менску**

Палітвязьня **Валер’я Леванеўскага** везьлі з Івацэвіч у менскую больніцу тры дні — з 15 па 18 кастрычніка. Ён таксама падаў заяву ў Івацэвіцкі раённы суд з патрабаваньнем спагнаць з папраўчай калёніі №22 481 тыс.руб.: Леванеўскі лічыць, што адміністрацыя не даплаціла яму за працу.

**Мін’юст працуе**

**ПБНФ** атрымала ліст ад начальніка ўпраўленьня грамадзкіх аб’яднаньняў Міністэрства юстыцыі Алега Сьліжэўскага: чыноўнік патрабуе падаць сьпіс вылучаных на Кангрэс дэмсілаў дэлегатаў ад незарэгістраваных арганізацый «Пэрспэктыва» й «Правы альянс».

Міністэрства 20 кастрычніка скончыла праверку недзяржаўных прафсаюзаў. **Свабоднаму прафсаюзу мэталістаў** прапанавана зьмяніць статус, бо ён ня мае неабходнай колькасьці чальцоў. Матэрыялы на **Дэмакратычны прафсаюз транспартнікаў** накіраваныя ў пракуратуру.

**БКДП і «Дзень» супраць Менгарвыканкаму**

Савет **Беларускага кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў** 20 кастрычніка падаў у суд і пракуратуру пазоў на Менгарвыканкам за парушэньне Канстытуцыі й закону. Падставай стался тое, што гарадзкія ўлады дазволілі БКДП пікет на плошчы Бангалор у падтрымку незалежных прафсаюзаў, абавязаўшы падпісаць дамову з шасьцю суб’ектамі (у тым ліку хуткай дапамогай, міліцыяй і г.д.) на аказаньне паслуг. Квітанцыі пра аплату трэба было прынесьці да пачатку акцыі.

**ТДА «Дзеньпрэс»** — выдавец газэты «Дзень» — падало ў суд на Менгарвыканкам: чыноўнікі ліквідавалі таварыства за «неажыцьцяўленьне гаспадарчай дзейнасьці». Працэс перанесены на 28 кастрычніка.

**Затрымалі за «Народную волю»**

**Барыса Хамайду** віцебскія міліцыянты затрымалі 21 кастрычніка падчас распаўсюду «Народнай волі». У пастарунку ў яго пераглядзелі ўсе выданьні: «БДГ. Деловую газету» і часопіс «ARCHE» вярнулі, незарэгістраваную газэту «Выбар» канфіскавалі.

**Фонд Сапегі высяляюць**

Віцебскую філію **фонду імя Лява Сапегі** спрабуюць выселіць: пры канцы кастрычніка арганізацыя атрымала чарговае патрабаваньне ад ЖРЭТ Першамайскага раёну пакінуць памяшканьне, дзе яна мае «прапіску». Плошчы маюць выкарыстоўвацца «па іншым прызначэньні». Арганізацыю спрабуюць выселіць з канца жніўня.

**Справа Чаркасавай**

Тэрмін папярэдняга расьсьледаваньня забойства журналісткі **Веранікі Чаркасавай** падоўжаны яшчэ на два месяцы.

**Затрыманьні ў Мазыры**

У Мазыры 22 кастрычніка міліцыянты затрымалі ў прыватным доме актывістаў маладзёвай філіі **АГП**, незарэгістраванага маладзёвага цэнтру **«Гарт»**, якія сустракаліся з грамадзянкай Францыі **Сафі Вазьняк** і грамадзянінам Польшчы **Міхалам Папінам**. Замежных грамадзянаў міліцыянты ня выпусьцілі, а павезьлі праз Менск — дэпартаваць у Польшчу, хоць дакумэнты ў іх былі ў парадку.

**АШ**

# Два гады ў рэзэрве

У Беларускім войску асвойваюць «службу ў рэзэрве». Гэта першы крок на шляху да ўвядзеньня альтэрнатыўнай службы.

Служба ў рэзэрве ўлічвае інтарэсы і дзяржавы, і прызыўнікоў, што, атрымліваючы вайсковую спэцыяльнасьць, працягваюць прафэсійную дзейнасьць ці вучобу. Новы від службы — эканамічны: утрыманьне рэзэрвы абыходзіцца таньней. На службу ў рэзэрве залічваюцца маладыя людзі з вышэйшай адукацыяй, карысныя спэцыялісты, пэрспэктыўныя навукоўцы, спартоўцы. Маладыя людзі становяцца на ўлік у вайсковыя часьці, дзе зь імі штогод праводзяцца заняткі і вучэбныя зборы. Для першага навучальнага году колькасьць гадзін складае ад 300 да 850 у залежнасьці ад ваенна-ўліковай спэцыяльнасьці. Другі і трэці гады — па 250 гадзін. Грамадзяне без вышэйшай адукацыі служаць тры гады, з вышэйшай — два, а тыя, хто навучаўся на вайсковых катэдрах, — адзін навучальны год. У выпадку вайны рэзэрвісты будуць накіраваныя ў вучэбныя падразьдзяленьні для навучаньня на малодшых камандзіраў.

### Папулярная служба

Пра рост цікавасьці да яе сьведчаць наступныя лічбы: летась прызыў у рэзэрву склаў 820 чалавек, сёлета — 3 000. Пералік вайсковых спэцыяльнасьцяў рэзэрвістаў пашырыўся з 22 да 78. Маладых людзей найперш прыцягвае скарачэньне працягласьці службы. Цяжка параўнаць месячныя зборы з паўнавартаснай тэрміновай службай. Служба ў рэзэрве прадугледжвае толькі навучаньне — ніякага нясеньня нарадаў, акрамя як па падразьдзяленьні. Кантакты зь іншымі вайскоўцамі абмежаваныя. Суседзтва з такой халявай ня можа не абураць тых, хто служыць «правільна».

Валер праходзіць службу ў заходнебеларускім мястэчку. Рота рэзэрвы, у якой ён служыць, налічвае 80 чалавек, палова зь якіх маюць вышэйшую адукацыю. Падчас нешматлікіх кантактаў з вайскоўцамі тэрміновай службы малады чалавек увесь час адчувае непрыязнасьць зь іх боку. Але калі іх нэгатыўнае стаўленьне да «халяўшчыкаў» яшчэ можна неяк вытлумачыць, то неўспрыманьне ўсур’ёз рэзэрвістаў з боку асобных кадравых вайскоўцаў зьдзіўляе. Асабліва ўлічваючы тое, што зэканомленыя ў выніку рэформы сродкі павінны пайсьці і на паляпшэньне ўмоў службы кадравага складу.

### Што ў суседзяў

Самай прасунутай у справе альтэрнатыўнай службы на постсавецкай прасторы зьяўляецца Малдова. Гэта краіна, дзе матывам для адмовы ад службы ў войску прызнаюцца нават пацыфісцкія погляды прызыўніка — дастаткова быць сябрам адпаведнай арганізацыі.

Украіна й Грузія пайшлі й па шляху эўрапейзацыі войска: скарачэньне агульнай колькасьці вайсковага складу, забесьпячэньне права на альтэрнатыву з-за рэлігійных поглядаў.

У краінах Балтыі, што першымі ўвялі альтэрнатыўную службу, заканадаўства цалкам дастасаванае да міжнародных стандартаў.

Расея ўвяла альтэрнатыўную цывільную службу зь мінулага году, і цяпер служба альтэрнатыўшчыкаў праходзіць у адмыслова вызначаных арганізацыях, колькасьць якіх сягае пад тысячу.

### Зрухі ёсьць

У Беларусі пакуль альтэрнатыва мае падкрэсьлена вайсковы характар: гаворка пра цывільную службу не вядзецца, як і не зьяўляюцца матывамі для адмовы ад вайсковай службы пытаньні сумленьня.

Аднак першыя зрухі ў гэтым кірунку ёсьць. У некаторых часьцях вайскоўцы не прызначаюцца ў нарад падчас сьвяткаваньня рэлігійных сьвятаў іх канфэсіі. У іншых дазваляецца не страляць у часе вучэбных стрэльбаў тым вайскоўцам, што адчуваюць боязь перад зброяй. Гэтыя моманты даюць падставы спадзявацца на прыход у наша войска сусьветных стандартаў у пэрспэктыве.

**Сямён Печанко**


WWW.VSR.MIL.BY

**Рэформа арміі скончана? Вайскоўцы рэзэрвы 7-га інжынэрнага палка асвойваюць на практыцы лесапільную раму ЛРВ-1. Яны атрымліваюць вайскова-ўліковую спэцыяльнасьць «мэханік лесапільных і лесанарыхтоўчых сродкаў».**

## СЬЦІСЛА

### Алькагалізм маладзее

У Воршы на 10 гадоў пазбаўленьня волі асуджаны 15-гадовы хлопец. Васьміклясьніка прызналі вінаватым ва ўчыненьні забойства з асаблівай жорсткасьцю. Ахвярай п’янага падлетка стаў інвалід з ампутаванай нагой. Асуджаны нанёс яму некалькі дзясяткаў udараў кулакамі ды 40 нажавых раненьняў. Падставай для агрэсіі была сварка з-за грошай. П’янства з кожным годам маладзее. Большасьць падлеткаў, якія прыахвоціліся да алькаголю, з асацыяльных сем’яў. І ніякая выхавальная праца, ніякая школа, ні суполка БРСМ не дапамагае. Так, сёлета ў Аршанскім псыханэўралягічным дыспансэры наглядаецца больш за 140 падлеткаў. І гэта тыя, хто неаднаразова спажываў сьпіртное. Аднаму нават паставілі дыягназ — алькагалізм. У горадзе на ўліку 32 таксыкаманы. Трэба заўважыць, што названыя лічбы — афіцыйная статыстыка. Паводле словаў мэдыкаў, каб уявіць сапраўдную карціну, трэба іх памножыць сама меней у 10 разоў.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

### Менск — Полацку

21 кастрычніка ў Мастацкай галерэі адкрылася супольная выстава двух выкладчыкаў менскай Акадэміі мастацтваў — Уладзімера Тоўсьціка (жывапіс) і Ўладзімера Слабодчыкава (скульптура). Аўтараў прадставіў палачанам старшыня Саюзу мастакоў Уладзімер Басалыга. Мяркуецца, што ў наступным годзе адна са скульптур Слабодчыкава зойме месца ля экалягічнага музэю.

### Праграмны дакумэнт для будучага ўраду

23 кастрычніка ў Наваполацку прайшла прэзэнтацыя кнігі «Беларусь: сцэнары рэформаў». Чальцы дэмпартый і грамадзкіх арганізацый сустрэліся з аўтарамі кнігі — гісторыкам Ігарам Ляльковым і эканамістамі Міхасём Залескім і Зьмітром Бабіцкім. Госьці назвалі кнігу «праграмным дакумэнтам» для будучых дэмакратычных урадаў. На сустрэчы прагучала шмат пытаньняў да гасьцей, большасьць зь іх тычылася актуальных палітычных падзей. Адказы гучалі нестандартныя, але пераважна аптымістычныя.

**Васіль Кроква, Полацак**

### Прэзэнтацыя Мілінкевіча ў Глыбокім

У горадзе прайшло знаёмства месьцічаў з адзіным кандыдатам ад дэмакратычных сіл. 23 кастрычніка на нядзельным рынку было раздадзена каля сотні балёнікаў з надпісам «За Мілінкевіча!», «За Беларусь!». Нават утварылася чарга атрымаць нацыянальны сувэнір.

**«Барміца», Глыбокае**

### У памяць Ходзькі

У Вялейцы прайшла краязнаўчая канфэрэнцыя, прысьвечаная 210-годзьдзю з дня нараджэньня пісьменьніка Ігната Ходзькі. У залі пасяджэньняў райвыканкаму адбыліся «Ходзькаўскія чытаньні», на доме №1 па вуліцы Молакава была адкрыта мэмарыяльная дошка, а кавалку гэтай вуліцы надалі імя пісьменьніка. Пры канцы канфэрэнцыі ўдзельнікі наведалі магілу Ігната Ходзькі ў в.Войстам на Смургоншчыне. Тамсама адслужылі мшу ў гонар пісьменьніка.

**Сяргей Макарэвіч, Вялейка**

## ТЭНДЭНЦЫІ

# Мы ўсё-ўсё разумеем



**РУСЛАН РАВЯКА**

*А народ не разумее,*
*Гэта праўда ці мана:*
*Ці пасеялі дарэмна,*
*Ці пажалі мы дарма?*
«Zet»

Паслалі мяне на курсы павышэньня кваліфікацыі. Пачалася навука... з уроку «Ўводзіны ў ідэалёгію». Выкладчык паскардзіўся, што падручнікаў няма, таму першым пунктам было чытаньне артыкулу ў раёнцы. Плюс камэнтар — апазыцыя, што ня бачыць добрага, Пазьняк, улёткі якога ўкінулі ў выкладчыкаву паштовую скрыню, і палякі, што правакуюць канфлікты. Дасталося і расейскім алігархам, якія мараць выкупіць усю нашу сінявокую краіну. Пасьля было падкрэсьлена, што ў нас усё добра, сельская гаспадарка працуе, заводы перавыконваюць паказчыкі.

Але далей прагучаў выраз, які гучыць, паводле слоў знаёмых, што павышалі кваліфікацыю ў іншых гарадах, *паўсюль*: «Толькі вось наш горад крыху спэцыфічны. Таму і не выконваюцца ўсе паказчыкі».

Усе разумеюць, што ідэалёгія краіны — гэта ідэалёгія кіраўніцтва дзяржавы. А тое выхаванае паводле мэтадычак савецкага таварыства «Веды».

У 1996 г. у Магілёўскім тэхналягічным інстытуце мне даводзілася прысутнічаць на гэткіх навуках. На лекцыю «Гісторыя рэлігіі» прыплёўся стары, што ледзь ліпеў. Пахваліўся, што ўсё жыцьцё адпрацаваў у таварыстве «Веды», аб’езьдзіў усю Магілёўскую вобласьць ды пачаў па памяці чытаць гісторыю Эвангельля. Праўда, карыстаўся атэістычнымі творамі накшталт "Забаўляльнага Эвангельля». Закаціўшы вочы, чытаў нейкі верш, як голуб ублытаўся ў спадніцу Божай Маці, пасьля чаго здарыўся цуд… Яго спынілі й нагадалі, што цяпер не савецкі час. Стары аратар хуценька суняўся.

Такія старэчыя бздуры дасюль прапагандуюцца ў перадавых артыкулах раёнак ды мэтадычных парадніках абласных аддзелаў па ідэалёгіі.

Вось гэткае яднаньне са сталінскімі часамі ва ўсім — кажы толькі тое, што патрабуюць. Улады аблашчаць. Вярнуся да маіх курсаў.

Прачытаўшы перадавы артыкул раёнкі, скончыўшы з камэнтарамі, стары выкладчык нарэшце ўзьняў галаву і адзначыў, што пасьля вайны ён вучыўся ў адной ВНУ. Выкладаў у іх прафэсар вышэйшай матэматыкі, які дзіўна паводзіў сябе на іспытах. Адразу пасьля падрыхтоўкі студэнта выкладчык чытаў білет і, калі першае пытаньне тычылася ролі партыі ў матэматычнай навуцы, гаварыў: «Першае пытаньне вы, я бачу, ведаеце. Пачынайце з другога».

Пасьля выкладчык курсаў дадаў: «Вы ж усё-ўсё разумееце…»

*Баранавічы*

# «Бабры» адпелі сваё

**У Бабруйску прайшоў фэстываль «Рок за баброў». Ён прынёс масу станоўчых уражаньняў і сэнсацыйную навіну. А зь Міністэрства культуры быў атрыманы афіцыйны дакумэнт, што міністэрства нічога ня мае супраць выступу беларускіх рок-гуртоў. Рэпартаж Зьмітра Падбярэскага.**

Месца правядзеньня фэсту не было выпадковым. У Бабруйску разьмяшчаецца бровар «Сябар», які выпрацоўвае гатунак піва «Баброў». Па прыкладзе знаных расейскіх піваварў, якія ўкладаюць грошы ў рок-музыку, бабруйцы вырашылі зрабіць нешта падобнае ў дачыненьні да айчынных музыкаў. Сымбалічна, што адкрываў сямігадзінны канцэрт на плошчы ля гарадзкога Палацу мастацтваў ансамбль «Сябры». Анатоль Ярмоленка & C° былі адзіным калектывам, удзел якога без праблем быў ухвалены мясцовымі інстанцыямі. Рэшту бязьлітасна выкрасьлілі са сьпісу. Сярод непажаданых аказаліся «Нэўра Дзюбэль», «Крама», «N.R.M.» і нават «апалітычная» «Крамбамбуля». І толькі пасьля таго, як зь Міністэрства культуры быў атрыманы афіцыйны дакумэнт, што міністэрства нічога ня мае супраць прадстаўленага сьпісу выканаўцаў, перад гуртамі запалілася зялёнае сьвятло. Нават далі дазвол на выступ гурту «Zet».

Публікі на гарадзкой плошчы сабралася шмат, хоць пляц зусім не надаецца да рок-канцэртаў: гук адбіваўся ад дому насупраць, а таму нармальна слухаць музыку можна было толькі пад самай сцэнай.

Музыкаў чакаў лёзунг «За Беларусь!», прымацаваны на авансцэне. Аляксей «Стокс» рашуча заявіў: «Мы прыехалі выконваць музыку, а не выступаць пад нейкімі лёзунгамі». Тым больш, што канцэрт быў за ратаваньне баброў, якіх выкрасьлілі з Чырвонай кнігі. Урэшце лёзунг прыбралі.

Перад бабруйцамі выступалі «Індыга», Аляксей Шадзько зь «Сястрой», «Мадэра гард-блюз», «Slang», «Flat», «IQ-48», «Svet Boogie Band» і «Стокс». У цэлым канцэрт атрымаўся вельмі прыстойны па ўзроўні і разнастайны па стылістыцы. Праўда, падалося, што мясцовая публіка практычна ня ведала музыкантаў, за выняткам апошніх. Рэагавала яна даволі стрымана, разварушыць яе здолелі хіба што музыкі «Svet'u», якія паказалі сапраўднае сцэнічнае шоў. Вёў фэст у непаўторнай манеры Лявон Вольскі, што прыбыў у Бабруйск уначы з Гомелю, дзе таксама выступаў.

Выснова: усё залежыць ад людзей на месцах. Там, дзе імкнуцца перастрахавацца, культурнае жыцьцё атрымлівае перспэктывы зачахнуць. І наадварот: дзякуючы «Року за баброў» бабруйская публіка адкрыла для сябе нацыянальную рок-музыку. Прынамсі, пасьля канцэрту натоўп моладзі атачыў аўтобус з музыкантамі, каб узяць аўтографы.

Праўда, назва «фэстываль» падалася пакуль што авансам. Будзем спадзявацца, што наступным разам фэст пройдзе мінімум на месяц раней, калі яшчэ летам, ды будзе працягвацца як мінімум два дні. Вось тады мы і атрымаем сапраўдны рок-фэстываль.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Рок-каранацыя адродзіцца**

**Як паведаміў дырэктар «Кляс-клюбу» Генадзь Шульман, што ўдзельнічаў у правядзеньні фэсту, пасьля двухгадовага перапынку мусіць аднавіцца «Рок-каранацыя». Да Юр'я Цыбіна, уладальніка правоў на ідэю цырымоніі, і «Кляс-клюбу» як яе арганізатара, напэўна, дадасца кампанія «Сябар». Адной з прычын, якія змусілі адрадзіць цырымонію, сп.Шульман назваў той факт, што за два гады на айчыннай сцэне зьявілася значная колькасьць цікавых калектываў. Для яго сапраўдным сюрпрызам сталі выступы «IQ-48» і «Svet Boogie Band», а таксама «Стоксу». Адносна апошняй згодны зь ім цалкам: «Стокс» зусім невыпадкова закрывалі канцэрт пад гукі шыкоўнага фаервэрку, паказаўшы, што тэлевізійнае ўвасабленьне калектыву і яго сапраўднае канцэртнае аблічча — рэчы вельмі розныя.**

**На фота «IQ-48».**

## Багдановіч, Колас, Роб-Грые

**21 кастрычніка ў менскай бібліятэцы імя Пушкіна адкрылася сьвята францускага чытаньня.**

У маленькай залі настолькі было цесна, што ахвотныя паслухаць тоўпіліся нават у калідоры.

На вечарыне прэзэнтавалі францускія творы, што выдаюцца ў рамках праграмы «Багдановіч», — 11 выданьняў, якія нядаўна выйшлі ці вось-вось маюць убачыць сьвет. Сярод выдавецтваў, якія ўжо даўно супрацоўнічаюць з францускім бокам, друкуючы пераклады па-расейску, годна глядзеўся прыватны выдавец Зьміцер Колас: за кароткі час ён пасьпеў выдаць па-беларуску Жана Поля Сартра («Мур»), бацьку «новага раману» Алена Роб-Грые («Праект рэвалюцыі ў Нью-Ёрку»), а таксама зборнік п'есаў «набэліянтаў» — Альбэра Камю («Праведнікі»), Самюэля Бэкета («Канец гульні») і Ж.П.Сартра («Мухі»).

**АВ**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**ШАПІК З ПРЭСАЙ**

## Далітоўская «Спадчына»

**Спадчына. 2003. № 6 (154). — 84 с. — Наклад 750 ас.**

Сярод славянаў яны чамусьці не адчуваюць сябе славянамі, а балты ня лічаць іх балтамі.




«Бітым і цёртым гісторыяй нашым суседзям беларусам нялёгка: сярод славянаў яны чамусьці не адчуваюць сябе славянамі, а балты ня лічаць іх балтамі. Зь іншага боку, яны хацелі б быць і аднымі, і другімі. Унутраны хаос адбіўся і ў першай спробе абагульніць беларускую міталёгію: асобным артыкулам уганараваны літоўскі жрэц Лізьдзейка, але апісаны і багі т.зв. Кіеўскага пантэону (XI ст.). Яшчэ ёсьць жаданьне быць найстаражытнейшымі і «найбольш доўга захаванымі».

Гэта невялічкая анатацыя Пранаса Вільджунаса на энцыкляпэдычны слоўнік «Беларуская міталёгія» яўна дысануе з узьнёслай рэцэнзіяй Зьдзіслава Сіцькі. І тое, і другое — у новым нумары «Спадчыны», тэма якога — «далітоўская Беларусь».

У часопісе — артыкулы М.Крывальцэвіча і А.Варатніковай «Архетыпы гравіраваных выяў і арнамэнтальнага аздабленьня на касьцяных вырабах каменнага веку», Г.Семенчука «Ці існавала старажытная народнасьць, альбо Пра «калыску» беларускага народу», А.Шаланды «Сымболіка й геральдыка Полацкай дзяржавы», Дз.Дука «Фэномэн станаўленьня дзяржаўнасьці на землях полацкіх крывічоў». Па-за тэмай — працяг успамінаў Дзьмітрыя Касмовіча, гэтым разам пра баявую дзейнасьць на Браншчыне й Смаленшчыне ў часе нямецкай акупацыі.

Выдаўцы «Спадчыны» абяцаюць, што з наступнага году часопіс будзе выдавацца як квартальнік і ў рэальным часе.

**Алег Раявец**

**ЛІСТАПАД**

**2** — Дзяды.
**2** — 75 гадоў з дня нараджэньня Аляксандра Баршчэўскага (1930, псэўд. Алесь Барскі) — літаратуразнаўца, перакладчыка й фальклярыста, прафэсара Варшаўскага ўнівэрсытэту.
**4** — заканчэньне Рамадану ў мусульманаў.
**8** — 75 гадоў з часу запуску першай у БССР электрастанцыі БелДРЭС (Беларуская дзяржаўная раённая электрастанцыя, 1930). Працуе на торфе.
**11** — 50 гадоў з дня нараджэньня літаратуразнаўцы Галіны Тычкі (1955). На пачатку 1990-х разам з археолягам Эдвардам Зайкоўскім напісала славутую кнігу «Старадаўняя беларуская кухня».
**14** — 100 гадоў з дня нараджэньня заходнебеларускага паэта Міхася Васілька (сапр. Міхаіл Касьцевіч; 1905—1960).
**15** — 75 гадоў таму ў Несутычах на Наваградчыне нарадзілася Тамара Стагановіч, беларуская мастачка ў ЗША, дачка пасла ў польскім сойме Аляксандра Стагановіча.
**15** — 50 гадоў з дня нараджэньня мастака Сяргея Войчанкі (1955—2004). Найбольшую славу набыў у творчым дуэце з Уладзімерам Цэсьлерам.
**16** — 100 гадоў з дня нараджэньня пісьменьніка Яна Скрыгана (1905—1992).
**20** — 75 гадоў таму Янка Купала, якога цкавала савецкае НКВД, зрабіў спробу самагубства (1930). Харакіры не ўдалося — паэту перашкодзіла пільнае атачэньне.
**21** — 175 гадоў з дня сьмерці астранома, матэматыка, філёзафа Яна Сьнядэцкага (1756—1830), рэктара Віленскага ўнівэрсытэту ў 1806—1815 г.
**24** лістапада — 100-годзьдзе з дня нараджэньня дырыжора, народнага артыста Беларусі Лява Любімава (1905—1977). У 1951—1964 г. быў галоўным дырыжорам тэатраў опэры й балету Беларусі, паставіў творы Я.Цікоцкага («Дзяўчына з Палесься»), Ю.Семянякі («Калючая ружа»), С.Манюшкі («Страшны двор»).



**26 — 75 гадоў Уладзімеру Караткевічу** (1930—1984).
**26** — 150 гадоў з дня сьмерці Адама Міцкевіча (1798—1855).
**26** — 200 гадоў з дня нараджэньня кнігавыдаўца, публіцыста, мэмуарыста, аднаго з арганізатараў паўстаньня 1830—1831 г. на тэрыторыі Беларусі Яўстаха Янушкевіча (1805—1874), у эміграцыі (Францыя) выдаваў творы А.Міцкевіча, Ю.Славацкага, І.Лялевеля.
**29** — 175 гадоў ад пачатку вызвольнага паўстаньня 1830 г. у Варшаве, што ўвайшло ў гісторыю пад назвай Лістападаўскага. У Беларусі й Літве яно пачалося ў 1831 г.

**Адам Воршыч**



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

# Ірына і Баргановіч

Палітыкі, якія робяць прадмовы да зборнікаў паэзіі прыгожых і таленавітых жанчын, заслугоўваюць зьняволеньня на 15 сутак. Піша **Аляксандар Фядута** пра «Сармацкі альбом **Ірыны Багдановіч**.

Таму што выступаюць у ролі гэтакіх цмокаў-спакушальнікаў: маўляў, напішэце, душанька, пару слоў і пра наш грэшны промысел, — мо' раптам увойдзеце ў гісторыю вызваленчага руху.

Бог даў Ірыне Багдановіч і прыгажосьць, і талент. А прадмову да яе зборніка «Сармацкі альбом» (Менск, 2004) напісаў прафэсар Юры Хадыка — вядомы фізык, мастацтвазнаўца й палітык. Хто менавіта з трох Хадыкаў не ўтрымаўся і зграшыў у гэтым канкрэтным выпадку — ці то фізык, ці то мастацтвазнаўца, ці ўсё ж такі палітык, — ня нашая справа. Не пра яго гаворка.

Вінаватая ва ўсім сама паэтка. І ў школе, і на філялягічным факультэце яе вучылі, што самая цудоўная лірыка — грамадзянская. Значыць, сапраўдны паэт зьяўляецца толькі тады, калі гэтую самую грамадзянскую лірыку асвойвае. Трэба пастарацца — і станеш сапраўдным паэтам.

Праўда, паэт ў гэтым выпадку — жанчына. Жанчыне грамадзянская лірыка паддаецца толькі ў тым выпадку, калі яна доўга пакутуе. У астатнім яна — ды яшчэ прыгожая — часьцей за ўсё піша добрыя вершы пра тое, што да палітыкі ня мае дачыненьня.

Пасьля прачытаньня «Сармацкага альбому» застаецца такое адчуваньне, нібыта яго пісалі адразу два чалавекі. Не Хадыка і Багдановіч — гэта якраз было б прасьцей за ўсё дапусьціць, — а Ірына і Багдановіч. Ірына — увасабленьне жаночага пачатку, Багдановіч у гэтым выпадку — увасабленьне той самай грамадзянскасьці, на якую аўтарка «Альбому» раптам пачала прэтэндаваць. Прычым Багдановіч гэты, да вялікага жалю, усё адно — не Максім.

Усё напісанае Ірынай па праве можа лічыцца шэдэўрам беларускай лірыкі. У гэтых вершах валадарыць прыгажосьць, пануе каханьне, цьвітуць кветкі.

> Бэз безупынны, бязьлітасны, бэз
> летуценны,
> Бэз як бязьмежжа памкненьняў,
> пачуцьцяў іграньня.
> Бэз каралеўскі, сармацкі, бухмата-
> праменны,
> Бэз як прэлюдыя лета, фартысіма
> траўня.

У гэтых вершах — усё. І гудзеньне пчалы, і пах квецені бэзу, і нават начны сьпеў салоўкі, да якога прыслухоўваюцца заказаныя. Ад часоў бураўкінскага «Салаўя», у якім паэт здолеў перадаць сапраўдны птушыны пошчак, у беларускай паэзіі не было верша, у якім гукавая тканіна настолькі б адпавядала прадмету выяўленьня. Шкада, што ніхто з кампазытараў дагэтуль не здагадаўся пакласьці «Час бэзу» Ірыны на музыку — атрымаўся б шыкоўны, велічны вальс.

> Бэз як бясьпечнасьць, як сымбаль
> радзінных фальваркаў,
> Кожнай шляхецкай сядзібы належнае
> ўбраньне,
> Бэз як вяршэнства айчыны, а ўсіх
> недаверкаў
> Знэжа вясна гэтым бэзавым
> траўневым граньнем.

У паэтычным сьвеце Ірыны ёсьць месца для каханьня, для кветак і кляйнотаў, для ўспамінаў і для малітвы. Для ўсяго, чым здаўна жыла высакародная беларуская шляхцянка. Прычым лепшыя з напісаных ёю вершаў — якраз самыя культурныя і ня зводзяцца толькі да сармацкай традыцыі. Скажам, адчуваецца, што ў свой час паэтка добра і ўважліва чытала Аляксандра Блока:

> У полацкім Сафійскім саборы
> Гучаў арган і вакал,
> І голас узносіўся con amore,
> І трапятаў, і кахаў.
> Кахаў, і плакаў, і спадзяваўся,
> Рэхам буры лунаў,
> Анёльскім крылом душы дакранаўся,
> Уваскрасаў і канаў.
> Будзілі ўсіх і сьціхалі хоры,
> Пачуцьці плылі бязь меж.
> І ты быў побач, і con amore
> Гучала, як мне, табе ж.

Здаецца, спыніся Ірына на гэтай паэтычнай ноце, у якой няма нічога фальшывага, у якой скрыпкі пяюць, вальс круціць галаву, салавей пранікае ў душу, гучыць боская літургія, — і жадаць больш няма чаго.

Але Ірыне ўпарта хочаца стаць Багдановічам. Хочацца пісаць паўнавартасную грамадзянскую лірыку, весьці за сабой народ, ператварацца ў валькірыю новай нацыянальна-вызваленчай рэвалюцыі. Спакуса занадта вялікая. І зьяўляюцца ўжо іншыя вершы. Зусім, я б сказаў, іншыя, не Ірынай напісаныя. Ці — ня гэтай Ірынай.

> Вы сёньня здрады кавалі,
> Хоць вы маглі сябе ўзьвялічыць.
> Дый прыйдзе час для вас, калі
> На суд Гісторыя пакліча.
> Нашчадак вас прымусіць сам
> Сказаць, чаму вы прадавалі
> Наш край усходнім гандлярам,
> А свой пасад не збудавалі?

Нельга сказаць, што ў гэтых радках ня чуецца музыкі. Чуецца. Але гэта ўжо ня голас скрыпак і не царкоўны арган, а трэск барабанаў, блізкі да ўсіх тых «выкрывальніцкіх» вершаў, што ў 1920-я гады пісалі «р-рэвалюцыйныя» паэты, — прычым не Маякоўскі нават, які-небудзь Безыменскі. Ды яшчэ з тымі самымі паэтычнымі штампамі, з поўнай адсутнасьцю густу і зь перакананасьцю ў тым, што рыфмаваныя радкі застаюцца паэзіяй у любым выпадку. Ці ты ганьбуеш трацкіцка-бухарынскі блёк, ці зусім нават дэпутатаў 1996 году, болей таленавітымі ад таго вершы ня робяцца: палітычнае кляймо — той самы штамп, толькі выпальваецца калёным жалезам. Хаця аўтарка «Сармацкага альбому», будучы выдатным спэцыялістам-філёлягам (магу ісьці ў заклад, бо чытаў яе апошнюю кнігу, прысьвечаную тэндэнцыям рамантызму ў беларускай літаратуры якраз 1920—1930-х г.), мусіла б гэта адчуваць. Але калі грымяць барабаны і хочацца ў валькірыі, астатнія пачуцьці глухнуць.

На жаль, мабыць, менавіта гэтыя вершы прафэсар Хадыка й лічыць «самымі сармацкімі». Інакш бы ён, як і належыць чалавеку з густам, не заклікаў бы прачытаць гэты невялікі зборнік цалкам, а параіў бы, якія — нешматлікія, падкрэсьлім, — старонкі чытаць ня варта. Гэта было б шчыра.

Зьдзіўляльны сынтэз двух пачаткаў адбываецца тады, калі Ірына піша пра Радзіму, раптам адмаўляючыся ад палітычнай надзённасьці гэтай хвіліны і падпарадкуючыся той самай «культурнай традыцыі», пра якую піша ў прадмове да зборніку мастацтвазнаўца Хадыка. Тады ў вершах усё гарманічна: і скрыпкам і барабанам ёсьць сваё месца, гучыць аркестр.

> Так крочым з кляймом тутэйшых
> У свой прадапошні час.
> Бяз мовы, з іржавай славай,
> Бяз родавых каранёў,
> Бяз краю, што стаў дзяржавай,
> Вартаю каралёў.
> Сармацкая кроў–вядзьмарка
> Дарэшты сьцякла ў зямлю.
> Краіна былых фальваркаў,
> Якую я так люблю,
> Пакрыта пажоўклым лісьцем,
> Дзе мы блукаем адны…

Ёсьць і грамадзянскасьць, і паэзія. Бо адчуваецца пэўная розьніца паміж тым, калі гвалцяць уласны талент ці калі кіруюцца ім. У першым выпадку — з гнеўнымі інвэктывамі ў адрас палітычных апанэнтаў — абсалютны гвалт. Прычым гвалт, ад якога Ірына не адчувае ніякай паэтычнай і чалавечай насалоды. І гэта — цалкам заканамерна, бо прафэсія жанчыны, якая адчувае насалоду ад гвалту, — зусім не паэт, і нават не літаратуразнаўца. У другім выпадку — каханьне, пераплеценае з болем, што зноўтакі натуральна.

> Які анёл мяне бароніць
> Ад зманлівай няўдзячнай здрады,
> Калі грахоў маіх атрады
> Ў шалёны гон уздыбяць коней?
> Калі душа мая ірвецца
> Зямны ланцуг свой расшчаперыць,
> Які анёл мне цішыць сэрца
> І расчыняе ласкі дзьверы?..
> Які анёл?..

Жанчына заўсёды мае патрэбу ў падтрымцы і абароне, нават калі яна моцная. І ў лепшых вершах «Альбому» жаночы пачатак якраз і адчуваецца.

Зборнік Ірыны Багдановіч (аб'яднаем зноў двух аўтараў «Сармацкага альбому») — бясспрэчна, падзея ў сучаснай паэзіі. Але хочацца ўзяць у рукі нешта вострае, павышкрэбваць з тэксту ўсё тое, што відавочна ня ёсьць натуральным для паэта і жанчыны, і атрымаецца вельмі добрая кніга, якая стане карацей максымум на восем відавочна слабых вершаў. Праўда, тады зборнік абсалютна стане падобным да таго малюнку, які мы бачым на вокладцы — трэснутай і крыху шчарбатай кафлі зь вершнікам-сарматам. Але нічога: нашчадкі скажуць, што вышкрабана якраз тое, што ня вытрымала праверкі часам. Тым больш што атмасфэру эпохі гэтыя шчарбіны якраз і перададуць лепей за ўсё.

**Багдановіч Ірына. Сармацкі альбом.** — Менск, 2004.

# Міхаіл Фінберг: Некаторыя артысты выбіраюць лёгкі шлях

Кіраўнік Нацыянальнага аркестру адказвае на пытаньні карэспандэнта «НН».


PHOTO.BYMEDIA.NET

Кіраўнік Нацыянальнага аркестру пагадзіўся на гутарку пры ўмове: калі «НН» прынясе прабачэньні за матэрыял «Ня ўсё так добра ў аркестры Фінберга» («НН», №36). «Надта мяне закранулі нават адным загалоўкам», — сказаў дырыжор. Мы дамовіліся сустрэцца ў нядзелю — кіраўнік ансамблю працуе сем дзён у тыдзень.

## Мы — найлепшыя

**«НН»: Як маецца аркестар?**

**МФ:** Працуем у двух кірунках: эстрадная/джазавая і акадэмічная музыка, ладзім фэстывалі ў гарадах. Ужо адзінаццаты раз праведзём фэстываль у Нясьвіжы, шосты — у Заслаўі, Тураве, Стоўпцах, па традыцыі, у Маладэчне і Віцебску. Усяго аркестрам — у лютым нам спаўняецца 20 год — было арганізавана 62 фэстывалі, на якіх стараемся спалучаць мастацтва і навуку — у рамках фэстываляў праводзяцца навукова-практычныя канфэрэнцыі. Наш аркестар — найлепшы ў краіне. Пра гэта сьведчыць і самае высокае званьне, якое можа атрымаць творчы калектыў. У жніўні нам надалі статус «нацыянальны».

**«НН»: Якое месца ў вашых праграмах займае беларуская музыка?**

**МФ:** На 90% гэта беларускія творы. Мы стварылі цыкль аўтарскіх праграм на вершы Міцкевіча, Багдановіча, Коласа, Купалы, Караткевіча, сучасных паэтаў. Амаль нікога, хто напісаў варты верш, не забылі. У лютым усё падсумуем у праграме «Анталёгія».

## Джаз запатрабаваны больш, чым Купала

**«НН»: Вы не сказалі пра джазавы фэстываль.**

**МФ:** Мы даём магчымасьць паслухаць джаз усім цікаўным, бо ладзім фэст пры дзяржаўнай падтрымцы. Таму і квіткі ідуць па нізкіх цэнах. 15 000 руб. — нармальная цана для канцэрту, які задавальняе ўсіх. Гэта хуліганства, калі прыяжджаюць нейкія артысты, працуюць пад фанаграму і бяруць з гледачоў куды большыя грошы. Мы заўсёды граем ужывую.

**«НН»: У якіх адносінах вы знаходзіцеся з Прэзыдэнцкім аркестрам? Ці не замінаеце адзін аднаму?**

**МФ:** У нашай краіне 28 аркестраў, і кожны займае сваю нішу. Прэзыдэнцкі аркестар запатрабаваны ў цырыманіяле, пратакольных справах. Мы ж езьдзім па краіне, выступаем па-за межамі, найперш у Маскве.

**«НН»: Але Прэзыдэнцкі аркестар таксама гастралюе па краіне. Як вы ставіцеся да ідэі зьліцьця гэтых двух калектываў?**

**МФ:** Няхай будзе нават 100 аркестраў, галоўнае, каб яны былі прафэсійныя і запатрабаваныя. Прэзыдэнцкі і наш аркестар ня могуць злучыцца, бо, калі ёсьць пэўны набор і колькасьць інструмэнтаў, удвая болей іх быць ня можа.

**«НН»: Ці існуе праблема недахопу музычных кадраў для аркестру зь Беларусі?**

**МФ:** Аркестар на 99% складаецца з музыкаў, якія атрымалі вышэйшую адукацыю ў Беларускай акадэміі музыкі. Узровень нашай музычнай адукацыі вельмі высокі.

**«НН»: Зь якім цяжкасьцямі сутыкаецеся?**

**МФ:** Усе творчыя праблемы мы ліквідуем на рэпэтыцыях. Непакоіць тое, што цяжка сабраць поўную залю. Калі на джаз-фэстываль квіткі распаўсюджваюцца за два дні, то на канцэрт, прысьвечаны Купалу, куды марудней.

**«НН»: Чаму так?**

**МФ:** Вінаватыя не выканаўцы, вінаватыя слухачы. Кожны чалавек мусіць займацца самавыхаваньнем, цікавіцца культурай, паэзіяй. Кажуць, што не стае беларускай музыкі. Калі ласка, на нашых канцэртах яе ўдосталь. Трэба любіць сваё нацыянальнае, бачыць пазытыў. У нашай краіне створаны ўсе ўмовы для творчага выяўленьня. Некаторыя артысты выбіраюць самы лёгкі шлях: зробяць адну песеньку і танчаць пад яе на трох тэлеканалах. Глыбокі і зьмястоўны твор зрабіць куды цяжэй. Трэба зацікавіць маладых і вярнуць іх з начных клюбаў у канцэртную залю. Бо акрамя музыкі танцавальнай, ёсьць музыка сур’ёзная, да якой трэба цягнуцца. Бывае няёмка і сорамна, калі ў студэнцкай аўдыторыі пытаюся пра беларускую музыку, а ў адказ — цішыня.

## Выканаўцаў шмат, выніку ніякага

**«НН»: Гадоў восем таму Вы прарочылі «Палацу» славу «Песьняроў». Ці спраўдзіліся чаканьні?**

**МФ:** Я быў адзін зь першых, хто заўважыў гурт і запрасіў яго на фэстываль у Маладэчне. «Палац» сапраўды тады гучна заявіў пра сябе. Але, каб замацавацца, трэба болей канцэртаваць, рабіць новыя праграмы і заўсёды імкнуцца наперад. Ужо некалькі год я нічога ня чуў пра гэтую групу.

**«НН»: Якое Ваша стаўленьне да таго, што музыканты фактычна падзелены на два лягеры?**

**МФ:** Ведаю адно: музыканты ёсьць прафэсійныя і непрафэсійныя. Той, хто хоча, працуе: у нас ёсьць філярмонія, іншыя канцэртныя арганізацыі. Ні пра якія падзелы я нічога ня ведаю, ніякіх сьпісаў ня бачыў.

**«НН»: Каго ж Вы цяпер вылучылі б на сучаснай беларускай сцэне?**

**МФ:** Выканаўцаў шмат — выніку ніякага. Дзе іх праграмы? Нельга ж бегаць з адной і той жа песьняй па ўсіх радыёстанцыях і тэлеканалах. Я запрашаў у Маладэчна і поп-, і рок-артыстаў, і наступны раз яны прыходзілі з тым жа матэрыялам, што і ў першы. Цяпер мне цяжка назваць нейкага выдатнага артыста, усе яны — аднолькавыя. Зараз не хапае Асобы.

**«НН»: Няўжо загад аб 75% ня выратаваў?**

**МФ:** Гэты загад даў магчымасьць беларускім музыкам больш плённа працаваць. Чым болей будзе гучаць беларускай музыкі, тым болей шанцаў, што зьявяцца вартыя ўвагі. Але недастаткова некалькі разоў прагучаць на FM-станцыі. Гэта музыкант аднаго дня ці аднаго году. На болей часу яго не хапае. Таму большасьць такіх музыкантаў зьнікае — ім няма чаго сказаць публіцы. Сёньняшнім поп-сьпевакам і сьпявачкам не стае музычных ведаў. Абавязкова трэба мець адукацыю. Бязь ведаў ня створыш нават поп-твор.

**«НН»: Дык якой павінна быць якасная беларуская папулярная песьня?**

**МФ:** Магу прывесьці ў прыклад творы ў выкананьні Prima Vera і Натальлі Тамелы, якія я ўзяў у рэпэртуар аркестру, бо яны адпавядаюць усім патрабаваньням. Маюць глыбокі тэкст, гармонію (абавязковыя музычныя знаходкі), правільную канструкцыю і чыстае інтанаваньне.

**Размаўляў**
**Сяргей Будкін**


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## Палюбуйцеся на нашаніўцаў

**Фатографы-нашаніўцы сталі пераможцамі конкурсу лічбавай фатаграфіі «Драйв». Юлія Дарашкевіч («Усьмешка пажарніка») заняла другое месца ў намінацыі «Свабодная тэма, экспэрымэнт». Аўтар «НН» яшчэ з пачатку 90-х Дзяніс Раманюк з фатаздымкам з сэрыі «Зона» — другое месца ў намінацыі «Сьвет вакол цябе». Цяпер гэтыя творы можна пабачыць у Галерэі візуальных мастацтваў «Nova» (вул.Харужай, 16, Купалаўская бібліятэка). Фатаграфіі, якія ня трапілі ў экспазыцыю (заля зьмяшчае 40 прац), дэманструюцца на экране тэлевізара. На фота зьлева «Усьмешка пажарніка» аўтарства Юліі Дарашкевіч**

**АВ**

# І Чавэс такі малады

Працяг са старонкі 1.

### «Гілтан» — плацдарм рэвалюцыі

Прыляцелі: звычайны аэрапорт, звычайны горад, які архітэктурна нагадвае праспэкт Машэрава, мора сучасных аўто, на кожным кроку «Макдоналдс», «Кентукі Чыкен», «Філіпс», «Адыдас»… Ёсьць і так званы «індзейскі рынак», аднак там такія цэны, што можна падумаць, быццам той амулет насіў сам Вялікі Інка. Зразумела, тут атаварваюцца выключна замежнікі. Абарыгены спажываюць тыя ж рэчы, што і беларусы: голяцца «Жылетам», шпігуюць дзяцей «Чупа-чупсам» і носяць ліпавы «Лівайс». Цэны прыблізны тыя ж. З адзінай розьніцай: каб набыць усё гэта, вэнэсуэльцам ня трэба цягнуцца на Ждановічы. Увесь горад — вялікія Ждановічы. Уздоўж галоўных авэню кілямэтрамі цягнуцца яткі, зь якіх прадаецца шырспажыў (для даведкі — палова насельніцтва працуе ў нефармальным сэктары).

Адзіным плацдармам рэвалюцыі ў краіне дзікага капіталізму падаўся пяцізоркавы гатэль «Гілтан». У яго канфэрэнц-залі ўвесь час адбываюцца зборы рэвалюцыянэраў — за адзін тыдзень пад гілтанаўскім дахам пасьпелі сабрацца на сусьветны кангрэс антыімпэрыялісты, сябры чавэсаўскай партыі «Бацькаўшчына для ўсіх» і, нарэшце, кубінскія дактары, якіх Чавэс імпартуе з Кубы ў абмен на нафту.

### Усход ёсьць Усход

Каракас — вялікі і доўгі катляван. На дне ямы — буйны сучасны горад з хмарачосамі, мадэрновым мэтрапалітэнам, разьвітай інфраструктурай. Вакол чырвоныя схілы гор. Чырвоныя, бо тут такі колер гліны, зь якой мясцовыя жыхары лепяць мазанкі. Халуп так шмат, што яны фармуюць цэлую ўрбаністычную масу. Яе так і называюць — «Зона Роха» («Чырвоная зона»), або Барыёс.

Барыёс — краіна ў краіне. Там няма вады, сьвятла, туды ня ходзіць паліцыя — можна сканаць, пакуль падымешся па кілямэтровай сьцежцы-лесьвіцы. Улада кантралюецца вулічнымі гангамі, таму візыт турыстаў туды непажаданы.

### І гарэлка з агавы

Другі полюс вэнэсуэльскай мэтраполіі — багатыя раёны накшталт Мірамара і Мэрсэдэс, якія знаходзяцца на Ўсходзе — гэта таксама ўстойлівая назва. Усход — не манатонны на фарбы. Усімі колерамі вясёлкі зіхцяць вітрыны рэстаранаў, шыкоўных клюбаў, казіно, найбуйнейшых у сьвеце дыскатэк. На Ўсходзе раскашуе старая эліта — крэолы і тыя, хто падняўся ў час «сэ барато дагмі до» («гэта танна, давайце два»). Паводле гэтых словаў распазнавалі вэнэсуэльцаў, якія падняліся на нафтавым буме 1970-х. Знаёмы калюмбіец, які гарбаціцца ды-джеем, клянецца, што нават «обліка марале» на Ўсходзе іншыя. Гэта на Захадзе можна зьняць дзеўку за бутэльку гарэлкі (яе тут робяць з агавы). На Ўсходзе — усё па каханьні: яна сама пойдзе да цябе, праўда, пасьля таго, як ты пачастуеш яе какаінам.

### Пяцьдзясят забойстваў штодзень

«Гэта не Гавана. Удзень хадзіце зь сябрамі, а пазьней за сёмую перамяшчайцеся выключна на таксі», — параілі ў гатэлі.

Каракас — адзін з самых крымінальных гарадоў у сьвеце. Кожны тыдзень на яго праспэктах забіваюць 50 небарак. Нават на дэманстрацыі тут ходзяць са зброяй. Путч 11 красавіка 2002 г. пачаўся з таго, што паліцыя нечакана пальнула па маніфэстантах. «Ах так?!» — сказалі дэманстранты, дасталі аўтаматы і пачалі страляць у адказ. Якраз у тыя гарачыя дні Чавэс для барацьбы з контрай раздаў народу зброю. Раздаць раздаў, забраць забыў.




Уга — лепшы сябар Фідэля. Трэцім будзе Аляксандар?

Таму захады бясьпекі напружваюць. Падчас пасадкі ў міжгародні аўтобус кожнага пасажыра здымаюць на камэру і бяруць пашпартныя зьвесткі. Перад тым як увайсьці ў краму, трэба некалькі сэкундаў пазаваць у відэакамэру, каб прадавец зразумеў, што ты не налётчык, і адчыніў дзьверы. Нават фатаграфавацца на вуліцы не рэкамэндуецца. У шыкоўным Мірамары толькі выцягнулі камэру, як адразу мінакі, ківаючы ў наш бок, пачалі круціць пальцамі ля скроні. Мы іх ігнаравалі, бо былі ўпэўненыя, што нас, былых саўкоў, якія выжылі ў 1990-я, так проста ня возьмеш. І дарма. На цэнтральным пераходзе ў мэтро да знаёмага падбег ляцароні, прыціснуў да турнікету і зьдзёр з рукі гадзіньнік. Які прафэсіянал! Увесь гоп-стоп заняў тры сэкунды.

Цікава, што ў іхнім крымінале абсалютна адсутнічае нейкая дыялектыка. У Барыёс, як у той казцы пра бычка: не пасьпелі першыя перабіць другіх, як прыйшлі трэція і замачылі ўсіх, а там і чацьвертыя падцягнуліся.

### Галоўны сувэнір краіны

Пабываўшы ў Вэнэсуэле, зразумеў, чаму іншаземцам так падабаецца Лукашэнка. Клясна прыяжджаць за мяжу і прыкалвацца зь яе экзатычнага лідэра. За тыдзень знаходжаньня ў Каракасе мы амаль закахаліся ўва Уга. Яго штодзённыя дзьвюх-трохгадзінныя выступы па ТБ сталі для нас калыханкамі. Чавэс выступае бурна, і, на радасьць турыстам, час ад часу яго заносіць. Напрыклад, неяк у жывым этэры ён звальняў мэнэджмэнт нафтавай кампаніі PDVSA. Абвяшчаў імя, гудзеў у сьвісток і выносіў вэрдыкт: «Гансалес (сьвісток) — звольнены. Пэдроса (сьвісток) — звольнены».

На апошні дзень візыту галоўны баліварац чамусьці замоўк. Зрабілася сумна. У пошуках прыгод мы накіраваліся ў «Гілтан». І раптам у атачэньні ахоўнікаў зьявіўся Ён. Мы кінуліся па аўтографы, аднак першай пасьпела нейкае дзяўчо. Прэзыдэнт прыпыніўся, пачаў уважліва яе слухаць, па-бацькоўску абняўшы рукой. Парачку адразу атачылі журналісты, застракаталі фотаапараты. Выслухаўшы скаргу сэньярыты, прэзыдэнт нешта паабяцаў. Усе вакол зашушукаліся: хто такая, аб чым гаворка? Стала вядома, што яна прыехала з далёкага-далёкага штату, каб знайсьці ўправу на якогась чыноўніка. Усе былі спакойныя за «хадака»: натуральна, прэзыдэнт навядзе парадак. Падчас сваёй праграмы «Алё, прэзыдэнт» тым, хто дазваніўся і добра паплакаўся, ён нават кватэры ў жывым этэры раздаваў. Вось такі ён, Чавэс!

### Процi Чавэса пад чырвоным сьцягам

Мясцовы аналяг «Зубра» або «Фронту» зьяўляецца групоўка «Бандэра роха» («Чырвоны сьцяг»). Іх графіці — сэрп, молат і слоган «Даеш сацыялізм!» — упрыгожваюць сьцены шматлікіх будынкаў. Каб зразумець гэты дзіўны фэномэн, трэба прыгадаць, што прыход Чавэса азначаў крах усёй партыйнай сыстэмы. Таму сёньня ў апазыцыі можна сустрэць і былога левака-герыльера, і хрысьціянскага дэмакрата, на якога той самы партызан калісь рыхтаваў замах.

Здаецца, іх крытыка Чавэса слушная: у краіне няма дыскусіі па грамадзкіх пытаньнях, усё вырашае Уга, у якога ў галаве бог ведае што. Напрыклад, ён упарта праводзіць антыамэрыканскую замежную палітыку, а таму дапамагае Кубе. Калі прадаць нафту, якая ідзе на падтрымку Кастра, можна было б павысіць сацыялку. Апазыцыя спрабуе данесьці да народу гэтую крытыку, тым больш што ў краіне поўная свабода слова. Чавэсавы апанэнты трымаюць тры з чатырох вядучых газэт, тое ж на тэлевізіі. Аднак усе намаганьні адмарозкаў заканчваюцца фіяска.

На сьнежаньскіх выбарах у парлямэнт партыя Чавэса пераможа без усялякага адмінрэсурсу і датэрміновага галасаваньня. Сакрэт просты: Уга рэальнымі сацыяльнымі праграмамі інтэграваў у палітыку індзейцаў і жыхароў Барыёс. Для апошніх рэальная магчымасьць задарма вучыцца ў т.зв. «Баліварскім унівэрсытэце» або за так падлячыць хранічны бранхіт у «Місіі Сукрэ» — больш аргумэнт, чым усе апазыцыйныя забабоны пра балянс галін улады. Таму пакуль што мае рацыю мясцовы Шандаровіч, аўтар фэльетону «Парады, як не рабіць апазыцыю Чавэсу». Галоўная парада — «Спытайце ў Чавэса».

### Вяртаньне ў маленства

Мы напрасіліся наведаць «Місію Сукрэ» ў адным з кварталаў Барыёс. Зранку доўга трэсьліся ў мэтро, покуль не выйшлі на чарговай Камароўцы. Прабраўшыся праз хеўру камэрсантаў, апынуліся ў дэпрэсіўным квартале: чырвоныя будкі, нядобрыя позіркі, на слупах гронкі правадоў, з дапамогай якіх абарыгены крадуць сьвятло. Амаль на кальцавой — сьвежапабудаваны комплекс будынкаў: гэта і ёсьць «Місія Сукрэ». На яе тэрыторыі знаходзяцца шпіталь, два кааператывы, крама танных прадуктаў — яшчэ адна праграма ўраду. У пэрспэктыве плянуецца пабудаваць кампутарны цэнтар і стадыён. Грошы на будаўніцтва ласкава дае PDVSA. Дзяржава дапамагае кааператывам, выдаўшы ім беспрацэнтны крэдыт на пяць гадоў. Уражаньне ад візыту дзіўнае. Калі ўсе іншаземцы — партугальцы, немцы і гішпанцы, людзі левых поглядаў, — у захапленьні ад убачанага, то ў мяне ўзьнікла непрыемнае дэжавю. Візыт нагадаў прымусовыя экскурсіі на фабрыкі падчас піянэрскага дзяцінства. Мы, як бараны, хадзілі па цэхах і намагаліся хутчэй зваліць у кіно. Украінец, які быў са мною, сказаў, што мая рэакцыя — вынік адсутнасьці ў Беларусі структурных рэформаў. Калі б нейкі ўкраінскі палітык запусьціў такога кшталту праект недзе ў кіеўскай Баршчагоўцы, яго на руках насілі б. Магчыма. Аднак ці будуць сёньняшнія наведвальнікі «Місіі Сукрэ» галасаваць за Чавэса пасьля таго, як атрымаюць адукацыю? Ня пэўны.

*Каракас—Менск*

## СЬЦІСЛА

### Пра Беларусь ва Ўроцлаве

Ва Ўроцлаве 28—29 кастрычніка пройдзе канфэрэнцыя «Польская ўсходняя палітыка». Мерапрыемства ладзіць недзяржаўны фонд «Калегіюм Усходняе Эўропы» пры ўдзеле Міністэрства замежных справаў Польшчы, катэдры па вывучэньні Ўсходняе Эўропы пры Варшаўскім унівэрсытэце ды мэра Ўроцлава.

Мяркуецца, што ў адкрыцьці канфэрэнцыі возьме ўдзел міністар замежных справаў Польшчы Адам Ротфэльд.

**Алесь Курсевіч**

### Пасол з Алтаю ў Беларусь

Як стала вядома газэце «Коммерсантъ», Крэмль узгадніў з А.Лукашэнкам кандыдатуру новага расейскага пасла ў Менску. Ім стане былы алтайскі губэрнатар Аляксандар Сурыкаў. Апошні час ён займаў пасаду памочніка прадстаўніка Пуціна ў Сібірскай фэдэральнай акрузе.

### Адамкус адвёў душу перад Шродэрам

У часе візыту ў Бэрлін літоўскі прэзыдэнт Валдас Адамкус пайшоў на канфлікт з экс-канцлерам Герхардам Шродэрам, паведамляюць нямецкія газэты. Свае рэзкія прэтэнзіі на адрас бэрлінскага кіраўніцтва Адамкус выказаў як падчас асабістай сустрэчы са Шродэрам у Бэрліне, так і ў размове зь нямецкімі журналістамі. Мова ідзе пра нямецка-расейскае пагадненьне аб будаўніцтве трубаправоду ў абыход усходнеэўрапейскіх краінаў і пра нямецкую палітыку адносна афіцыйнага Менску. Паводле ягоных словаў, і Нямеччына, і Эўропа пакінулі без падтрымкі беларускі народ і дэмакратычную апазыцыю. Як паведамляюць нямецкія мэдыі, экс-канцлер Шродэр застаўся незадаволены, што размова паміж ім і Адамкусам адбылася больш чым шчырая і адкрытая. Адамкус выказаў надзею, што Ангеле Мэркель удасца «паўплываць на няўдалыя рашэньні Шродэра».

### У абарону авечак

У Новай Зэляндыі забароняць гуляць у рэгбі з авечкамі. У краіне вельмі папулярныя так званыя гульні з жывёламі ў перапынках паміж матчамі ў рэгбі. Дзеці ганяюцца за авечкамі, апранутымі ў спартовую форму, адпрацоўваючы тым самым гульнявыя сутыкненьні і захваты. Свой катэгарычны пратэст выказалі таварыствы па ахове жывёлаў, і цяпер жывёлін пакінуць у спакоі. Між тым авечкі ўвайшлі ў гісторыю навазэляндзкага спорту №1 ня толькі гэтым. Знакаміты гулец Колін Мідз бегаў па ўзгорках зь дзьвюма авечкамі пад пахамі, трэніруючы тым самым вынослівасьць.

**Мікола Бугай**

Чытаючы рэпартаж пра родныя Суботнікі («НН», №31), **Зянон Пазьняк** быў насьцярожаны. Ня любіць ён гаварыць пра асабістае журналістам, бо «шмат пісалі няпраўды, зьдзекаваліся са сьвятога». А Суботнікі, адлюстраваныя ў паэме Зянона «Вялікае Княства», для Пазьняка сьвятыя. І вось рэпартаж прачытаны. Зь Зянонам Пазьняком гутарыць **Сяргей Навумчык**.

# Я ў іх веру, іх люблю

**— Ці пазналі Вы сваё мястэчка?**

— Так. І быў прыемна ўражаны што рэпартаж вытрыманы ў даволі прыхільных тонах. Заўсёды ёсьць небясьпека, ці спакуса для некаторых журналістаў выкарыстаць такое ў палітычных мэтах, яшчэ раз кінуць камяк з балота ў палітычнага апанэнта. Таму я разумею, што вельмі небясьпечна займацца палітыкай і паэзіяй адначасова. Людзі не аддзяляюць аднаго ад другога. Я — аддзяляю. І калі ўбачыў, што гэтых камякоў якраз няма, а напісана вельмі прыстойна — я быў прыемна ўражаны.

**— Здаецца, упершыню ў прэсе былі згаданы некаторыя эпізоды Вашага дзяцінства. Крыся Макаўчук, аднаклясьніца… Памятаеце гэтую Крысю?**

— Я памятаю ўсіх аднаклясьнікаў. Для мяне яны ўсе засталіся ў тым ўзросьце, а многіх я ня бачыў па 50, па 40 гадоў, і гэтыя ўспаміны — крыніца добрых уражаньняў. У мяне наагул усіх суботніцкіх ідэальнае ўспрыманьне. Крысю выдатна памятаю. Яе дзявочае імя Грынюк. Я з гэтай Крысяй сядзеў нават за адной партай у 9-й клясе. У нас былі тры Крысі ў клясе. Усе прыгожыя, харошыя.

**— Але яна кажа, што не падзяляе поглядаў Пазьняка.**

— Крыся? Яна падзяляе мае погляды! Гэта яна журналістам так кажа. Я ведаю суботніцкіх людзей. Крыся ніколі не была маім праціўнікам. Такая ў яе была натура, а натура і за жыцьцё ня зьменіцца, я думаю.

**— Яна прыгадвае, што Вы прывязвалі яе косы. Праўда, не ўдакладняе да чаго — да парты ці да дзьвярной ручкі.**

— Можа быць, яна перабольшвае… Нас у дзявятай клясе рассадзілі, таму што мы ўвесь час размаўлялі паміж сабой, аб «жыцьцёвых праблемах». Я ня памятаю гэты выпадак дзіцячы наконт косаў. Ну, пакеплівалі адно з аднаго…

**— А вось яшчэ — Вы былі ў юнацтве закаханы ў такую гімнастку, Ядзю Шчыкнаву.**

— Была такая дзяўчына. Харошая дзеўка… Людзі ў юнацтве трошкі любяць перабольшваць, бо назіраюць, хто на каго глядзіць, хто з кім танцуе, хто кім цікавіцца. Але яны заўважылі, што інтарэс у нас быў з гэтай Ядзяй Шчыкнавай. Юнацкія пагляды былі. Ну але што астатнія людзі вывады робяць праз 50 гадоў — гэта мітатворчасьць.

Там, дарэчы, столькі міталёгіі, што я чытаў рэпартаж зь вялікім сьмехам. Бо шмат такіх міталягічных карцін, якія былі нават не са мной, але мне прыпісаны. Накшталт анэкдоціка, як малы зьвярнуўся да дзядзькі па мянушцы — «дзядзька Хрэн». Гэта сапраўдны быў выпадак, але гэта было не са мной. Гэта было зь іншымі дзецьмі. А прыпісана мне.

**— Там яшчэ суботніцкія цытуюць нібыта Вашу фразу «Лепш Лукашэнка, чым безуладзьдзе».**

— Усе фразы — а ёсьць яшчэ «Хоць з лучынаю, але будзем жыць самастойна!» — міталёгія. Я такога не казаў. Здараецца, што часам людзі, слухаючы выступ, не заўсёды разумеюць зьмест ідыёмы, але запамінаюць некаторыя фразы. Памяць вырывае фразы з кантэксту — фраза гучыць нечакана. Але я ў гэтым выпадку бачу адпаведную работу. Таму што добра ведаю, як на Івейшчыне, калі я ішоў на прэзыдэнта, блукалі фразы, прыдуманыя ў адпаведных органах. Таму такая міталёгія мае адзіную крыніцу існаваньня, і яна запушчана ў народ маімі палітычнымі праціўнікамі. А «Я сам бачыў, сам чуў» — нічога ня значыць. Людзі не задумваючыся могуць казаць такое, каб пераканаць суразмоўцу, што гэта праўда. І самі пачынаюць у гэта верыць. Таму тое, што апісалі журналісты — яны й самі гэта адчулі, — міталёгія.

## Дзівосны дух

**— У рэпартажы Вашы землякі настальгічна прыгадваюць колішняе хараство Суботнікаў…**

— Суботнікі — дзівоснае месца, нідзе такога на зямлі няма. Яно цяпер зьнішчанае. Там усё разбурана. Мне паказваў фатаграфіі мой сябар — Юзэф Русакевіч… Уся цэнтральная вуліца зьнесена. А ў 1950-х такое было хараство… Млын стаяў, вялікая рэчка! Дзясяткі карпусоў санаторыі ў сасновым лесе. Усё зьнішчылі, усё парасьцягалі, усё згадзілі.

Рака, як млын разбурылі, перасохла. А колісь коні тапіліся, такая была глыбокая. Ідзеш па беразе — рэчка кішыць ад рыбы! І вывучаеш, якія рыбы, бо ўсё відаць… Вада чыстая. У Суботніках жыве нейкі дзівосны дух… Там ёсьць месцы, дзе вельмі добра відаць, як раставаў ледавік, як марэнныя выдмы засталіся. Я ж карты рабіў… Бачна, як рэчышча Гаўі мянялася. Чалавек, які трошкі разумее ў археалёгіі і геалёгіі, можа гэта ўсё ўбачыць. І нідзе — як толькі ў Суботніках — я такога ня бачыў, каб вельмі добра ўсё было відаць. Як заплюшчыш вочы — быццам учора зьнік ледавік, учора высахла гэтая марэнная вада. Калі з вышыні, з узгоркаў глядзіш — гэта дзіўна, бо марэннай прыроды такой, як у Беларусі, нідзе няма. У Амэрыцы, у Канадзе зусім іншы ляндшафт, другое адчуваньне. Тут не было ледавікоў, тут скала выходзіць на паверхню. А віленская прырода — гэта дзівосна! І вось Суботнікі — гэта асаблівая мясьціна, дзе дыхаюць тысячагодзьдзі. І апісаны ў паэме сон — праўда. Я знайшоў гэтыя старыя Суботнікі цераз сон, ля Сіняга Вока. Калі пайшоў туды, калі капнуў рыдлёўкай, толькі ўскрыў гэты дзірван, і пад ім — кафля XVI ст. Мяне як апякло, як токам ударыла! А я ж там у дзяцінстве колькі разоў быў, колькі мы сядзелі там. І ня ведалі, што пад намі, празь дзесяць сантымэтраў, — жывая гісторыя нашага мястэчка.

**— Пра Вашы школьныя гады з рэпартажу вынікаюць супярэчлівыя высновы. Вучыўся добра, а вось паводзіны… Вас са школы выганялі?**

— Так, і гэта быў кашмарны час, гэтая школа за Сталіным. Часам дзецям помсьцілі за бацькоў. Мая маці была чалавек незалежны, справядлівы. Яна ніколі не паддавалася ні на якія правакацыі начальства, і помсту я адчуваў на сабе. Быў такі выпадак, што ў 4-й клясе маці мяне забрала са школы. Мяне як бы выключылі, а яна забрала і аддавала на «дзядзькаваньне» ў Васілевічы. У дзядзькі там на дзярузе спаў. Каб трошкі пазнаў іншага жыцьця. Потым ужо, як стаў дарослы, мне вядома стала ўся гэтая гісторыя.

Каб не сям'я загінулага на фронце — а гэта ўлічвалася бальшавікамі, — нас бы вывезьлі ў Сібір. Я малы даказваў настаўнікам, што Бог ёсьць, зьдзекаваўся з Варашылава. Дзеці ж ня ўтойваюць свайго стаўленьня. Я дзіцячым розумам неяк рэагаваў на тое, што цяжка яшчэ было асэнсаваць, але з гледзішча дзіцячай справядлівасьці трэба было выказацца.

**— Яшчэ кажуць, што Вы праяўлялі фатаздымкі без электрычнасьці з дапамогай сонца — гэта таксама нешта міталягічнае?**

— Не, гэта праўда. Была такая дзённая фоталябараторыя. Толькі ня ў хаце, а ў


СЯРГЕЙ НАВУМЧЫК

Пазьняк ня мае машыны, карыстаецца мэтро, і на дарогу ў Нью-Ёрку траціцье чатыры гадзіны на дзень. Два — у адзін бок, два — у другі.

двары. Я зрабіў спэцыяльную лябараторыю пад сонцам, замест электрычнасьці, фільтры ставіліся… Рабілася такая хата, накрывалася чорнай тольлю, рабілася вэнтыляцыя.

**— З чым гэта было зьвязана?**

Зь перабоямі на электрастанцы ў Замыславе. Часта летам не было сьвятла, а рабіць здымкі трэба было. Вось і знайшлі выйсьце. І гэта не адзін я так рабіў, многія фатографы, якіх было ў мястэчку шмат.

**— Цяпер «Вялікае Княства» выходзіць асобным выданьнем — разам з Вашымі здымкамі розных часоў.**

— Суботнікі здымаў з 1950-х. У мяне іх сотні тысяч, а мо і мільёны, гэтых нэгатываў. На вялікі жаль, гэта ня тут, а ў Менску. Некаторыя бракаваныя здымкі, якія я ня выкінуў (бо звычайна брак я рваў), — яны трапілі да мяне. Ёсьць здымкі з 1950-х. Але калі б я складаў гэтую кніжку ў Менску, дык я б зрабіў яе «на ўсю катушку» з пункту гледжаньня фатаграфіі. Таму што зьнята вельмі шмат. І гэта ўжо гісторыя.

## Бацька беларускага «ню»

**— Вы здымалі ня толькі Суботнікі. Увесну 1996-га мая жонка хацела правесьці ў Менску выставу Вашых фататвораў, якія ў 1970-я зрабілі фурор тым, што ўяўлялі сабой эротыку…**

— Не эротыку, а ню. У 1970 г. у Менску перадавым журналістам, фатографам і фотарэпартэрам удалося прабіць выставу сучаснай фатаграфіі. Яна адбывалася ў залі Саюзу мастакоў на праспэкце Скарыны, і там былі 22 мае вялікія фатаграфіі (уся выстава — каля 200 здымкаў). І яе, канечне б, зарэзалі, бо Мінкультуры ўбачыла там крамолу. Там упершыню былі выстаўлены ню, што ў савецкай фатаграфіі абсалютна адсутнічала.

**— І гэта былі Вашы ню?**

— Якраз толькі мае. Але рэч ня ў тым, я гэтым асабліва не захапляўся. Проста паспрабаваў у фатаграфіі ўсе жанры, усе тэхнікі. Я ведаю некаторыя тэхнікі, якіх у Беларусі ня ведаў ніхто. Цяпер яны ўжо з разьвіцьцём кампутарнай графікі мала патрэбныя.

**— Як Вы ў пурытанскія 1960-я ўгаворвалі жанчын здымацца аголенымі?**

— Я вучыўся ў мастацкай акадэміі, там былі натуршчыцы, з гэтым не было ніякіх праблем. Іншая справа, што натуршчыца для мастака не падыходзіць для фатографа. Альбо спэцыяльную здымку рабіць, каб пазьбегнуць натуралізму, бо эфэкт можа быць адваротны.

**— Значыць, суботніцкі дзяўчат на тых здымках не было?**

— Натуральна! Дык вось, мусілі выставу «зарэзаць», але дапамог выпадак. Калі прымалі экспазыцыю, прыйшоў адзін з кіраўнікоў ЦК КПБ, які цікавіўся фатаграфіяй. Ён ніколі ня бачыў нічога падобнага. Ня ведаў, што такое ізабэль, фатабарэльеф, якім чынам атрымліваецца псэўдасалярызацыя — тыя тэхнікі, якія тады яшчэ мала ўжываліся. А яны на выставе найбольш былі прадстаўлены ў мяне. Ён настолькі ўразіўся, што папрасіў аўтара. Я падышоў, растлумачыў. І ўбачыў, што яму спадабалася. Калі адбывалася абмеркаваньне, першым выступіў міністар культуры і проста раста-



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Суботніцкі касьцёл.

птаў усю нашу выставу як «антыідэалягічную», заявіўшы, што яе трэба закрыць. І тут гэты прадстаўнік ЦК даў па носе міністру. І вось гэтае самадурства (менавіта самадурства, з такім жа посьпехам ён мог і адваротнае рашэньне прыняць, калі б яму не спадабалася нейкае адно маё слова ў размове) дало штуршок да таго, што выставу дазволілі. Сапраўды, гэта быў фурор — у 1970-м нічога падобнага не было. Было шмат наведвальнікаў. Пасьля гэтага я зрабіў выставу са 120 вялікіх фатаграфій, і гэтую экспазыцыю на працягу двух дзесяцігодзьдзяў хацеў выставіць. За Саветамі мне гэта зрабіць не ўдалося. Яна і цяпер ляжыць у адным месцы, як твая жонка і зьбіралася выставіць. Цяпер прайшло больш як трыццаць гадоў, амаль сорак… Здымкі састарэлі, пайшлі, відаць, пацёкамі… Ну нічога. Некалі вернемся ў Беларусь — паглядзім.

## Каб не ўкладвалі ў рану пальцы

**— Якраз вяртаньнем Вашым у Беларусь рэпартаж і завяршаецца. Усе мае суразмоўнікі — і ў Нью-Ёрку, і ў Празе — пытаюцца пра вяртаньне Пазьняка і яго ад'езд. Гэта абрасло такой міталёгіяй, што прыйдзецца выдаваць кнігу пра тую эпапэю з нашым ад'ездам і палітпрытулкам, каб урэшце паставіць кропку.**

> Суботнікі — дзівоснае месца, нідзе такога на зямлі няма. Гэта асаблівая мясьціна, дзе дыхаюць тысячагодзьдзі.

— Я даўно кажу — трэба выдаваць. Бо калі мы маўчым — гавораць непрыяцелі.

**— Хочацца, каб кніга была фактам мэмуарыстыкі, а не палітыкі, бо некаторыя цяперашнія лідэры апазыцыі выявяцца ў зусім непрывабным сьвятле. Ваша зямлячка Марыся Гражынская пераканана, што Пазьняк вернецца. У 2001-м Вы зьбіраліся вярнуцца, калі б Вас зарэгістравалі ў якасьці кандыдата ў прэзыдэнты — дзеля гэтага трэба было сабраць сто тысяч подпісаў, але некаторыя былыя паплечнікі зьбіралі подпісы не за Вас. Якая ўмова вяртаньня цяпер?**

— Умова зразумелая. Пакуль будзе гэты кагэбоўскі рэжым з Лукашэнкам, вярнуцца будзе немагчыма. І я думаю, што людзі гэта разумеюць. Ва ўсялякім разе, у Суботніках. Мае суботніцкія вельмі талкова гавораць. І Фэлька Балдоўскі, сусед, і Марыся Гражынская. Праўда, Гражынская — гэта вельмі паважанае прозьвішча, можа, гэта і ня тая жанчына. Была Марыя трошкі старэйшая за мяне, вельмі прыгожая, яна пазьней была сакратаром сельсавету. Можа, гэта яна гаварыла, цяжка сказаць… Прыкладам, з маёй маці Ганнай Пазьняк — ёсьць у Суботніках другая Ганна Пазьняк, дарэчы, сваячка. Таму невядома, пра каго ідзе гаворка.

Але сам зьмест паказвае (і журналісты ў «НН» гэта адлюстравалі): суботніцкія людзі — яны ўсе за мяне. Але ня кожны хоча гэта сказаць голасна, бо пабойваецца. Ці мала што? Гэта такая псыхалёгія асьцярожнасьці, застрашанасьці. Але потым дзесьці, ціშочкам, сам-насам (што журналісты заўважылі), яны скажуць, што яны за Пазьняка і за тое, каб ён вярнуўся. Я сваіх людзей ведаю. І я ў іх веру, іх люблю. І гэта ж адлюстравана ў паэме. І што недзе гэта адчулі журналісты — мне гэта вельмі прыемна.

Гэта вельмі шчымлівая размова, і не хацелася пра ўсё гэта шчыра гаварыць у прэсу, каб ніхто ня ўкладваў у раны свае пальцы. Але рэпартажам разварушылі ўспаміны… Во такія, брат, справы…



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**У сажалцы за Зянонавай хатай (справа) — найлепшыя карасі.**

**Прачытаўшы пасьляслоўе Сяргея Навумчыка** да асобнага выданьня паэмы «Вялікае Княства», дзе будуць вершы і фатаздымкі, Пазьняк запатрабаваў паўсюль прыбраць ягонае прозьвішча, пакінуўшы толькі «Зянон». «Няўжо Вы думаеце, што нехта ня ведае прозьвішча Зянона?» «Ня проста «нехта», а палова чытачоў, а то і болей, ня ведаюць, — адказаў Пазьняк. — І ня трэба, каб ведалі. Палітыка — асобна, паэзія — асобна».

## Салідарнасьць — штомесяц 16-га!

**На Кангрэсе дэмакратычных сіл найбольш спадабаўся дэвіз — «Разам за свабоду і перамены!».** Урэшце трэба паставіць кропку і сказаць: «Няма прыватнай праблемы Скрабца. Няма вузкакааліцыйнай ідэі рэфэрэндуму Вайтовіча, Фралова, Лявонава. Няма болю толькі блізкіх зьніклых палітыкаў». Ёсьць агульнанацыянальная праблема перасьледу за іншадумства, і яе ахвярай зьяўляецца Сяргей Скрабец. Ёсьць праблема камунікацыі апазыцыі з грамадзтвам, і падрыхтоўка да рэфэрэндуму дазволіць кантактаваць з выбаршчыкамі і лібэралам, і сацыял-дэмакратам, і камуністам, і сябрам Партыі БНФ. А ідэя Красоўскай, Халіп, Сасіма пра 16-га — гэта магчымасьць беларусам адчуць салідарнасьць. Незалежна ад палітычных поглядаў, сымпатый і антыпатый.

І пакуль «адзіны» фармуе выбарчыя штабы, дэмакратычная грамадзкасьць магла б плённа рыхтаваць акцыі да 16 лістапада, потым — 16 сьнежня. Разам мы маглі б аптымізаваць альгарытм правядзеньня акцыі салідарнасьці 16-га. Я сам адправіў больш за два дзясяткі SMS, і абанэнты добра паставіліся да гэтай ідэі. А колькі грамадзян мы не далучылі да акцыі, таму што дзейнічалі несалідарна!.. Але ў нас яшчэ ёсьць час, каб выправіцца і прадэманстраваць рэжыму моц салідарных дзеяньняў.

**Леанід Гаравы, Гарадок**

## Хто вінаваты: Вік ці падвічкі?

**Спрэчкі наконт «Нямецкай хвалі» не сьціхаюць: 15 хвілін радыёэтэру ўзьнялі хвалю пратэсту. Але сытуацыю з моваю на «Нямецкай хвалі» справакавалі беларускія палітыкі.** Беручы ўдзел у розных сэмінарах, я быў сьведкам аднолькавых падзей. Прысутнічае які замежнік — адразу ўся эліта апазыцыі пераходзіць на расейскую. Часта гэтак здаралася за бытнасьцю тут пана Віка. Не было ў яго перакладчыка, які б валодаў беларускай мовай. Таму ўздымаўся на трыбуну які спадар Грыб ці Лябедзька ды пачынаў шпарыць па-расейску, а калі нейкі недарэка асьмельваўся казаць па-тутэйшаму, на яго сыкалі мясцовыя палітыкі, крывіўся перакладчык. Замежнікаў у нас прынята паважаць больш за сябе.

А хто цяпер у Нямеччыне лічыцца найбольшым знаўцам палітычнай сытуацыі ў Беларусі? Той самы сп.Вік, як мог паведаміць, што ў Беларусі ўсе размаўляюць і разумеюць па-расейску, і грошы на нейкую вайсрусьляндзкую мову можна ашчадзіць.

Дарэчы, праз гэтую непавагу да сябе ніхто з апазыцыі не запатрабаваў прабачэньняў у ледзь не прыехаўшага да нас паслом Аяцкава, які сказаў сёе-тое аб нашай дзяржаве. Дзякуй Лукашэнку — азваўся.

Ды што там «Нямецкая хваля». Учора ўкінулі ў паштовую скрыню «Народную волю». Зь сіненькім паўкруглым штэмпэлем: «Для рекламных целей» — па-расейску. Якая тут ужо «Нямецкая хваля»…

**Руслан Равяка, Баранавічы**

## А ў Вялейцы па старой калейцы

**У артыкулах аб «адзіным» зашмат эўфарыі.** Прайшло колькі тыдняў з Кангрэсу, а «электарат» у рэгіёнах ці чуў пра Кангрэс і вынікі яго. Рэальнасьць больш сумная, чым падаецца зь Менску. Незразумела, хто, каго, якім чынам завабіць выйсьці ў патрэбны момант на патрэбнае месца. Дэмбосы бавяць час у разьездах з прэзэнтацыяй «першай перамогі», і невядома, ці ёсьць увогуле якія-небудзь «напрацоўкі»?

**Я. зь Вялейкі**

## Як тэатрал тэатралу

**Як малады актор Купалаўскага тэатру, не пагаджуся, што наш тэатар нэабуржуазны, мяшчанскі, традыцыйны і тым больш савецкі (М.Халезін: «Пінтэр актуальны для Беларусі», «НН», №39, 21 кастрычніка).**

Дастаткова праглядзець афішу, каб убачыць, што побач з клясычнымі творамі ёсьць месца экспэрымэнтальным пастаноўкам (напрыклад, спэктакль «СВ» паводле А.Чэхава). Нашы акторы — прафэсіяналы і гатовы працаваць над любым матэрыялам. Дый публіка ў нас зусім не такая ўжо дурная і савецкая. Ня трэба шукаць ворагаў там, дзе няма. Трэба больш прафэсійна і творча рабіць сваю працу ды ня скардзіцца сп.Стопарду на наш гаротны лёс. Пастаноўкі тады сур'ёзныя, калі зроблены прафэсійна. Неістотна, дзяржаўны гэта тэатар ці антрэпрыза, камэдыя ці трагедыя, сучасная п'еса ці клясычная.

**Раман Падаляка**

P.S. Спэктакль «Псыхоз» ідзе ўсё ж такі па-расейску.

## Каінава ахвяра

**Мне вельмі спадабаўся камэнтар Б.Тумара: «Дырэктарка «НХ» («НН», №38, 14 кастрычніка): «Беларускую мову адстойвае купка апазыцыянэраў».** У гутарцы з К.Рабіц мяне больш за ўсё абразілі словы: «Недарэчна казаць, што ўсё беларускае — гэта добра, а ўсё расейскае — гэта дрэнна». Мне так і хочацца сказаць ёй: «Можа, ня ўсё беларускае добра. Але гэта наша ўласная справа. І ня Вам вырашаць, што для нас добра, а што дрэнна. Расейскае для нас — проста іншае. Бо чужое».

Я не зьбіраюся слухаць «НХ» ні на якой мове. Бо нават калі яны пачнуць вяшчаць па-беларуску, гэта будзе Каінава ахвяра.

**Сяржук Пятровіч, Барысаў**

## Памылкі ў «НН»: вачыма настаўніка гісторыі

**Кожны чытае газэты пасвойму. Я — вачыма настаўніка гісторыі.** Ня раз бывала, што мае вучні даведваліся пра нейкі факт з друку і ўспрымалі інфармацыю пра яго як праўдзівую. Шкада, але і «НН» друкуе невэрыфікаваныя зьвесткі. У №38 я знайшоў некалькі недакладанасьцяў.

На 11-й старонцы ў подпісе пад здымкам паведамляецца, што Аляксандар Мілінкевіч усклаў кветкі «да магілаў першых прэзыдэнтаў БНР Пётры Крэчаўскага і Васіля Захаркі». Па-першае, ня Крэчаўскага, а Крачэўскага. Носьбіт гэтага прозьвішча кіраваўся этымалягічным прынцыпам і пісаў «Крэчэўскі», што, дарэчы, зафіксавана на здымку. Каліісьці за фанэтычным прынцыпам, дык трэба пісаць «Крачэўскі», што і зроблена ў «Энцыкляпэдыі гісторыі Беларусі» і «Беларускай энцыкляпэдыі». І звалі яго ня Пётрам, а Пятром, што таксама зафіксавана на здымку. Пётрам ён быў у побыце. Па-трэцяе, П.Крачэўскі ня быў прэзыдэнтам БНР — ён зьяўляўся старшынём Рады БНР. Прэзыдэнтаў БНР ня мела ніколі. Мікола Абрамчык быў прэзыдэнтам Рады БНР. Але ягоным наступнікам вярнулі тытул старшыні. Па-чацьвёртае, Пётар Крачэўскі і Васіль Захарка — не былі яны і першымі старшынямі. Першы пасаду старшыні Рады БНР займаў Іван (Янка) Серада. У ліпені 1918 г. старшынём Рады БНР стаў Язэп Лёсік. А ўжо 13 сьнежня 1919 г. прыйшоў час П.Крачэўскага…

Зьвернемся цяпер да гісторыі кулінарыі і літаратуры. Студэнтка Наталка Харытанюк паведамляе, што ў яе, калі ўбачыла бабулін рэцэпт аднаго торту, «як у Тараса Бульбы, аж сьлінкі пацяклі ды забурчала ў жываце». Мне ж помніцца, што і сьлінкі пацяклі, і забурчала ў жываце ня ў гогалеўскага Тараса, а ў паляcоўшчыка Тараса, які зьнячэўку трапіў на Парнас. Там, як вядома, «дзеўка Геба» карміла багоў.

Як унясла… на стол каўбасы,
Бліны аўсяны ў рашаце,
Аж сьлінкі пацяклі ў Тараса
І забурчала ў жываце.

Гэта добра, што моладзь чытае клясыку. Але не заўсёды трэба пакладацца на памяць. Памяць — ненадзейны саюзьнік ня толькі аўтараў гістарычных тэкстаў. Кулінарных — таксама.

З артыкулу пра Валіка Грышка («НН» №39) я даведаўся, што імя Веня ў перакладзе з лаціны азначае «любы сын». Спачатку трэба ўдакладніць: гаворка ідзе пра Веніяміна (Бэньяміна) ці пра Бэнэдыкта, якога ў праваслаўным асяродзьдзі падчас мянуюць Венядзіктам? Калі пра Веніяміна, дык гэта імя перакладаецца як «сын правае рукі». Праўда, Томас Ман у рамане «Язэп і ягоныя браты» (кніга «Якубава былое», разьдзел сёмы «Рахіль», навэля «Бэноні») піша што імя Веніямін, якое Якуб-Ізраіль даў свайму дванаццатаму сыну, перакладаецца як «сын адзіна праведнай» (Бэньямін). Што ж да Бэнэдыкта-Венядзікта, дык, здаецца, яно паходзіць ад слова *benedictus* – добраславёны, блаславёны.

Нарэшце, цікавы артыкул пра магчымага настаўніка Паўлюка Багрыма («Дык хто ж такі Магнушэўскі?») яшчэ й пасьмяшыў мяне, бо Язэпа Янушкевіча ў ім называюць «Якушэвічам».

**Анатоль Сідарэвіч**

## Новы мэсія

**Толькі на Лукашэнку, на бога нашага, засталося спадзявацца, што зьявіцца нарэшце шмат год таму абяцаная адміністрацыяй Сеньненскага раёну запраўка ля дарогі Ворша—Лепель.** Што ён дапаможа ёй выканаць абяцанкі і неяк адрэагаваць на заяву ўсіх жыхароў вёскі Малая Беліца, якія зь вясны чакаюць, што адрамантуецца нарэшце ўшчэнт разьбіты невялікі кавалак дарогі ў гэтай вёсцы, бо куляюцца бітоны, калі вязеш ваду. І хоць вада наша наскрозь разьядае тыя бітоны, ды безь яе ня жыць як людзям, так і скаціне…

**М.Бельскі, в.Малая Беліца (Сеньненскі раён)**

## Подпісы за беларускамоўнае вяшчаньне на Беларусь радыёстанцыяй «Нямецкая хваля»:

Андрэй Данілюк, Тацяна Кулакевіч, Міхаіл Абраменя, Ігар Кашпараў, Уладзімер Булаўкін, Мікола Цімашэнка, Валеры Гойдзь, Сьвятлана Гойдзь, Анатоль Тальянскі, Юры Цыпрук, Яўген Смолка, Дзяніс Дайліда, Ігар Вашчык, Сяргей Капытка, Тамара Капытка, Ала Орса-Рамана, Галіна Навумчык, Ганна Бартуль, Ірына Храпава, Ніка Шашкель, Вадзім Лешчанецкі, Аляксей Маркуша, Ірына Протас, Дзьмітры Парэцкі, Андрэй Хадасевіч, Вольга Макрак, Алесь Шчарбацэвіч, Аляксандра Грыгорчык, Алесь Міцкевіч, Галіна Андрайчук, Алесь Андрайчук, Ларыса Санкевіч, Андрэй Чыж, Глеб Мацюнін, Крыстына Фішэр, Сяржук Шчарбацэвіч, Станіслаў Мароз, Віталь Пузач, Аляксандра Лістоўская, Юры Касьцюкевіч, Кастусь Верабей, Марыя Верабей, а.Вячаслаў Логін, Ганна Войтанка, Людміла Бакуновіч, Зьміцер Юшчык, Віка Канавалава, Віктар Жук, Арсені Афінагенаў, а.Эмігідыюш Рыжы, Мікалай Станько, Юры Пырх, Алег Купрыянаў.

**Кастрычнік, Нью-Ёрк**

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам.

Наш адрас:
а/с 537, 220050, Менск.
e-mail: nn@promedia.by.
Факс: (017) 284-73-29.



МАЛЮНАК СЯРГЕЯ ХАРЭЎСКАГА

Так! Пераходзім цяпер на дровы!..

# Ня ўсё ў жыцьці апошні раз

Найтаньнейшая падпіска: сьпіс шапікаў

**Найтаньнейшая падпіска на «НН» — на шапікі «Менгарсаюздруку». Каштуе такая падпіска на месяц усяго 3440 рублёў. Забіраць сваю газэту можна ў любой зручнай для вас гандлёвай кропцы «Белсаюздруку» ўжо ў чацьвер па абедзе. Друкуем адрасы пунктаў, дзе можна аформіць падпіску «Да запатрабаваньня».**

**Участак падпіскі «Белсаюздруку»:**
вул.Валадарскага, 16, пак.200 — 227-88-41

**Пункты прыёму падпіскі:**
вул.Жукоўскага, 5, корп.1 — 224-32-03
вул.Раманаўская Слабада, 9 — 200-83-04
вул.Кашавога, 8 — 230-29-20

**Крамы:**

| | | |
|---|---|---|
| №1 | вул.Жукоўскага, 5 | 224-03-76 |
| №2 | пр.Скарыны, 44 | 284-83-59 |
| №3 | пр.Скарыны, 76 | 232-46-23 |
| №4 | вул.Леніна, 15 | 227-11-92 |
| №5 | вул.Енісейская, 6 | 243-16-30 |
| №6 | вул.Філімонава, 1 | 235-63-11 |
| №7 | вул.Коласа, 69 | 288-30-20 |
| №8 | вул.Сурганава, 40 | 232-45-10 |
| №9 | пр.Ракасоўскага, 140 | 247-30-15 |
| №10 | бульвар Шаўчэнкі, 7 | 233-74-88 |
| №11 | пр.Пушкіна, 77 | 255-80-71 |
| №12 | вул.Кіжаватава, 80 | 278-77-61 |
| №13 | вул.Каліноўскага, 82/2 | 264-06-42 |
| №14 | вул.Валадарскага, 22 | 227-75-55 |
| №15 | вул.Танка, 16 | 203-82-39 |
| №16 | вул.Харужай, 24 | 234-27-25 |
| №17 | вул.Някрасава, 35 | 231-03-28 |
| №18 | ст.м. «Плошча Перамогі» | 284-31-06 |
| №19 | пр.Машэрава, 5/1 | 223-81-66 |
| №20 | вул.Ясеніна, 16 | 271-87-21 |
| №21 | ст.м. «Пушкінская» | 255-57-20 |
| №22 | вул.Ілімская, 10, корп.2 | 243-16-83 |
| №23 | вул.Славінскага, 39 | 264-36-33 |
| №24 | вул.Жылуновіча, 31 | 295-05-74 |
| №25 | вул.Маркса, 21 | 227-08-52 |
| № 26 | пр.Скарыны, 113 | 264-22-91 |

**Шапікі:**
№18 БДТУ, вул.Сьвярдлова, 13/4
№18 Пэдунівэрсытэт, вул.Савецкая, 18
№78 Гатэль «Юбілейны», пр.Машэрава, 19
№95 Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва, вул. Мясьнікова, 39
№136 ст.м. «Плошча Якуба Коласа», выхад да Акадэміі фізвыхаваньня
№187 Гатэль «Беларусь», вул.Старажоўская, 15
№189 «Маскоўскі»
№198 БДЭУ, пр.Партызанскі, 26
№209 Прахадная МАЗу, вул.Сацыялістычная, 2
№228 культуры, вул.Рабкораўская, 17
№232 Менскі з-д халадзільнікаў, пр.Машэрава, 61
№245 Больніца хуткай дапамогі, вул.Кіжаватава, 56
№259 Менскі гандлёвы каледж, вул.Усходняя, 183
№260 пр.Скарыны, 169
№262 Гатэль «Плянэта», пр.Машэрава, 31
№298 пр.Машэрава, 75/1
№302 9-я больніца, вул.Сямашкі, 8
№313 Слабадзкі праезд, 24

# Што мне рабіць?

Беларуская музыка зломіць беларускую дыктатуру. Піша Віталь Тарас.


Андрэй Лянкевіч

Калі нехта думае, што назву артыкулу падказала савецкая школьная праграма, то памыляецца. Чарнышэўскі тут ні пры чым. Натхніў мяне, хутчэй, музычны жарт Зьмітра Бартосіка, які Купалаў верш «Мужык» паклаў на кампазыцыю рок-гурту «Смоўкі» «What can I Do?» Падаецца, што аўтар жарту і сам не зразумеў, што ён зрабіў. Нехта ўбачыў у «Што мне рабіць?» пародыю на культавы рок-гурт, нехта — зьдзек з клясычнага тэксту. Мне ж бачыцца ў гэтым спантанны культурніцкі акт, поўны глыбокага сымбалічнага сэнсу. Але, зноў жа, гаворка пойдзе не пра Купалу і не пра «Смоўкі». Хоць часткова гаворка тычыцца рок-музыкі. Але пра яе — крыху пазьней.

### Простая гісторыя

Тэлеканал «Лад» быў задуманы як аналяг расейскага каналу «Культура». Ён мусіў паказваць найлепшыя перадачы гэтага каналу, а таксама — яшчэ найлепшыя перадачы ўласнай вытворчасьці. Але ў выніку «Лад» стаў нагадваць у найлепшым выпадку расейскі тэлеканал «Спорт». А большасьць перадач расейскай «Культуры» ў Беларусі можна назіраць цяпер толькі праз спадарожнік — на канале «РТР-Плянэта». Кажу пра гэта са шкадаваньнем не таму, што Беларусь нібыта апынулася ў ізаляцыі ад расейскай культуры. Тэлебачаньне, у прыватнасьці расейскае, да культуры ў высокім сэнсе слова мае вельмі ўскоснае дачыненьне. Аднак часам чужыя непалітычныя тэлепраграмы, зробленыя дзеля чыста ўнутранага спажываньня, дапамагаюць пагледзець на сябе як бы звонку.

Так, расейская перадача цыклю «Тым часам» была прысьвечаная 100-годзьдзю царскага маніфэсту 17 кастрычніка, які абвясьціў грамадзянскія свабоды для насельнікаў імпэрыі. Але размова за круглым сталом вялася ня столькі аб падзеях 1905 г., колькі аб тым, ці ёсьць гісторыя сама па сабе шматварыянтнай альбо яна разьвіваецца паводле прадвызначанага аднойчы і назаўсёды шляху. Адзін з удзельнікаў круглага стала, прадстаўнік расейскай акадэмічнай навукі, сфармуляваў адказ лаканічна: у расейскай гісторыі ніколі не было альтэрнатывы, тым больш ліберальна-дэмакратычнай. Гісторыя Расеі заўсёды была й назаўсёды застанецца гісторыяй імпэрскай ды праваслаўнай. І ў гэтым палягае веліч дзяржавы. Што ж да свабоды выбару, дык, на думку расейскага навукоўца, чалавек можа разглядаць айчынную гісторыю зь інша-га — не імпэрска-праваслаўнага гледзішча. Але тады гэты чалавек ня мае права называцца расейцам і лічыць сябе патрыётам. Яго трэба разглядаць як ворага народу.

Цудоўным чынам расейскі прафэсар, сам таго ня ведаючы, сфармуляваў тыя прынцыпы, на якіх грунтуецца ня толькі расейская афіцыйная гісторыя, але і сучасная дзяржаўная ідэалёгія ў Беларусі. Альбо ты прымаеш дзяржаўную ўладу на чале з прэзыдэнтам як нейкую дадзеную небам адзіна магчымую рэальнасьць і пры гэтым падзяляеш праваслаўныя каштоўнасьці (у крайнім выпадку лічыш сябе праваслаўным атэістам), альбо ты — вораг народу.

### Тое, аб чым хацелі сказаць, але саромеліся

Шаноўны прафэсар шчыра сказаў тое, што большасьць расейскіх палітыкаў, палітолягаў, журналістаў заўсёды мела на ўвазе, але аб чым саромелася адкрыта казаць. Расея — імпэрская праваслаўная дзяржава, народу якой, маўляў, дэмакратыя не патрэбная і нават шкодная. А патрэбны бізун і царква. Можна падзякаваць прафэсару за такую шчырасьць. Аднак, напэўна, ён вельмі зьдзівіўся б, калі б яму сказалі, што акрамя расейскага існуе беларускі народ, у якога ёсьць свая ўласная гісторыя й свой погляд на яе. Што беларускія гісторыкі не атаясамліваюць гісторыю Беларусі з гісторыяй Расеі і ня лічаць, што Беларусі наканавана быць у складзе «адзінай і непадзельнай» імпэрыі.

Удзельнікі перадачы дружна сышліся на тым, што падзеі 1991 г. неяк ня ўпісваюцца ў слаўную гісторыю вялікай расейскай дзяржавы. Адсюль выводзілася думка, што менавіта дэмакратычныя рынкавыя рэформы, перанятыя на Захадзе, сталі згубнымі для імпэрыі. Магчыма, гэта так і ёсьць. Але ж не даводзіцца спрачацца і з тым, што распад СССР, які стаў магчымы ў выніку дэмакратычных пераўтварэньняў, даў Беларусі шанец зрабіцца незалежнай дзяржавай, што перад ёй зьявілася альтэрнатыва: заставацца ў імпэрыі ці знайсьці свой шлях у гісторыі.

Няўжо ў каго-небудзь з сучасных беларускіх дзяржаўных ідэолягаў ёсьць сумненьні ў тым, што згортваньне дэмакратыі ў Расеі, вяртаньне яе на шлях праваслаўнае імпэрскасьці — непасрэдная і рэальная пагроза для Беларусі? Няўжо застаўся хоць адзін сур'ёзны палітоляг ці палітык, здольны паверыць, быццам менавіта з Расеі прыйдуць да беларусаў парлямэнцкая дэмакратыя, свабода слова й веравызнаньня? Расейскія палітолягі й гісторыкі самі даўно ў гэта ня вераць. А ў Беларусі — усё яшчэ вераць?!

### Бязьядзерны шантаж

Як бы ні ставіўся кіраўнік Расеі да кіраўніка Беларусі, ён усё адно будзе бачыць Беларусь усяго толькі васальнай тэрыторыяй. Так яго вучылі ў школе. У Асманскай імпэрыі некалі быў такі звычай. Доўгія гады першы візыр служыў у літаральным сэнсе слова падстаўкаю для ног султана, калі той сядзеў на троне. Але прыходзіў тэрмін, візыр рабіўся султанам, і тады ўжо наставала чарга былога султана служыць падстаўкаю для ног уладара.

Народ, вядома, захоўвае маўчаньне. У гэтым палягае сэнс расейскае гісторыі — у тым выглядзе, як яе падаюць расейскія гісторыкі ва ўнівэрсытэтах і ў самых інтэлектуальных расейскіх тэлепраграмах. З гледзішча такой гістарычнай навукі, Захад — носьбіт вірусу разбурэньня мітычных духоўных якасьцяў ды сабornасьці, а дэмакратыя — смута, зачыншчыкаў якой трэба саджаць на кол.

Таму спадзявацца, што Расея зь нейкай фантастычнай прычыны

> Для мяне й майго пакаленьня надышоў час выпрабаваньня. Гэта выпрабаваньне на ўласную сапраўднасьць. Мана, фальш, няшчырасьць, дэмагогія — усё вярнулася нібы ў пакараньне за наш канфармізм.

падтрымае раптам на якіх хочаш выбарах у Беларусі дэмакратычную апазыцыю, — значыць страціць пачуцьцё рэальнасьці. Папершае, перамога дэмакратыі на ўсё яшчэ палітычна залежнай ад Крамля Беларусі азначала б для яго самае страшнае — перамогу нацыянальна-вызвалены руху на апошняй саюзнай тэрыторыі, крах дэспатыі. Што, як мы высьветлілі, і ёсьць квінтэсэнцыяй праваслаўнай цывілізацыі.

Зь іншага боку, баяцца сёньня ЗША і NATO, баяцца паўтарыць лёс Іраку ці былой Югаславіі — значыць заставацца на ўзбочыне эўрапейскай гісторыі. Стаць клясычнай тыраніяй усходняга кшталту у Беларусі наўрад ці ўжо атрымаецца. Стаць Паўночнай Карэяй у цэнтры Эўропы — таксама. У Беларусі няма ядзернай зброі.

Замест зброі масавага зьнішчэньня можна, праўда, пагражаць суседзям наркатрафікам, патокамі нелегальнай міграцыі, распаўсюджваньнем СНІДу й птушынага грыпу. Гэтак некалі ў сярэднявечны некаторыя бадзягі зараблялі на жыцьцё, пагражаючы сустрэчным на дарозе тым, што дакрануцца да іх сваімі язвамі ад праказы (часам фальшывымі), або якой іншай хваробай. Маўляў, плаці грошы, а то заражу! Што і казаць, шантаж — годны занятак для эўрапейскай дзяржавы на пачатку трэцяга тысячагодзьдзя.

### Вынас муміі

Ну і, нарэшце, наконт цывілізацыі. Наконт саматоеснасьці нацыі, мовы, індывідуальнасьці чалавека. Нам ужо шмат гадоў даводзяць, што ўсяму гэтаму пагражае Захад. Ён, Захад, ёсьць пагрозай цывілізацыі. Якой цывілізацыі? Савецкай, якая адыходзіць у нябыт? Праваслаўнай? Мусульманскай? Можа, старажытнаэгіпецкай? Адну мумію, дарэчы, так і пакінулі ляжаць на Краснай плошчы ў праваслаўнай сталіцы. Кажуць, што вынас муміі з маўзалею абразіў бы пачуцьці мільёнаў людзей, якія служылі ідэалам камунізму. Іншымі словамі — гэта абразіла б, сярод іншых, былых ахоўнікаў сталінскага ГУЛАГу, чэкістаў і сексотаў, судзьдзяў і пракурораў, якія выносілі прысуды. Хіба можна чапаць такіх людзей у краіне, якая ганарыцца сваім імпэрскім мінулым?

На пачатку новага тысячагодзьдзя група брытанскіх лінгвістаў правяла кампутарнае дасьледаваньне самых розных тэкстаў — ад старажытных летапісаў да сучасных песьняў і рэклямных брашур з мэтай высьветліць, якое слова можна лічыць найбольш папулярным і характэрным для апошняга тысячагодзьдзя, стагодзьдзя, дзесяцігодзьдзя. Словам другога тысячагодзьдзя ў ангельскай мове было прызнана слова «she» — яна. Бо да гэтага ангельцы абыходзіліся ў размове без жаночага роду. Словам ХХ ст. прызнана слова «jazz». І словам дзевяностых стала слова «web», што супала з глябальным пашырэньнем Інтэрнэту.

Калі б дасьледаваньне адносна папулярнасьці таго ці іншага слова, запазычанага з ангельскай мовы, праводзілася ў краінах СНД, то слова «джаз» было б апярэджана іншым словам — «рок».

За савецкім часам джаз і рок не ўдалося выгруціць з жыцьця ніякімі сродкамі. Рок-музыку дазвалялі слухаць толькі ў абмежаванай колькасьці, пад наглядам цэнзараў і штатных ідэолягаў. Даводзілі, што рок разбурае слых, здароўе, жыцьцё. Рок, як выявілася, сапраўды меў разбуральную сілу. Ён разбурыў стэрэатыпы й бар'еры паміж людзьмі розных сацыяльных, расавых і рэлігійных груп, фальшывыя каштоўнасьці й крывадушнасьць грамадзтва спажываньня. Ён разьняволіў мільёны людзей. Насуперак марксісцкай максыме аб тым, што свабода — гэта ўсьвядомленая неабходнасьць, рок-музыкі давodзілі сваёй творчасьцю, што свабода — гэта калі чалавек адчувае сябе вольным і нічога не навязвае астатнім.

Рок утварыў рэвалюцыю ў розумах і ў Амэрыцы, і ў Брытаніі, і ў Чэхаславакіі, і ў Польшчы. У ЧССР гурт «Плястык піпл оф зэ юнівэрз», музыкі якога адседзелі некалькі год у турме за «падрыў сацыялістычнага ладу», зрабіўся культавым. Варта згадаць, што Карэл Глаўса і ягоныя сябры сьпявалі па-чэску. Таксама як у Польшчы па-польску сьпявалі «Чэрвонэ гітары», «Скальды», Чэслаў Немэн. Усе гэтыя прыклады, як і прыклад нямецкага «Рамштайну», абвяргаюць міт пра тое, што фэномэн року быў і ёсьць выключна ангельскім ці амэрыканскім. Рок належаў і належыць усім свабодным людзям.

### Разам нас багата

Зразумела, я далёкі ад таго, каб назваць рок-музыку галоўным дасягненьнем цывілізацыі ХХ ст. Але калі мне прапануюць выбар — лічыць галоўнай падзеяй мінулага стагодзьдзя сусьветныя войны, крэматорый, атамную бомбу, кампутар ці нешта падобнае, я выберу… «Бітлз». Ну і яшчэ «Пінк флойд», «Дып пэрпл», «Лэд зэпэлін». І «Краму» з «N.R.M.». І «Нэйра Дзюбэль». І яшчэ гурт з Гомелю «Годз таўэр», які шмат гадоў грае гатычны рок, сьпявае па-ангельску й мае прыхільнікаў у Шатляндыі. Кожны сам можа прапанаваць свой сьпіс гуртоў розных кірункаў — ад гардроку да рэгі й рэпу.

Для мяне і майго пакаленьня рок асацыюецца з падзеньнем Бэрлінскага муру й вызваленьнем ад таго кашмару, які панаваў над сьветам і называўся «процістаяньнем дзьвюх грамадзкіх сыстэм». Калі я гавару пра маё пакаленьне, то маю на ўвазе, зразумела, ня ўзрост. Я маю на ўвазе тых, хто слухае рок. Ня так ужо й важна, на якой мове. Рок — гэта таксама мова.

Але нездарма кажуць, што «пасьля трыццаці з музыкай нешта адбываецца». Яна ўжо не прыносіць былога задавальненьня. Для мяне й майго пакаленьня, якому выпала жыць у Беларусі ў другой палове ХХ ст. ва ўмовах «стабільнасьці», надышоў час выпрабаваньня. Выпрабаваньне тычыцца ня музыкі, бо ўсё напісанае, акрамя папсы, застаецца. Гэта выпрабаваньне на ўласную сапраўднасьць. Мана, фальш, няшчырасьць, дэмагогія, ілжывы патас — тое, што выклікала наша непрыманьне, супраць, ярасьць, — усё гэта вяртаецца цяпер нібы ў насьмешку, нібы ў пакараньне за наш канфармізм, лянoту й разбэрсанасьць. Не, мы не зрабілі ўсяго, што маглі. Не зрабілі нават і сотай долі. Бо заўсёды лічылі палітыку бруднай справай, якой не павінны займацца нармальныя людзі. Мабыць, так і ёсьць. Пакінем палітыку палітыкам. Але аднойчы нават палітыкі становяцца чымсьці большым, чым звычайна, — напрыклад, калі яны выходзяць на Майдан Незалежнасьці разам з тысячамі простых людзей і над Майданам гучыць: «Разам нас багата — нас не падалаты!..»

«Фронт, фронт, фронт!» — гучалі некалі рэфрэнам на мітынгах словы Сержука Сокалава-Воюша, якія ён сьпяваў пад гітару. Так хочацца зноў некалі ўбачыць дзе-небудзь на вуліцы Менску ці Горадні ягоную нязьменную бел-чырвона-белую стужку на галаве. Па гэтай стужцы заўсёды можна было яго пазнаць яшчэ здалёк. Сяржук некалі прызнаўся ў гутарцы, што ня любіць і не разумее рок-музыкі. Падобна да малераўскага пэрсанажа, які ня ведаў, што ўсё жыцьцё гаворыць прозай, паэт і не здагадваўся, што ягоныя песьні маюць дачыненьне да року — калі не паводле формы, дык паводле зьместу.

Сілу можна зламіць сілай. Але тады на зьмену тырану прыходзяць іншыя тыраны. Сілу інэрцыі й агульнай паныласьці, якая ёсьць апірышчам дыктатуры, можна зламіць толькі іроніяй, разьняволенасьцю ды адчуваньнем унутранай свабоды.

Можа быць, для пачатку прыдасца «Што мне рабіць»?

# Подзьвіг Леаніда Маракова

Выйшла другая кніга трэцяга тому «Індэксу ахвяраў тэрору». Рэцэнзуе **Анатоль Сідарэвіч**.

Калі паставіць усе чатыры кнігі Леаніда Маракова побач — відаць, як аўтар паглыбляўся ў тэму, як нарастаў аб'ём матэрыялу, і першапачаткова запланаваныя тры тамы сталі чатырма ёмістымі кнігамі, хоць і выдадзеныя мізэрным накладам у 50 асобнікаў. Калі ў першых двух тамах выкарыстаныя пераважна энцыкляпэдыі, у трэцім томе аўтар выкарыстаў 52 крыніцы — матэрыялы Нацыянальнага архіву, кнігі і даведнікі, што выйшлі ў Беларусі і Расеі. Падаюцца нават нумары спраў, якія захоўваюцца ў КДБ. У другой кнізе III тому аўтар удакладніў зьвесткі пра людзей, чые біяграмы зьмешчаныя ў I і II тамах.

У «Імянным паказьніку» пазначаецца, што Л.Маракоў сабраў матэрыялы пра 2731 чалавека. Але аўтар не ўпісаў туды яшчэ імёны 97 чалавек, зьвесткі пра якіх «падвярстаныя» да асноўных біяграм. Часцей за ўсё Л.Маракоў падаваў зьвесткі пра арыштаваных і высланых бальшавікамі «членаў сем'яў здраднікаў Радзімы». Гэта жонка і дачка З.Жылуновіча, два сыны У.Ігнатоўскага, сястра А.Салагуба, бацька, дзядзька, родны і стрыечны браты М.Улашчыка, гэта жонкі паэта І.Харыка ды наркамаў М.Галадзеда і А.Хацкевіча, браты (адзін рабочы, другі селянін) малапісьменнага акадэміка Антона Платуна, які на пачатку 1929 г. заклікаў стасаваць да інтэлігенцыі «хірургію»... Іх імёны ў паказьніку ня значацца. Мусіць, з тае прычыны, што ўсе яны не былі літаратарамі ды навукоўцамі. На маю думку, гэта памылка.

Нельга абысьці і галоўную памылку. Кніга мае ў загалоўку слова «рэпрэсаваныя». Але трэба адрозьніваць рэпрэсаваных і ахвяраў тэрору. Аляксандар Прушынскі (Алесь Гарун), які друкаваў за царом улёткі з заклікам да гвалтоўнага зьвяржэньня дзяржаўнага ладу, быў рэпрэсаваны: г.зн. дзяржава ўжыла прадугледжаную законам санкцыю ў дачыненьні да таго, хто гэты закон парушаў сам і заклікаў іншых рабіць тое ж. Інакш кажучы, А.Прушынскі чыніў прэсію на ўрад ды іншыя органы ўлады Расеі — яны ўжылі да яго рэпрэсію (стрымалі яго ў дзеяньнях). Большасьць пакараных сьмерцю, сасланых і высланых за царскім часам — *рэпрэсаваныя*.

Іншая рэч савецкі час. Напрыклад, паэт Валеры Маракоў супроць савецкага ўраду не выступаў, але яго запалохвалі (тэрарызавалі) задоўга да ягонае сьмерці за яго лірычныя вершы, пазбаўленыя палітычнага зьместу. Яго «прабіралі» ў друку і на сходах, не даючы яму і ягоным прыхільнікам выступіць са словам у адказ. Маральна-псыхалягічны тэрор узмацняўся тым, што ў краіне была створана атмасфэра жаху — адбываліся беспадстаўныя арышты соцень людзей, у тым ліку калег В.Маракова. Мераю запалохваньня быў таксама трохмесячны арышт. Урэшце паэт — які не належаў да нелегальные арганізацыі, ня вёў высупраць антыдзяржаўнай прапаганды, ня клеіў антысавецкіх улётак — быў арыштаваны другі раз і пасьля катаваньняў расстраляны на падставе неправамернага прысуду, што прызнана судовай інстанцыяй тае самае дзяржавы, якая асудзіла яго на сьмерць.

Гэтых прыкладаў дастаткова, каб паказаць адрозьненьне паміж *рэпрэсаваным* і ахвяраю дзяржаўнага тэрору, *тэрарызаваным*.

Дарэчы, слова «рэпрэсаваны» ў артыкуле пра В.Маракова ў «Беларускай энцыкляпэдыі» зьяўляецца палітычным эўфэмізмам слоў «ахвяра дзяржаўнага тэрору». Эўфэмізмамі зьяўляюцца і такія вынаходкі, як «беспадстаўныя рэпрэсіі» ды «незаконныя рэпрэсіі», што скрозь трапляюцца ў літаратуры.

Леанід Маракоў дарэмна спалучыў рэпрэсіі царскага часу з бальшавіцкім тэрорам: розныя рэжымы ды судовыя сыстэмы. Тое ж можна сказаць і пра спробу спалучэньня ў адной працы тэрору савецкага і польскага. Палітыка тэрору ў Заходняй Беларусі вымагае адмысловага дасьледаваньня, але трэба агаварыцца: дзейнасьць беларускіх антыдзяржаўных арганізацый, у тым ліку КПЗБ, мае маральнае і палітычнае апраўданьне, бо Польшча была дзяржаваю-акупантам, якая парушыла практычна ўсе абавязацельствы, узятыя ёю паводле або Вэрсальскага і Рыскага трактатаў у дачыненьні да нацыянальных меншасьцяў.

Арыгінальнасьці працы Л.Маракова надае матэрыял, што тычыць савецкага пэрыяду. На падставе даступных крыніц аўтар паказвае дынаміку бальшавіцкага тэрору 1917—1955 г. у СССР, ілюструючы яго графікамі. Аўтар вылучае пяць хваляў лютага тэрору ў Беларусі (1929—1930, 1932—1933, 1937—1938, 1939—1940 і 1944—1945). Шкада, што ён ня выкарыстаў украінскіх дасьледаваньняў, бо не пісаў бы, што другая, чацьвёртая і пятая хвалі — «чыста беларуская зьява»: нешта падобнае адбывалася і ў паўднёвых суседзяў. Але аўтар мае рацыю, калі зазначае, што гэтых хваляў ня зьведала Расея. Адметна, што ў пэрыяд нэпу і «беларусізацыі» (1923—1929) у БССР — а гэта трохі больш за палову цяперашняй Беларусі — «арыштоўвалася прыблізна столькі ж — а то і больш — людзей, чым у бязьмежнай Расеі», што жыхар БССР «меў шанц быць рэпрэсаваным у 20 разоў больш, чым жыхар Расеі». Калі б дадаць да гэтага ўкраінскія лічбы, дык высьветлілася б імпэрская сутнасьць бальшавіцкага рэжыму, які праводзіў палітыку здушэньня беларусаў і ўкраінцаў больш жорсткімі мэтадамі, чым царызам.

Даючы зьвесткі пра нацыянальную прыналежнасьць ахвяр тэрору, Л.Маракоў не паказвае, што да палякаў адносілі і частку беларусаў-каталікоў. Таму пададзеная лічба (64% ахвяр тэрору ў БССР — беларусы), на маю думку, заніжаная. Адпаведна перабольшаны адсотак палякаў (23%), хоць яны знаходзіліся пад асаблівай апекаю «органаў», а абвінавачаньне ў шпіянажы на карысьць Польшчы было тады банальнаю зьяваю. Як і ў Польшчы — абвінавачаньне беларусаў у дзейнасьці на карысьць СССР. Дарэчы, пра заходніх беларусаў. На жаль, у гэтай працы ня выведзена статыстыка тэрору ў рэгіёнах Беларусі, але можна сказаць, што немалую лічбу сярод яго ахвяр у 1921—1939 г., асабліва ў 1932—1938 г., склалі выхадцы з Заходняй Беларусі. І гаворка ня толькі пра людзей накшталт Ігната Дварчаніна ці Сымона Рак-Міхайлоўскага.

Мяне даўно цікавіў лёс вучня Віленскае беларускае гімназіі Кузьмы Янэля. У сярэдзіне жніўня 1924 г. гімназісты Янэль і Л.Бабровіч (у даведніку маецца артыкул пра Лявона Бабровіча) без тлумачэньняў былі схопленыя паліцыяй і жорстка зьбітыя. У выніку катаваньняў Янэль аглух на левае вуха. Так паведамляла «Сялянская праўда» 12 кастрычніка 1924 г. У траўні 1925 г. Антон Луцкевіч цытаваў у «Беларускай долі» прамову Янэля на пахаваньні Аляксандра Загорскага — вучня Польскае гімназіі імя Лялевеля, забітага падчас трагічных падзей у гэтай установе. Польскія шавіністы не далі Янэлю скончыць прамовы...

Сьлед гэтага чалавека я знайшоў у газэце «Зьвязда» за 28 лістапада 1930 г., дзе ён апублікаваў артыкул «Супроць нацыянал-дэмакратычнай ідэалёгіі ў пытаньнях дзяржавы». У артыкуле выхаванец ВБГ граміў Рыгора Парэчына (яго біяграма ў даведніку маецца) за артыкул «Ідэі беларускай дзяржаўнасьці перад утварэньнем Савецкай Беларусі». І вось цяпер з працы Л.Маракова я ведаю: К.Янэля былыя таварышы па партыі расстралялі ў траўні 1934 г. — на некалькі дзён пазьней за А.Салагуба, выхаванца ВБГ.

Невядомы застаецца лёс гімназіста Юркі Тарасюка, завадатара сылнната страйку ў ВБГ у лютым 1929 г. Забастоўшчыкаў падбухторвалі камуністы, абяцаючы ім працяг вучобы ў БССР. І Тарасюк апынуўся ў Саўдэпіі. 18 сакавіка 1933 г. ён надрукаваў у «Зьвязьдзе» артыкул «У абручох крывавых фашысцкіх дэкрэтаў». Ці не напаткаў яго лёс К.Янэля і А.Салагуба?

Асобная гісторыя людзей зь вёскі Старыцы (сёньня ў Капыльскім раёне), якая дала цэлую групу пэдагогаў: Аляксандра Аніхоўскага, Адама Міхайлавага Бабарэку, Пятра Бабарэку, Сымона Кандыбовіча, Алеся Каўпака, Мікалая Мамчыца. Зь імі таварышаваў Іван (Янка) Зянюк з суседніх Русакоў. Усе яны сталі актыўнымі дзеячамі беларускага руху, потым — фігурантамі розных «спраў»... І калі пра Аніхоўскага, П.Бабарэку, Кандыбовіча, Мамчыца артыкулы ў даведніку маюцца, то пра астатніх мы ведаем штo-колечы з кнігі «Слуцкі збройны чын...» і скупых успамінаў Мікалая Ўлашчыка ды Антона Адамовіча.

Ва ўспамінах М.Улашчыка, Ант.Адамовіча ды Яўхіма і Вітаўта Кіпеляў сустракаем цэлы шэраг імёнаў, што праходзілі па справе «Саюзу вызваленьня Беларусі». Біяграмы Адама Міцкевіча, Канстанціна Ламакі, Ігната Савіча ды Івана Юрашкевіча дзякуючы Л.Маракову мы ведаем, але Альбіцкі з Наркамзему, Юзік Бараноўскі, Валерак Валога, Алесь Дарашэвіч, Зьміцер Дунько, Уладзімер Зянькові, Кацарыніч, Корань, Маркевіч, Мурашка, Салянковіч, Я.Сасіновіч (быў пры У.Жылку да апошняе хвіліны, захаваў і прывёз Я.Кіпелю ягоны «Тэстамэнт»), Кандрат Сяледчык і П.Тарайновіч застаюцца людзьмі амаль невядомымі...

Чытаючы ў Л.Маракова пра Рыгора Бярозкіна, не магу не падказаць яму імя паэта Кастуся Шавеля — крытык зь ім сябраваў. Вывучаючы спадчыну А.Луцкевіча, я б хацеў пачытаць біяграмы А.Цукермана, які на пачатку 1929 г. увёў тэрмін «беларускі нацыянал-фашызм», былога сіяніста-сацыяліста Мар'ясіна і яго таварышаў Ерухімовіча ды Шапіры, якія ў верасьні 1929 г. на сходзе менскага гарадзкога партактыву так грамілі «нацдэмаў», што Луцкевіч адзначаў іх прамовы ў Вільні. Ці біяграму дацэнта БДУ Славіна, які ў маскоўскім друку нападаў на кадравую палітыку ў БССР, а разам з экс-«абласьнікам» дацэнтам Гольманам атакаваў рэктара БДУ У.Пічэту. Я ўпэўнены, што іх жыцьцёвы шлях абарваўся ў 1930-х.

Але гэта пажаданьні, а не прэтэнзіі да аўтара даведніка. Прэтэнзіі можна было б прад'яўляць, калі б у сп.Маракова быў штат супрацоўнікаў, як у якім акадэмічным інстытуце ці дзяржвыдавецтве. У нэабальшавіцкай Беларусі няма ўстановы кшталту польскага Інстытуту нацыянальнае памяці, і яго функцыі пераймаюць прыватныя асобы, якія ўскладаюць на сябе абавязкі і шукальнікаў інфармацыі, і аўтараў, і рэдактараў, і наборшчыкаў... І таму іх можна назваць падзьвіжнікамі, а іхнюю патрэбную нацыі працу — подзьвігам.


ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**Леанід Маракоў працуе за цэлы Інтстытут нацыянальнае памяці.**




**Леанід Маракоў.**

**Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асьветы, грамадзкія і культурныя дзеячы Беларусі: 1794–1991:** Энцыкляпэдычны даведнік: У 3 т. — Менск, 2002—2005.

# Шанавальнік памяці

Антону Луцкевічу давялося быць ня толькі інсьпіратарам, але й гісторыкам беларускага руху. Аўтар шматлікіх тэкстаў, ён працаваў і ў такім спэцыфічным жанры, як нэкралёг. Іншы раз ягоныя нэкралёгі зьяўляюцца, бадай, адзінымі крыніцамі ведаў пра тых ці іншых людзей. Так я высьвятляў факты з жыцьця актывіста Беларускае сацыялістычнае грамады пецярбурскага работніка Вінцука Тубіса, сябра Віленскае Беларускае рады селяніна Казімера Фалькевіча, праваслаўных сьвятароў Міхала Галянкевіча і Міхала Пліса... У левых заходнебеларускіх газэтах А.Луцкевіч быў ці не адзіным рэдактарам і аўтарам, які памятаў пра «круглыя» даты і Купалы, і Коласа, жалобныя даты Багдановіча і Цёткі... Яго можна было б назваць шанавальнікам добрае памяці пра тых, хто адышоў. У гэтым кантэксьце ўспрымаюцца і ягоныя нататкі з прычыны Дзядоў. Пісаныя ў розны час, гэтыя тэксты, асабліва другі, думаю, будуць цікавыя і нашым сучасьнікам. Ня ведаю, хто прыйдзе на Дзяды да сымбалічнае магілы братоў Луцкевічаў на Росе. Ведаю, што паводле правілаў магіла ня можа лічыцца нават сымбалічнаю, пакуль зь месца пахаваньня чалавека не прывезьлі хоць жменю зямлі. Хто прывязе зямлю з далёкага Аткарску і такім чынам ўшануе памяць чалавека, які ўшаноўваў памяць іншых? **Анатоль Сідарэвіч.**

**АНТОН ЛУЦКЕВІЧ**

## На Дзяды

Восень — журлівая пара заміраньня ўсіх благіх і добрых пажаданьняў.

Пара, калі заміраючая прырода выяўляе так магутна сваю ўладу над душой свайго кволага сына — чалавека.

Замірае прырода, — і на пустых палёх лунае адно сум бязьмежны і журба. І ў тон ім зьвіняць струны душы чалавечай.

Зацíхлі яркія, поўныя сонечнага бляску і сілы жывільныя песьні жняі. Над зжатай нівай плывуць такія знаёмыя, такія страшэнна жаласьлівыя і хапаючыя за сэрца тоны і словы восеньскіх песень…

І якімі ж далёкімі і чужымі становяцца тады ўсе нашы будныя справы!

У такія хвіліны душа шукае супачынку ад гора і бед жыцьцёвых у засьветных прасторах бяз конца, а слухмяная думка творыць другі сьвет — на той бок сьмерці, насяляючы яго другімі, бесьцялеснымі істотамі.

Там, у тым іншым сьвеце, жывуць душы нашых продкаў, нашых «дзядоў». Да іх у дні восеньскіх настрояў, у дні адмогі духовае і тугі зварочваюцца мысьлі народу. У лучнасьці, у яднаньні зь імі знаходзіць душа супакой.

Вось чаму ўвосені народ наш спраўляе і сьвята «Дзядоў»: стомлены цяжкой працай за лета, захоплены сумам заміраючага жыцьця палёў, ён чарпае новую сілу, новую моц душы ў глыбокай веры ў несьмяротнасьць істоты чалавека, у веры ў жыцьцё за гробам і ў неразрыўнасьць духовае сувязі з нашымі нябожчыкамі.

Заўтра — дзень «Дзядоў». Заўтра ўвечары ў сялянскай хаце пры сьвятле лучніка, сярод паважнага, урачыстага настрою сабранае сямейкі, гаспадар падніме першую чарку гарэліцы і будзе кропля па кроплі ліць яе на зямлю, памінаючы імёны сваіх «дзядоў». Адвечная ахвяра памершым! А пасьля па лыжачцы кожнае стравы паложаць у міску і за вокны нанач паставяць — для душачак родных, што роем над хатай зьлятуцца…

Памянём жа і мы нашых родных, дарагіх «дзядоў» духовых — сябраў тае сямейкі ідэалістаў, што ў безупыннай рупнай працы для Бацькаўшчыны, для вялікае ідэі адраджэньня свайго народу кропля па кроплі пралілі сваю кроў сардэчную і без пары палеглі ў магілы! Пабудзьма зь імі гэтыя сьвяты вечар думкамі нашымі і ў чыстасьці і сьвятасьці родных нам душ пачарпайма сілу і гарт дзеля далейшае службы сьвятой і вялікай справе беларускай.

*Друкуецца паводле: Наша Ніва. 1920. 1 лістапада — дзе апублікавана ўпершыню пад псэўданімам Ант.Навіна*



ВАСІЛЬ ЯВІД

## У дзень памершых

2-га лістапада — паводле адвечнай традыцыі — Вільня ўрачыста спраўляла Дзень Задушны.

Мо навет залішне ўрачыста — урачыста «па-казённаму», залішне афіцыяльна: паходы нялічаных дэлегацыяў з аркестрамі і сьцягамі на могілкі — зусім такія ж, як і тыя, што ў нейкія афіцыяльныя «сьвяты» адбываюцца на Лукіскім пляцу з тымі ж аркестрамі, з тымі ж сьцягамі, а тым жа натоўпам «цікавых». Холадам веець ад усяго гэтага, — нечым штучным, робленым…

Гледзячы на той «кірмаш», які адбываецца ў Задушны Дзень на віленскай Росе, мімаволі зварачаесься думкай у даўныя, даваенныя часы. Вялікай павагай адзначалася тады адведваньне могілак у гэты дзень. Для моладзі гэта быў дзень асабліва памятны: нягледзячы на забарону царскае ўлады, нягледзячы на паліцэйскія кардоны, моладзь ішла на магілы сваіх ідэйных павадыроў і там, слухаючы прамоваў аб даўно зышоўшых у магілы ідэйных барацьбітах, сама глыбака захаплівалася ідэяй ахвярнае грамадзкае працы, ідэяй служэньня свайму народу. І з маладых грудзей вырываліся словы песьняў, словы гарачага пратэсту процi чужацкага панаваньня…

Цяпер Дзень Задушны — гэта дэманстраваньне вызваленьня польскага народу, адбудовы Польскае дзяржавы. Зьмяніліся настроі, зьмяніўся і характар сьвяткаваньня.

***

Стары настрой у гэты Дзень Памершых бачым над магіламі беларускіх дзеячоў, пахаваных на магільніку Роса. Бо толькі для нас словы й думкі памершых павадыроў нашых маюць усьцяж значэньне запавету ясьнейшае *будучыні,* за якую трэ яшчэ доўга і ахвярна змагацца. Мы ўсьцяж яшчэ, думаючы аб мінулым, мусім з сумам сьцьвярджаць, што сучаснасьць нашая — шэрая, бязрадасная, што толькі недзе «далёка ўперадзе агні»… Вось чаму зь іншым настроем прыходзяць на Росу беларусы, чым іх суграмадзяне палякі; вось чаму нам балюча б'ець у гэты дзень па нэрвах той «кірмаш», які адбываецца на Росе…

Ня дух трыюмфу, а дух жалобы лунае над беларускімі магіламі і так добра тануецца з шэрым асеньнім днём, з тымі чорнымі, блізу зусім ужо аголенымі галінамі дрэў, што сумныя песьні шумам сваім напяваюць Памершым.

Ня шмат нашых магілаў на Росе. Ядвігін Ш., К.Сваяк — гэтыя імёны абмежываюць лік нашых тварцоў красы ў слове, злажыўшых свае косьці ў зямлі адвечнае сталіцы Краю. І калі да іх мы ў Дзень Памершых маем можнасьць прыйсьці і думкамі нашымі зь імі зьліцца ў вадно, — дык тым болей трэба ўспамянуць аб тых Сьветлых Ценях, што пааміралі далёка ад нас, — сярод чужых людзей, на чужой зямлі.

У Татрах — у Закапаным — памёр Бацька Беларускага Адраджэньня Іван Луцкевіч. Там скромны драўляны крыж адзначае магілу Таго, хто ўсё жыцьцё сваё аддаў на служэньне Беларускаму Народу, хто так поўна, да канца згарэў за Беларускую Ідэю.

У сталіцы СССР — Маскве — ляжаць косьці аднаго э найбліжэйшых таварышоў-супрацоўнікаў Ів.Луцкевіча — Аляксандра Бурбіса (быў пахаваны ў Менску, на Старажоўскіх могілках. — **А.С.**). І той усё жыцьцё аддаў Беларускай Справе, і той, як першы, памер на сваім становішчы…

У Ялце — на Крыме — пахаваны Максім Багдановіч, слаўны Пясьняр Чыстае Красы, які творчасьцяй сваей узбагачваў душу Народу, расчыняў яму вочы на вялікую сілу Хараства.

Недзе каля Лодзі ляжаць косьці Алеся Гаруна (пахаваны ў Кракаве. — **А.С.**), сасланага царскім урадам на вечнае жыцьцё ў далёкую Сібір, дзе й загубіў свае сілы маладыя, ня маючы магчымасьці служыць імі свайму Народу. Толькі к канцу жыцьця вярнуўся на Бацькаўшчыну, скуль ізноў ліхая доля яго выгнала на чужыну…

Яны далёка ад нас, і ніхто ня прыйдзе на іхнія магілы ў Дзень Памерлых, ніхто не пакладзе вязанкі красак, ніхто не запаліць сьвечкі. Дык няхай жа ў памяць аб іх загарыцца ў сэрцах нашых полымя такое ж вялікае любові да Бацькаўшчыны і свайго Народу, якое гарэла ў сэрцах дарагіх нам Нябожчыкаў, няхай наша праца для сьвятое ідэі, якой служылі яны, аб'яднае нас зь імі!

Вера ў магчымасьць павароту душ памершых да жывых, якая ў Дзень Задушны так ярка выяўляецца ў другіх грамадзянствах, мусіць быць асабліва крэпкая ў нас, у беларусаў: бо ж чатыры разы ў год спраўляюцца ў нас Дзяды, чатыры разы ў год адбываецца паміналньне блізкіх нам нябожчыкаў. І вось, у сувязі зь сёлетнім Днём Памершых, мы хочам падаць нашаму грамадзянству думку, беспасрэдна вынікаючую з народных адносінаў да сваіх «дзядоў».

Калі тут, у Вільні, дзе ёсьць даволі многа беларускае інтэлігенцыі, магілы беларускіх дзеячоў і барацьбітоў за наш Народ маюць апеку й догляд, дык ні апекі, ні дагляду ня маюць магілы тых, хто пахаваны па-за Вільняй. Запраўды: хто быў калі на магіле Цёткі, хто ведае, дзе магіла Алеся Гаруна, як выглядае месца вечнага супачынку Івана Луцкевіча? Дык вось: неабходна было б наладзіць *грамадскую акцыю дзеля апекі над магіламі памершых павадыроў беларускага адраджэнскага руху,* акцыю адведываньня іх — тут у краі, акцыю прывозу ў родную зямлю костак тых, хто ляжыць і нудзіцца ў чужой зямлі.

Акцыя апекі над магіламі заслужаных беларусаў павінна абняць ня толькі магілы тых, што сталіся агульнанацыянальнымі Сьвятымі. Кожнае места, кожная вёска мае, напэўна, і сваіх мясцовых дзеячоў, заслужыўшых на грамадзкую пашану, і іхнія магілы мусяць стацца ў Дзень Памершых месцам зборак і яднаньня думкамі зь нябожчыкамі.

Ня будзем сяньня разьвіваць падрабязнага праекту арганізацыі такое акцыі; напамінаем толькі нашаму грамадзкаму сумленьню *абавязак жывых* у адносінах *да памершых.*

*Друкуецца паводле: Беларускі звон. 1932. 5 лістапада — дзе апублікавана ўпершыню пад крыптанімам А.Н. Пад тэкстам дата: 2.XI.1932 г.*

**Падрыхтаваў да друку**
**Анатоль Сідарэвіч**

# Дарослая «Калыханка»



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

16 год бяз даху над галавой існуе знакаміты гурт у Міханавічах. Ён сьпявае найстарэйшыя песьні Эўропы. Піша **Тацяна Сьнітко**.

### Выбачэньні рэкеціраў

Неяк на памежжы на аўтобус напалі рэкеціры. Празь некальки сэкундаў яны ўжо прасілі прабачэньня… Рэч у тым, што, агледзеўшыся, малойчыкі ўбачылі амаль адных дзяцей і некалькі старых бабулек, з такіх, што сядзяць на печцы ў вёсачцы з трох хат ды лушчаць семкі. Што там за думкі варухнуліся пад голенымі патыліцамі, да канца няясна, але ж не ўзялі нават семак.

Гэта вярталіся з Кракава ў Міханавічы артысты фальклёрнага гурту «Калыханка». Каб выклікаць добрыя пачуцьці — дастаткова аднаго іхняга выгляду — а што ўжо казаць, калі засьпяваюць?

Многія песьні вы пачуеце ўпершыню, але яны будуць падавацца знаёмымі. Гэта загаворыць ажылымі архетыпамі генэтычная памяць. Нехта згадае, што колькі гадоў таму гурт сьпяваў разам з рок-зоркай Бутусавым, але гэта глядзіцца выпадковасьцю. Вось калі б разам з «Тройцай», было б куды лягічней. У тым ліку і таму, што некаторыя «калыханкаўцы» вучыліся ў Івана Кірчука на факультэце народнай творчасьці ўнівэрсытэту культуры. І «Калыханка» — таксама зорка, нават цэлае сузор'е. Асабліва добра відаць гэта сузор'е зь неба суседзкага замежжа.

У адну толькі Польшчу разоў пяць запрашалі на фэстывалі ды фальклярыстычныя канфэрэнцыі. «Там зьбіраюцца энтузіясты фальклёру — моладзь, студэнты, — распавядае кіраўніца «Калыханкі» Ларыса Рыжкова. — Увечары — канцэрт фальклёрнага калектыву, пасьля рассоўваюць усе дэкарацыі, накрываюць «ручнікі-самабранкі» проста ў полі, на траве, і вакол кожнага «стала» ўтвараецца невялікі фэстываль».

Спадарыня Ларыса і людзі, згуртаваныя вакол яе, — вялікія энтузіясты адраджэньня народнай творчасьці, рэстаўратары беларускай душы. Яны знаходзяць паўзабытыя мэлёдыі, дастаюць іх са скарбонак народнай памяці, удыхаюць новае жыцьцё.

### Зь Ленінграду ў Беларусь

Пачалося ўсё ў 1980-я. Віцяблянка Ларыса Рыжкова, скончыўшы Акадэмію мастацтваў, зьехала вучыцца ў асьпірантуру ў Ленінград. Там дзяўчына зразумела, што аўтэнтычная народная музыка — справа яе жыцьця, пачуўшы ад старых людзей нешта абсалютна незнаёмае. Ларыса стала езьдзіць па вёсках, слухаць старэйшых жыхароў, занатоўваць народныя сьпевы. Яна стварыла сем аўтэнтычных народных творчых калектываў у Кірыскім раёне Ленінградзкай вобласьці, зладзіла Кірыскі фальклёрны фэст, што зь цягам часу стаў традыцыйным. Потым апынулася ў Міханавічах і стала шукаць аднадумцаў тут.

Шаснаццаць гадоў таму яна была маладой маці з гадавалай дачушкай, але гэта зусім не перашкодзіла Ларысе стварыць новы фальклёрны калектыў. Такім чынам, «Калыханка» сёлета дасягнула «пашпартнага» ўзросту.

### Фальклёрны холдынг

Цяпер пад «дахам» вялікага калектыву аб'яднана некалькі гуртоў, у тым ліку і дзіцячы ансамбль «Кумок». За шаснаццаць год зьмянілася пяць пакаленьняў артыстаў-заўзятараў. Сярэдні выканаўца-пачатковец памаладзеў: калі раней прымалі дзетак з 6—7 гадоў, цяпер займаюцца вакалам з трох-чатырохгадовымі. «Самыя вялікія фанаты «Калыханкі» — малеча, — кажа Алена Гадалава, дырэктарка Дому фальклёру ў Міханавічах. — Нават калі няма рэпэтыцыі, яны ўсё роўна бягуць да спадарыні Ларысы».

Музыка стала для дзяцей жыцьцёвым зацікаўленьнем. А тое, наколькі гэтая сьпеўная школа прафэсійная, яскрава ілюструе наступны выпадак. Неяк у Інстытуце культуры студэнты доўга развучвалі народную песьню са складанай мэлёдыяй. А сярод іх былі дзьве дзяўчынкі з «Калыханкі», якія паслухалі і адразу ўсё правільна прасьпявалі, зьдзівіўшы выкладчыкаў.

Вікторыі Бельчанцы, адной з салістак «Калыханкі», заслужаная артыстка Беларусі Ніна Брачкоўская сказала: «У вас ужо ўнікальная пастаноўка голасу, я баюся яе сапсаваць». Вікторыя ніколі не расстаецца зь песьняй. Нават нарадзіўшы дзіця, працягвае сьпяваць у «Калыханцы». Прывяла сюды і пляменьніцу Карыну. Цяпер думае прывесьці і дачку, але няхай тая трохі падрасьце.

### «Здоб шы Здуб» ня першы

Некалі паблізу мястэчка стаяла вайсковая часьць. Ларыса і яе дзяўчаты змаглі зацікавіць вайскоўцаў сваімі ідэямі — тыя ахвотна хадзілі на рэпэтыцыі народных танцаў. Цяпер у канцэртным рэпэртуары мужчыны амаль не прысутнічаюць. Затое стала больш песень. Зь іх робіцца адмысловыя тэматычныя праграмы: то вясельныя народныя творы, то радзінныя, то купальскія — хвілін на сорак.

Адмыслова па гэтыя песьні было зладжана некалькі экспэдыцый у вёскі Салігорскага і Вузьдзенскага раёнаў. Жылі сярод старых людзей, слухалі сьпевы, запісвалі словы, музыку, падпявалі бабулям. Калі потым калектыў чарговы раз запрашалі на фэст у замежжа, Ларыса зь дзяўчатамі ехалі ў вёскі, «здымалі зь печы» сваіх аўтэнтычных артыстак і бралі іх з сабой. Нешта падобнае зрабілі на Эўрабачаньні хлопцы з гурту "Здоб шы здуб».

### Найстарэйшыя песьні Эўропы

«Звычайна моладзь глядзіць на старых як на нешта аджылае, але толькі ня нашая, — дзеліцца назіраньнямі Ларыса. — Нашы дзеці бачаць у гэтых людзях бясцэнны сьвет».

«На вёсцы разбураны лад жыцьця, няма ўжо тых традыцый, — працягвае Ларыса. — Мы ўнікальныя тым, што навучыліся ў старых пераймаць гэтыя традыцыі». Удзельнікі круглага стала па захаваньні культурнай спадчыны пра «Калыханку» так і сказалі: хутка будуць запісваць аўтэнтычны матэрыял у яе.

За гэты час яны двойчы былі ў Кракаве на фэсьце «Страчаныя танцы». Па ўсёй Эўропе жывуць гэткія ж апантаныя заўзятары, якія зьбіраюць і развучваюць забытыя, нават з часоў Сярэднявечча, старажытныя танцы самых розных народаў. Тое самае зь песьнямі. Аднойчы «Калыханка» брала ўдзел у фэстывалі «Найстарэйшыя песьні Эўропы» ў Любліне. Выступалі ў Малдове, Нямеччыне, Расеі, некалькі разоў езьдзілі з канцэртамі па Украіне. «Вас, напэўна, на радзіме проста на руках носяць!» — захапляліся ўкраінцы. Але на радзіме ўсё ня так проста.

### Пажыць у Міханавічы

Ня так даўно ў міханавіцкім Доме фальклёру зьявілася новая дырэктарка — Алена Гадалава. Яна кажа, што пасялілася ў вёсцы выпадкова, але лічыць гэта знакам лёсу. Некалькі гадоў таму дзяўчына вырашыла зьмяніць род дзейнасьці, працавала ў банку, але гэта не прымусіла забыцца на любімую справу. Вярнулася. Пасьля Інстытуту культуры яна пасьпела папрацаваць у вядомай «Гасьцёўні Галубка», потым — прад'юсэрам у тэлепраграме «Абібок», апынулася разам зь сям'ёй у Маскве. Вярнулася на радзіму. Пажыць у Міханавічы запрасілі сябры, потым былы старшыня калгасу дапамог з уласным жытлом, а старшыня сельсавету пазнаёміла Алену з Ларысай Рыжковай. У асобе Алены «Калыханка» займела свайго прад'юсэра.

«Перажываю заўсёды: як дзяўчаты выступяць? Але гэтыя перажываньні дапамагаюць духоўнаму росту, а не псуюць нэрвовую сыстэму», — Алена дапамагае «Калыханцы». Зладзіла рамонт у былым будынку сельсавету, аддадзеным пад Дом фальклёру: знайшла каманду дызайнэраў па інтэр'еры, гатовых дапамагчы артыстам на адным энтузіязьме. Вырашана, што будзе свой музэй ручнікоў. Пакуль няма ўласнага прытулку, з памяшканьнем дапамагае Іна Яворская, маладая дырэктарка міханавіцкага Моладзевага культурнага цэнтру.

«Дзеці бачаць: шаснаццаць гадоў без уласнага даху над галавой — гэта непрэстыжна. Мы павінны надаваць беларускай музыцы прэстыж», — мяркуе Алена.

«Калыханка» стала свайго роду візытоўкай раёну. 14—21 кастрычніка «Калыханка» пабывала ў Сэрбіі разам з дэлегацыяй Менскага райвыканкаму. Пакуль кіраўнікі прадпрыемстваў усталёўвалі бізнэс-кантакты, гурт з посьпехам выступіў на міжнародным фэстывалі. Каб жа яшчэ актывізаваць канцэртавую дзейнасьць па Беларусі...

**АЛЯКСАНДАР АПОН**

# Сыліконавая канава

ДЗЕЮЧЫЯ АСОБЫ

Антон Сяргеевіч — акадэмік.

Сева — малады чалавек, гадоў пад сорак.

Іван Іванавіч — ідэалягічны работнік пры райвэртыкалі, кароценькі з пузанятам.

Цётка Гэля — у бруднай сукенцы і галёшах на босую нагу, вельмі спраўная.

*Пакінуты гаспадарамі сялянскі падворак. З аднаго боку старая ўзьлезлая ў зямлю хата, з другога — зарослы лопухамі, напаўразбураны калодзеж.*

## I

Антон Сяргеевіч і Сева.

Спачатку стаяць каля калодзежу, па калена ў лопухах, потым патроху адыходзяць убок.

Сева. От, Антон Сяргеевіч, што вы галаву сабе дурыце, як прыедуць, то й так прыедуць, а як не, то і так не. Дый дзе там у Амэрыках яны такія лопухі бачылі?!

Антон Сяргеевіч. А што, Сева, маеш рацыю, я ж там быў, дык паверыш, дзе ні хадзіў, ні на адзін не натрапіў!

Сева. Ну, ня дзіва, што не натрапілі, бо не растуць там лопухі, ня могуць дыхаць іхнім гнілым паветрам! І вось жа, Антон Сяргеевіч, ім гэта ўсё ня трэба, усё роўна — вада там ці лопухі, яны ж, акрамя свае навукі, анічога ня бачаць. Пратрэ зранку вочы, кубак кавы перакуліць, акуляры на нос, кампутар да сеткі, і сядзіць так увесь дзень, што за вушы не адцягнеш, а вы самі казалі, тут хораша, дыхаецца лёгка, паветра.

Антон Сяргеевіч. Ну так, Сева, так, гэта вядома, але ўсё роўна, ім жа і спаць на нечым трэба, і вячэраць там калі-нікалі.

Сева. А я ўжо гаварыў — з генэралам. У яго нават у два ярусы ложкі ёсьць, жалезныя, казаў, колькі хочаце, столькі бярыце, і матрацаў, казаў, таксама адваліць з падушкамі. А вячэраць — так кухню зладкуем, цётку тут якую ноймем, нічога, дорага ня возьме, бульбы з буракамі хопіць, хай сячэ сабе ў кацёл.

Антон Сяргеевіч. А жонкі іхнія?

Сева. Ну, таксама была размова, уладкуем і іх, лямпу там дзе-небудзь да слупа засьвецім, і хай скачуць сабе, ногі выкручваюць, во — заадно і лопухі патопчуць; ну, калі-нікалі ў горад вывезем, панчох там адарваць ці што, як грошы на бэнзін знойдзем. Але… *(панізіўшы голас і агледзеўшыся)* я вам па сакрэце, генэрал падказаў, тая яшчэ галава, роту якую ці дзьве салдат сюды кінем. Яны ж, жонкі іхнія, курвы, якіх сьвет ня бачыў, во хай з салдатамі па кустах і качаюцца.

Антон Сяргеевіч. Што ты кажаш! *(Сьмяецца.)* Не, праўда?!

Сева. Так, я правяраў, меў зь сёй-той справу.

Антон Сяргеевіч. Што ж, разумна.

## II

ТыяжіІван Іванавіч.

Іван Іванавіч *(моцна засопшыся)*. Па-па-падлічыў… Да-да-дакладаць?

Антон Сяргеевіч. А, ты, ну давай, дакладай.

Іван Іванавіч. Ёсьць… За-за-раз… Фу… Вось, на руцэ запісаў *(глядзіць на руку)*. Так, дзе яно… ага… усяго з паўсотні.

Антон Сяргеевіч. З паўсотні?

Іван Іванавіч. Так точна, але гэта як не лічыць тых, што за возерам.

Антон Сяргеевіч. За возерам! І колькі за возерам?

Іван Іванавіч. З вуліцу якую, дакладна ня ведаю, не дабег, далёка, быў кінуўся па беразе — дзе там!

Сева. А ты б, Іван Іванавіч, нарасткі — уплаў.


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Іван Іванавіч *(уздыхнуўшы)*. Ня ўмею я, патану, але як трэба… трэба… Я… я…

Антон Сяргеевіч. Не, ня трэба. Так кажаш, з паўсотні?

Іван Іванавіч. Ну, гэта бяз тых, што за возерам, а каля лесу…

Сева. Яшчэ каля лесу?

Іван Іванавіч. …А каля лесу так хмызьняком парасьлі, што, далібог, не пралезьці!

Антон Сяргеевіч. Ну, усё роўна, з паўсотні дык з паўсотні.

Іван Іванавіч. Але ў некаторых яшчэ шавеляцца.

Антон Сяргеевіч. Хто шавеліцца?

Іван Іванавіч. Ну, гэта — дажываюць, але такія старыя, што далей няма куды, ледзь рыпяць, зараз зьедуць.

Антон Сяргеевіч *(не разумеючы)*. Ледзь рыпяць і зараз, кажаш, зьедуць?.. Куды зьедуць? Калі?

Іван Іванавіч. Праз год там ці два, болей ім ня вытрымаць. Я ўзяў тут даведку, дык на тым тыдні аднаго ўжо зьвезьлі і яшчэ чакаюць, за сто год мае.

Антон Сяргеевіч. А, вось што! Гэта добра, што чакаюць. Сева, як ты мяркуеш, хопіць нам з паўсотні гэтай ці не?

Сева. А хто яго ведае, каб гэтых, каго чакаюць, падагнаць, дык, напэўна хапіла б!

Іван Іванавіч. Дык мы, як трэба, падгонім, чаго там чыкацца.

Сева. І як жа ты іх, Іван Іванавіч, падганяць зьбіраесься?

Іван Іванавіч. Ну, ня ведаю — правады з хат паабрываць ці выган абрэзаць, ёсьць рэзэрвы.

Антон Сяргеевіч. Не, нічога покуль не абрываць і ня рэзаць. А ты, Іван Іванавіч, вось што — давай, дуй да школы і зірні там шырыню на даўжыню, пад досьледную вытворчасьць заладкуем, і на пошту кінь вока, усё роўна яна тут не да патрэбы.

Іван Іванавіч. Ага, добра, але ў мяне мэтра няма.

Антон Сяргеевіч. А ты крокамі, нічога. Толькі вось што: ты за двае свае адзін чалавечы крок залічвай.

Сева. І запішы, ня ведаю там дзе.

Іван Іванавіч *(цягне руку)*. Яшчэ месца засталося. Дазвольце ляцець?

Антон Сяргеевіч. Ляці, ляці.

Іван Іванавіч. Ёсьць! *(Ляціць.)*

## III

Антон Сяргеевіч і Сева.

Антон Сяргеевіч. Вось так, Сева, такую справу пачынаем, што нават страх бярэ! Ну, а ты ня хочаш у навуку кінуцца, я б і сам, але стары ўжо, браце, а ў цябе ўсё наперадзе, глядзіш, і Нобэлеўскую адарвеш.

Сева *(зьдзіўлена)*. Што вы, Антон Сяргеевіч, які зь мяне навуковец, хіба я гэтаму вучыўся!

Антон Сяргеевіч *(усьміхаючыся)*. Ведаю, Сева, ведаю — як успомню, як ты на трэцім курсе адну траціну зь дзьвюма злажваў…

Сева. Бо не мая гэта справа — нешта там злажваць. Во, сюды іх уладкуем і няхай… а я ўжо прасачу, калі-некалі пад'еду, каб як мае быць злажылі.

Антон Сяргеевіч. Так, Сева, так. Папраўдзе кажучы, я таксама пасьля асьпірантуры ўсё больш на марксізм націскаў, але пачакай, вунь, паглядзі.

Сева *(глядзіць убок)*. Што, заварнуць?

Антон Сяргеевіч. Ну, давай.

Сева *(крычыць)*. Цётачка!.. Цётачка!.. Сюды… сюды варочайце!

## IV

Тыяжіцётка Гэля (зь вядром у руцэ).

Цётка Гэля. Чаго вам?

Сева. Спытаць тут у вас хочам.

Цётка Гэля *(ставіць вядро на зямлю)*. Ну, спытайце.

Сева. А як вас?

Цётка Гэля. Гэля я!

Сева. Гэля? Не, цётка Гэля! Вельмі прыемна. А я Сева. Дык вось што за справа — мы тут навукоўцаў хочам у вашу вёску закватараваць, у хаты, што кінутыя, і каго-небудзь гатаваць ім вячэры шукаем. Так знойдзем ці не? Ну вядома, ня проста так, а за грошы.

Цётка Гэля. А, за грошы знойдзеце! У нас, у калгасе, грошай як з год дзесяць ніхто ня бачыў, а толькі пэнсіянэры, як я.

Сева. Што вы кажаце?!. Ну а вы, напрыклад, змаглі б?

Цётка Гэля. І я, сынок, чаму ж, за грошы, не? Вось зараз, толькі парасятам дам *(ківае галавой некуды ўбок)*, яны ў мяне ў летніку стаяць, і калі ласка, вам што-небудзь намяшаю.

Сева. Не, дзякуй, нам ня трэба, мы ўжо перакусілі.

Цётка Гэля. А ну, шкада, а то б я зараз.

Сева. Не, не, ідзіце ўжо, гэта мы так, спыталі толькі, але як што, на вас будзем разьлічваць.

Цётка Гэля. Ага, ага, на мяне, сынок, на мяне. *(Бярэ вядро і адыходзіць.)*

## V

Антон Сяргеевіч і Сева.

Сева. Во, спраўная старая, а я ж вам казаў!

## VI

ТыяжіІван Іванавіч.

Іван Іванавіч. Па-па-памераў. Дакладаць?

Антон Сяргеевіч *(выцягнуўшы руку, чытае)*. Сто дваццаць пяць на трыццаць шэсьць з паловай.

Антон Сяргеевіч. Ага, гэта школа.

Іван Іванавіч. Але на ёй даху няма!

Антон Сяргеевіч. Як няма? Куды ён дзеўся?! Мы ж праяжджалі — як быццам быў, га, Сева?

Сева. Быў!

Іван Іванавіч. Ня ведаю. І вокан таксама!

Антон Сяргеевіч. І вокны былі!

Іван Іванавіч. Ага, і падлогі зь дзьвярыма, ніводнай дошкі!

Антон Сяргеевіч. О, а пошта?

Іван Іванавіч *(разьвёўшы ў бакі рукі)*. Зусім! Няма! Зьнікла!

Сева. А была, я ж шыльду на сьцяне бачыў!

Іван Іванавіч. Ні шыльды, ні сьценаў, нічога, адныя камяні!

## VII

Тыяжіцётка Гэля.

(з шыльдай «Почта», якую трымае абедзьвюма рукамі, выходзіць з аднаго боку і, не затрымліваючыся, ідзе на другі). *Да Севы.*

Цётка Гэля. Так ты, сынок, не забудзь, як што, на мяне, на мяне разьлічвай. *(Зьнікае.)*

Доўгая нямая паўза.

# Той, хто чакае ветру



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## УСЕВАЛАД СЬЦЕБУРАКА

***
той, хто чакае дажджу,
не пакрыўдзіць яго парасонам,
не схаваецца ў хату як далей,
ў пераход ці засцаны пад'езд.

той, хто чакае сонца,
не начэпіць на нос акуляраў,
не абмажацца брыдкім крэмам,
і ў салярый ня ступіць нагой.

той, хто чакае ночы,
не уключыць сьвятла ў пакоі,
не прыпыніцца пад ліхтарняй,
ці ў мігценьні рэклямнай лухты.

той, хто чакае ветру,
да яго ніколі ня сходзіць,
не зьняволіць яго у ветразь
і у млын, як каня, не ўпражэ.

той, хто чакае свой час,
не спытае: «калі ўжо нарэшце?»
не адкажа, што доўга зьбірацца
і няма дзе пакінуць ключы.

***
Я зьбягу ад вялікага гораду,
ад свайго невымоўнага болю.
Ня бярогся я восені змоладу —
гэта пекла ў тры жоўтыя колы.

Я зьбягу, далібог, як найдалей,
ніцма лягу з разьбегу ў траву.
Стану цененькай радыёхваляй
і далей ад этэру зьбягу.

Закручуся, як вожык, у лісьце
і прасплю у кубле да вясны.
Пэўна, гэта найлепшае выйсьце.
Вось цікава, ці сьніць вожык сны?..

***
Неба любіць ваду, бо бачыць у ёй сваё адлюстраваньне.
Вада любіць неба, бо глядзіць на яго, як на сябе.
Зямля любіць дождж, бо пасьпявае ў кроплі, што падае, паглядзець на свой адбітак.
Кропля любіць чалавечае вока, бо думае, што гэта маленькае неба.
І мала памыляецца, бо вока таксама нараджае кроплю

— сьлязу.

**АДАМ ГЛЁБУС**



## Сучасьнікі

### Севярынец і беларушчына

Маладафронтавец Павал Севярынец выдаў і прэзэнтаваў кнігу «Нацыянальная ідэя. Фэнамэналёгія Беларусі». Кніга пакідае супярэчлівыя ўражаньні, бо ў ёй рэтраспэкцыя пануе над перспэктываю. Севярынец бадзёра спрабуе падсумаваць дасягненьні беларусаў у мінулым і амаль не канструюе будучыні Беларусі, а калі і робіць спробы зазірнуць наперад, дык акрамя працягу малапрывабных і ўсім вядомых карцін мінуўшчыны нічога не вымалёўваецца. Асноўная памылка Севярынца, як і ягоных палітычных папярэднікаў — Вячоркі, Пазьняка ды Статкевіча, палягае ў тым, што блытаецца мінулае з будучым, замест сучаснасьці паказваецца гісторыя, замест рэальнасьці прапануецца тэатральнае дзеяньне. Замест таго каб мітынг-шоў ператварыць у жыцьцё, яны жыцьцё ладзяць, як тое шоў. Замест ператварэньня кнігі ў рэальнасьць Севярынец рэальнасьць спрабуе загнаць у форму кнігі — атрымліваецца мёртвая кніга пра мёртвыя зьявы. І не выпадкова ў Паўлавай кнізе зьявілася фактычная памылка. Ён піша, што пэсьце на Дзяды ў 1988 г. зладзіў Пазьняк. Севярынец памыляецца. Заяўку на шэсьце падало Таварыства маладых літаратараў «Тутэйшыя» за подпісамі Сыса, Бяляцкага ды іншых. Гэта было першае і адзінае шэсьце ў найноўшай гісторыі Беларусі, якое мела калясальныя геапалітычныя вынікі са станоўчымі рэзультатамі: дэканструкцыя СССР, прыманьне і паступовае замацоўваньне дэмакратычных каштоўнасьцяў на постсавецкай прасторы і новыя дзяржаўнасьці. Астатнія мітынгі і шэсьці ў Беларусі мелі тэатральны эфэкт. Акрамя тэлекарцінак і розгаласу ў мэдыйнай прасторы яны нічога не далі і не дадалі да беларускай ідэі, бо, паўтаруся, арганізатары ператваралі жыцьцё ў тэатар, а не тэатар у жыцьцё, з жывога яны рабілі мёртвае. Перакананы, Статкевіч і Пазьняк, Севярынец і Вячорка нават не ўсьведамлялі штучнасьці ўласнай дзейнасьці, але беларускаму палітычнаму жыцьцю ад гэткай шчырасьці і наіўнасьці ніякай палёгкі не было, дый цяпер няма.

# Знакі прыпынку



**УЛАДЗІМЕР НЯКЛЯЕЎ**

* * *

На вакзале з грузінам выпадкова пазнаёміўся — прыехаў з Масквы ў Хэльсынкі сыр купляць. 600 тон для пачатку. На фірме «Valio» яму сказалі: «У нас прадстаўніцтва ў Маскве — праз яго і купляйце».

Ён ашаломлены. «Слухай, дурдом! Я ім наўпрост жывыя грошы прапаную, а яны мяне сплаўляюць!.. Кажуць: мы не парушаем дамоўленасьці! Якія дамоўленасьці, калі жывыя грошы?..»

З такога гора пайшлі ў рэстаран. Афіцыянт гарэлку кілішкамі стаў насіць. Трыццаць грамаў у кілішку за пяць эўра. Пляшка абышлася, як білет да Масквы.

Зь яшчэ большага гора грузін захацеў станцаваць лезгінку. Аркестар — піяніст, кантрабасіст і ўдарнік… Яны не зразумелі нават, чаго ён хоча.

Вярнуліся на вакзал, выпілі ў бары піва. Грузін, як я ні супакойваў яго, расстройваўся ўшчэнт. «Слухай, няхай сыр не захацелі прадаць… Але не сыграць лезгінку?..»

Ён быў жывейшы за свае жывыя грошы… І раптам падумалася: колькі ж разоў слухаў я рэстаранную, заказаную аркестру, лезгінку? Сто, дзьвесьце, трыста?.. Ва ўсіх рэстаранах ад Берасьця да Хабараўску. А хто-небудзь, дзе-небудзь, калі-небудзь лявоніху заказаў?..

Наўрад ці. Я ня чуў.

* * *

Ідзём са Стасем у кнігарню, каб купіць яму якую-небудзь фінскую кнігу — ён ужо чытае трохі па-фінску, але толькі тое, што цікава. У кнігарні на стэндзе новых выданьняў стаіць сэрыйны томік Агаты Крысьці зь невядомай мне назвай: «Нікому не ўдалося ўратавацца». Бяром, каб паглядзець, а гэта «Дзесяць мурынчыкаў». Гаспадар кнігарні тлумачыць, што назва перакладзена ў адпаведнасьці з законам супроць расавай дыскрымінацыі. «Раней у нас, — кажа, — цукеркі былі, якія называліся «Пацалунак нэгра», цяпер яны проста «Пацалунак».

Я пытаюся:

— А чаму раман «Майстар і Маргарыта» Міхаіла Булгакава стаў раманам «Сатана зьявіўся ў Маскве?» Гаспадар сьмяецца, ён з гумарам: «Расейцаў закон супроць дыскрымінацыі не датычыць».

* * *

Восень 2004 году… Пад канец фінскага жыцьця праехаў на пачатку верасьня ўсю Фінляндыю з поўдня на поўнач — праз Тампэрэ, Ювэскюль, Оўлу, Раваніемі, Муонія, Кілпісьярві — да Тромсё ў Нарвэгіі. Самае нечаканае ў дарозе — зялёная даліна ў гарах уздоўж нарвэскіх фіёрдаў Ледавітага акіяну. Пасля пустой тундры Ляпляндыі пеpакочваеш за Кілпісьярві перавал — і раптам такое… Палі, гароды, выганы — толькі што вінаград не расьце. Вось табе і поўнач… Хоць і павявае ўжо сіберам — і паўночная ноч на падыходзе.

Нарвэгія — адзіная краіна ў сёньняшнім сьвеце, якая ня мае замежнага доўгу. Калі б толькі наяўныя грошы, якія там ёсьць, падзяліць на ўсіх нарвэжцаў зь дзецьмі ўключна, дык на кожнага б выйшла па сем мільёнаў эўра.

Краіна ня проста выглядае багата — яна багата жыве. Куфаль піва ў Тромсё каштуе амаль столькі ж, колькі ў Хэльсынкі паўлітэрак гарэлкі. У барах ня надта пасядзіш… Таму сеў я на беразе Ледавітага акіяну і — ад няма чаго выпіць — стаў капаць на берагавой лініі ямку. Далані на тры ў шырыню і даўжыню. Выкапаў і пайшоў, а ямку заліла вада.

Нібыта нічога ня сталася… Калі не лічыць таго, што павялічыў я паверхню Паўночнага Ледавітага акіяну. Далані на тры ў даўжыню і ў шырыню…

# ААНаўскія прысмакі

У Менску адсьвяткавалі 60-годзьдзе ААН.

60 год таму, у 1945 г., ратыфікавалі статут Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. З гэтай нагоды 24 кастрычніка менская Філярмонія сабрала палітычны і культурны бамонд сталіцы.

Наяўнасьць запрашэньняў пільна адсочвалі гарныя хлопцы, апранутыя ў парадныя шынялі, а пляцоўка перад уваходам была шчыльна застаўлена машынамі з дыпляматычнымі нумарамі. На адкрыцьці канцэрту з прывітальнымі словамі выступілі прадстаўніца ААН у Беларусі Джыхан Султанаглу і віцэ-прем'ер Андрэй Кабякоў. Пераклад першай зачытваўся на ўзорнай беларускай мове, другі па паперцы прамаўляў на чысьцюткай расейскай.

Мэта ААН — змаганьне за мір ва ўсім сьвеце. Пра гэта нагадвала вялізная белая птушка, што ў паўзах між выступамі лунала на экране ў глядзельнай залі. Хоць часам ААН папракаюць за празьмерную мяккасьць і бесканфліктнасьць — абы не было вайны. Вось і рэзалюцыя верасьнёўскай юбілейнай сэсіі ўтрымлівае прапанову Беларусі пра прызнаньне разнастайнасьці шляхоў прагрэсіўнага разьвіцьця, у тым ліку свабоднага вызначэньня народам палітычнага статусу. Эх, каб гэта сапраўды вызначаў народ, а ня той, хто кіруе ад яго імя…

Арганізатары права на разнастайнасьць інтэрпрэтавалі своеасабліва: два вядучыя (жанчына і мужчына) па чарзе прамаўлялі часткі сказу. Гэта даволі пашыраны прыём розных шоў, калі б не адно «але». Сакавіты, чыста беларускі пачатак сказу вядоўцы-мужчыны ў выдатным увасабленьні Аляксандра Памідорава з імпэтам падхоплівала яго калега на расейскай, працяг жа фразы зноў гучаў па-беларуску.

Стараньнямі канцэртных майстроў зьмяшаліся ў кучу ўзьнёслыя мэлёдыі балетнага аркестру, цыганскія матывы баяністаў, беларуская музыка «Крамы», расейска-беларускі Зьміцер Вайцюшкевіч, джаз «Стоксу» і касмапалітычны «Новы Ерусалім».

Ну і як пішуць у такіх выпадках беларускія газэты за мяжой, пасьля канцэрту ганаровых гасьцей чакала смачная пачостка.

**Арцём Лява**

# Новы ідэал мужчыны — юбэрсэксуал

Ва ўяўленьні аб ідэале сучаснага мужчыны адбыліся істотныя зьмены — месца жанчынападобных мэтрасэксуалаў занялі мужныя юбэрсэксуалы. Гэты тэрмін прыдумалі аўтары кнігі «Будучыня мужчыны», піша **«Гардыян»**.



WALLIMA.FREE.FR

**Паводле слоў аднаго з аўтараў гэтай манаграфіі, віцэ-прэзыдэнта кампаніі JWT Мар'яна Зальцмана, «юбэрсэксуалы ўпэўненыя ў сабе, яны мужныя і стыльныя, яны настроены на якасьць ва ўсіх сфэрах жыцьця».**
**Згодна з кнігай, для юбэрсэксуалаў характэрны традыцыйныя якасьці «сапраўднага мужчыны» — любоў да добрага віна, цыгараў, энэргічная гетэрасэксуальнасьць.**
**У адрозьненьне ад мэтрасэксуалаў, захопленых уласным іміджам, юбэрсэксуалы надаюць шмат увагі палітыцы і навакольнаму жыцьцю. Мэтрасэксуалы лічаць жанчын найлепшымі сябрамі. Юбэрсэксуалы паважаюць ці кахаюць, аднак дружбу лічаць за лепшае заводзіць з прадстаўнікамі свайго полу.**
**На журнальным століку мэтрасэксуала ляжаць часопісы «Вог» і «Касмапалітэн», а юбэрсэксуала — «Эканаміст» і «Нью-ёркер» (у выпадку Беларусі, выходзіць, «Белорусы і рынок» і «Наша Ніва»).**
**Аўтары кнігі знайшлі прыклады юбэрсэксуалаў сярод знакамітасьцяў. Гэта Джордж Клуні, Доналд Трампл, Пірс Броснан і Біл Клінтан. Самым яскравым юбэрсэксуалам кніга «Будучыня мужчыны» называе Бона — фронтмэна «Ю-Ту» і адначасова дабрачынцу. Знакамітыя мэтрасэксуалы Джуд Лоў і Дэвід Бэкхэм цяпер больш ня модныя.**
**У той жа час аўтары кнігі падкрэсьліваюць, што адраджэньне традыцыйных мужчынскіх каштоўнасьцяў не азначае вяртаньня да моды на «крутых пацаноў», што гавораць матам, не праяўляюць павагі да жанчын і саромеюцца любой праявы пачуцьцяў.**

## СПОРТ СЬЦІСЛА

### «Шахтар» — датэрміновы чэмпіён

У мінулую суботу салігорскі «Шахтар» за два туры да фінішу заваяваў залатыя мэдалі чэмпіянату Беларусі па футболе. 22 кастрычніка гарнякі ўпэўнена перамаглі на сваім полі жодзінскі «Тарпэда» — 4:0. Цяпер галоўная інтрыга нацыянальнага першынства палягае ў тым, хто заваюе сярэбраныя і бронзавыя мэдалі і, адпаведна, пуцёўкі ў Кубак УЭФА і Кубак Інтэртота.
На прызавыя месцы прэтэндуюць ажно шэсьць камандаў — «Дынама» (Менск), «Тарпэда» (Жодзіна), МТЗ-РІПА (Менск), БАТЭ (Барысаў), «Дняпро» (Магілёў), «Гомель».
Сёе-тое можа праясьніцца ў найбліжэйшую нядзелю (30 кастрычніка), калі на сталічным стадыёне «Дынама» туру згуляюць менскае «Дынама» і «Шахтар». Кіраўніцтва галоўнай арэны краіны зрабіла ўваход на стадыён бясплатным, дый сыноптыкі абяцалі ў гэты дзень пагоду. Пачатак матчу а 14-й.

### Кітайскі мур

Ну Кубку сьвету па настольным тэнісе, што прайшоў на мінулым тыдні ў бэльгійскім Льежы, Уладзімер Самсонаў заняў чацьвёртае месца. У турніры бралі ўдзел 16 наймацнейшых тэнісістаў сьвету, большасьць, па традыцыі, прадстаўнікі Азіі. Нягледзячы на падтрымку трыбун — Уладзімер гуляе таксама за бэльгійскі «Шарлераа», — у паўфінале беларус прайграў кітайцу Ван Хао, а ў матчы за трэцяе месца — ва ўпартай барацьбе ягонаму суайчыньніку, аднаму з самых тытулаваных тэнісістаў сьвету Ма Ліню ў шасьці сэтах. Нагадаем, што Самсонаў двойчы перамагаў у Кубку сьвету — у 1999 і 2001 гадах.

### Холіфілд вяртаецца

Пацьвярджаюцца чуткі пра тое, што былы чатырохразовы чэмпіён сьвету ў супэрцяжкай вазе Эвандэр Холіфілд, якому Майк Тайсан неяк адкусіў вуха, прадоўжыць сваю кар'еру ў Эўропе — Атлетычная камісія штату Нью-Ёрк адхіліла яго ад выступаў на прафэсійным рынгу ў ЗША. Холіфілду прапанавалі 17 сьнежня выступіць на турніры ў Нямеччыне.

### Раманаў шукае трэнэра

Літоўскі бізнэсовец Уладзімер Раманаў, уласьнік футбольнага холдынгу, што яднае клюбы «Хартс» (Эдынбург), «Каўнас» і МТЗ-РІПА (Менск), шукае новага галоўнага трэнэра для шатляндзкага клюбу. На пост галоўнага трэнэра «Хартсу» — Раманаў на днях выкупіў чарговую порцыю акцый эдынбургскага клюбу — разглядаецца некалькі кандыдатур, сярод іх такія знаныя футбольныя спэцыялісты як сэр Бобі Робсан ды італьянец Нэвіё Скала. Апошні таксама разглядаецца ў якасьці «коўча» нацыянальнай зборнай Беларусі. У будучы трэнэрскі штаб эдынбургцаў ужо ўвайшоў Вальдас Іванаўскас — экс-паўабаронца віленскага «Жальгірысу» і «Гамбургу». Ён будзе працаваць памочнікам галоўнага трэнэра.
Пасьля 11 тураў «Хартс» у чэмпіянаце Шатляндыі займае першае месца, апярэджваючы асноўнага канкурэнта «Сэлтык» (Глазга) на тры пункты. Леташні чэмпіён «Глазга Рэйнджарз» мае 20 балаў. Выдатна было б, каб эдынбуржцы перарвалі гегемонію клюбаў з Глазга.

**AP, belta.by, sport-express.ru**

## ІНФАРМАТАР


АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Пірсінг

**«Bodyart»**
630–00–60, 777–77–76
Тату, пірсінг.

**«Iron Brothers»**
вул.Куйбышава, 41
284–44–02, 684–78–64
Пэрманэнтны макіяж, пірсінг, аэраграфія.

**«Аляксандар-цэнтар»**
пр.Машэрава, 5
286–13–52, 686–13–52
Пэрманэнтны макіяж, пірсінг.

**Салён «Клеапатра»**
пр.Машэрава, 19 (гасьцініца «Юбілейная»)
226–91–40
Фотаэпіляцыя, тату, пірсінг.

**«У Лісіцы»**
вул.Багдановіча, 1
234–99–13
Тату, пэрманэнтны макіяж, пірсінг.

**ФАЦ «Даўгалецьце»**
вул.Жудра, 40
255–47–73, 621–51–71
Пірсінг.

**Салён «Харашуха»**
вул.Платонава, 1
236–76–21
Тату, пэрманэнтны макіяж.

## КАІСА

# Турніры, тэндэнцыі, творчасьць

Зоркавы час маладых знаўцаў шахаў і матаў зь Беларусі прыпаў на 2003 год — Сяргей Азараў стаў віцэ-чэмпіёнам сьвету да 20 гадоў, Сяргей Жыгалка — чэмпіёнам сьвету і Эўропы да 14 гадоў. Сёлета новая генэрацыя айчынных шахматыстаў выступіла «на Эўропе» зь меншым посьпехам — мэдалёў з Чарнагорыі не прывёз ніхто. 10-гадовая Наста Зязюлькіна апынулася на пачэсным 5-м месцы, ейная пагодка Наташа Кусянкова была 7-й. Прысутныя дзівіліся з таго, што гэтая вучаніца бабруйскага трэнэра Віктара Заўгароднягя ўмее захоўваць спакой у любых пазыцыях. Крыху расчаравалі старэйшыя хлопцы і дзяўчаты. Некаторыя зь іх загрузьлі ў ніжняй частцы турнірнай табліцы, што зь беларусамі наагул здараецца рэдка. Навапаўсталая зорка з Баранавіч, 11-гадовы Давід Хачыкян, узяў 4,5 ачка зь дзевяці — што праўда, змагаючыся ў групе да 14 год.

Сярод «дарослых» спаборніцтваў апошняга часу важнае месца займаюць беларуска-расейскі кубак у менскай СДЮШАР-11, бліскуча выйграны Юр'ем Ціханавым, клюбны чэмпіянат Эўропы ў італьянскім курортным мястэчку Сан-Вінсэнтэ, на якім знакамітая «Вясьнянка» ў складзе Сяргея Азарава, Андрэя і Сяргея Жыгалак, Яўгена Мачалава, Міхаіла Гінзбурга і Ўладзімера Куцанкова заняла 17 месца з 48-мі. Усё-такі яно даволі сьціплае ў параўнаньні зь леташняй «дзясяткай».

Увосень віцэ-чэмпіён Беларусі Юры Ціханаў зваяваў апошні гросмайстарскі бал, чэмпіён Менску Мікола Аляўдзін чарговы раз выканаў майстарскую норму. Аднак правілы, паводле якіх зацьвярджаюцца міжнародныя званьні, прадугледжваюць наяўнасьць пэўнага рэйтынгу: сп.Ціханаў яго мае, сп.Аляўдзін — пакуль не. На клюбным чэмпіянаце крокі да новага статусу зрабілі і браты Жыгалкі, і аматар бліцу Куцанкоў. Усё больш беларускіх гульцоў назапашваюць балы майстроў ды гросмайстраў. Тэндэнцыя ня можа ня цешыць — абы колькасьць перарастала ў якасьць.

Партыю «вясьнянкаўца» спэцыяльна для «НН» адкамэнтаваў міжнародны майстар Вячаслаў Чакураў зь Мінэнэргетыкі.



А.Жыгалка — Дж.Торнтан. Італія, 2005.

1. e4 e6 2. d4 d5 3. Кc3 Cb4 4. e5 c5 5. a3 Cc3+ 6. bc Кe7 7. Фg4 O-O 8. Cd3 Кg6?! 9. h4 f5 10. Фg3 Фc7 11. h5 Кh8 (пасіўна; заслугоўвала ўвагі 11…Кe7 12. Cd2 f4 13. Фh2 зь невялікай перавагай у белых) 12. Ch6 Кc6 (або 12…cd 13.cd Фc3+ 14.Крe2 Tf7 15.Кf3 b6 16.Thc1 — у белых лепш) 13. Кf3 c4 14. Ce2 b5 15. Cd2 a5 16. Фf4 Tb8 17. g4 fg 18. Фg4 Фf7 19. Tg1 Tb7 20. Ch6 Te8 21. Tb1 (можна і 21. Cg7 Фg7 22.Фh3 Кg6 23. hg hg 24. Кh4 Фh7 25. Tg6+ Tg7 26. Фg3 Tee7 27. Крd2, і атака белых павінна вырашыць партыю) 21…Tee7 (магчыма, трэба было шукаць шанцы на паратунак у варыянце 21…Фf8 22. Tb5! Tee7 23. Tc5, хаця і тут чорным нясоладка) 22. Cg7! Фg7 23. Фf4 (добра і 23.Фh3 Кg6 24. Кh4) 23…Кg6 24. hg hg 25. Кh4 Tf7 26. Фe3 Кe7 27. Кg6! (пункт g6 затрашчаў па швах) 27…Фg6 28. Tg6+ Кg6 29. Фg5 Крh7 30. Крd2 1-0.

**ВР**

### Як бы вы згулялі?

У.Кавалёў — А.Гіры. Герцэг-Нові, 2005. Чэмпіянат Эўропы U-12.

Ход чорных. Ці можна прагнаць фэрзя ходам 1…Cf8?

**Адказ:** Вядома, не. Пасьля 2. Фf8+ Крf8 3. Ch6+ Уладзік лёгка выйграў.

## ВАРТА БАЧЫЦЬ

### Пятніца, 28 кастрычніка

**БТ, 22.00**

«Бесьсьмяротныя: вайна сусьветаў».

Францыя—Італія—Вялікабрытанія, 2004, рэж. Энкі Білал.

Фантастыка, тэхнакомікс.

Над Мангэтанам лунае эгіпецкая піраміда, карпарацыя «Эўгеніка» крадзе людзей, у горадзе пануе забойца, а жанчыну з блакітнымі валасамі чакае сустрэча зь бесьсьмяротным Горам.

Нестандартная фантастыка ад Э.Білала, створаная паводле ягоных коміксаў. Кампутарная графіка, дэкарацыі будучыні — і рэальныя акторы.

**НТВ, 22.45**

«Тры каралі».

ЗША, 1999, рэж. Дэйвід Расэл.

Прыгоды.

Пасьля «Вайны ў заліве» чатыры амэрыканскія жаўнеры шукаюць у пустыні золата… У ролях: Джордж Клуні, Марк Уолбэрг, Айс К'юб, Спайк Джонз.

### Субота, 29 кастрычніка

**СТВ, 15.25**

«Плянэта бур».

Расея, 1961, рэж. Павал Клушанцаў.

Фантастыка паводле аповесьці Аляксандра Казанцава.

Рэдкі прыклад камэрцыйна пасьпяховай расейскай фантастыкі. На Вэнэры — вывяржэньні вульканаў, прыгоды на марскім дне, невядомыя жывёлы і экстрэмальныя сытуацыі.

Кароль жахаў Роджэр Кормэн набыў фільм для амэрыканскага пракату, а Пітэр Багдановіч перамантажаваў карціну ў «Вандроўку на плянэту дагістарычных жанчын».

**БТ, 19.25**

«Нешчасьлівыя».

Францыя, 2003, рэж. Франсіс Вэбэр.

Крымінальная камэдыя.

«Сур'ёзны таварыш» Рубі знаёміцца ў турме зь недарэкам Квэнтынам. Парачка мусіць выбрацца на волю, каб адпомсьціць «калегам» і знайсьці схаваныя грошы. Крымінальны дуэт складаюць Жэрар Дэпард'ё і Жан Рэно.

**СТВ, 0.10**

«На 10 хвілін старэй: віялянчэль».

Францыя—Вялікабрытанія—Нямеччына—ЗША—Гішпанія, 2002, рэж. Бэрнарда Бэрталючы, Жан-Люк Гадар, Майк Фігіс, Клер Дэні, Іржы Мэнцэль, Іштван Саба, Майкл Рэдфард, Фолькер Шлёндарф.

Драма, экспэрымэнт.

Восем культавых рэжысэраў у кароткіх навэлях увасабляюць сваё бачаньне часу…

### Нядзеля, 30 кастрычніка

**СТВ, 21.25.**

«Дзіўнае злачынства».

Францыя—Швайцарыя—Італія, 2004, рэж. Рабэрта Андо.

Трылер.

Слынны пісьменьнік шчасьлівы з жонкай і дачкой. Аднойчы герой праводзіць ноч зь пекнай незнаёмкай. На яго жах, высьвятляецца, што незнаёмка — нявеста ягонага сына…


WWW.TENMINUTESOLDER.CO.UK

У галоўнай ролі Даніэль Атой. Фільм — пераможца кінафэстывалю ў Авіньёне.

**БТ, 22.20**

«Вакол сьвету за 80 дзён».

ЗША—Нямеччына—Ірляндыя—Вялікабрытанія, 2004, рэж. Фрэнк Карачы.

Філеас Фог пайшоў у заклад, што аб'едзе сьвет за 80 дзён. Але, паколькі ролю Паспарту грае Джэкі Чан, то да жуль-вэрнаўскіх цяжкасьцяў дадаюцца: скрадзеная статуэтка Буды, кітайскія бандыты — і галаваломныя эпізоды баёў ды гумар ад Джэкі Чана.

**«Лад», 22.30**

«Кава і цыгарэты».

ЗША—Японія—Італія, 2003, рэж. Джым Джармуш.

Драма.

Стыльны чорна-белы фільм Дж.Джармуша, дзе розныя гісторыі аб'яднаныя кавай і цыгарэтамі, вытанчанай геамэтрыяй кадраў, халоднай ironіяй і бліскучай акторскай ігрой.

Джармуш здымаў 11 навэль цягам 18 гадоў. Штодзённыя анэкдоты становяцца байкамі зь лёгкім абсурдам, а за столікам кавярні разгортваецца жарсьці. У фільме здымаліся Рабэрта Бэніні («Жыцьцё цудоўна»), Біл Мюрэй, Стыў Бушэмі, рок-зорка Ігі Поп, Альфрэд Маліна («Шакаляд»), Стывэн Райт («Муза»). А Кейт Бляншэт сыграла адразу дзьве ролі — цнатлівай зоркі і яе нахабнай сястры.

Адна з навэль атрымала «Залатую пальму» Канаў.

**Андрэй Расінскі**


WWW.MOVIEWEB.COM

## ІМПРЭЗЫ

**29 кастрычніка а 14-й у музэі-сядзібе «Дом Ваньковічаў»** (вул.Інтэрнацыянальная, 33а) адбудзецца **імпрэза, прысьвечаная 400-годзьдзю Кіргольмскай бітвы.** Выступоўцы: прафэсар Анатоль Грыцкевіч, гісторык Алесь Казакоў, бард Зьміцер Сідаровіч. Уваход па музэйных квітках, пасьля імпрэзы — экскурсія па музэі.

## ВЫСТАВЫ

**Тэхна-арт**
**28 кастрычніка** а 17–й у мастацкай галерэі «Ўнівэрсытэт культуры» адбудзецца адкрыцьцё выставы «Тэхна–арт. Прастора жыцьця». Удзельнікі выставы — прафэсіяналы і аматары лічбавага мастацтва.

Маленькі Яраслаў і мудрасьць
У Цэнтральнай бібліятэцы Бону (Нямеччына) працуе выстава 12–гадовага беларускага мастака Яраслава Сафонава, якая называецца «Маладосьць і мудрасьць».

**Славацкія мастакі**
У Нацыянальным мастацкім музэі (Леніна, 20) **да 30 лістапада** — выстава «Сучасны славацкі жывапіс і скульптура».

**Шагал у чорна-белым**
**Да 1 лістапада** ў Нацыянальным музэі гісторыі і культуры (Маркса, 12) — выстава твораў Марка Шагала «Колер у чорна–белым». Квіткі: 2 000.

## ТЭАТРЫ

**Опэра**
*На сцэне Цэнтральнага дому афіцэраў*
**1** (аўт) — «Сэвільскі цырульнік».
**2** (ср) — «Травіята».
**3** (чц) — «Рыгалета».
**4** (пт) — «Царская нявеста».
**5** (сб) — вечар старажытнай музыкі.
*На сцэне Белдзяржфілярмоніі*
**6** (ндз) — творчы вечар заслужаных артыстаў Рэспублікі Беларусь Тамары Глаголевай і Ўладзімера Пятрова.

**Купалаўскі тэатар**
**27** (чц) — «Чычыкаў».
**28** (пт), **2** (ср) — «Каханьне ў стылі барока».
**29** (сб) — «Парфён і Аляксандра».
**31** (пн) — «Ажаніцца — не жырыцца».
**3** (чц) — «Таполевая завея».
**4** (пт) — «Івона, прынцэса Бургундзкая».
**5** (сб) — «Дзіўная міс Сэвідж».
**6** (ндз) — «Смак яблыка».
**Ранішнія спэктаклі**
**30** (ндз) — «Афрыка».
**6** (ндз) — «Паўлінка».
**Малая сцэна**
**29** (сб) — «Муж для паэткі».
**30** (ндз) — «Баляда пра каханьне».
**3** (чц) — «Дзікае паляваньне караля Стаха».
**6** (ндз) — «Варшаўская мэлёдыя».

**Тэатар беларускай драматургіі**
**29** (сб) — «Чорны квадрат».
Тэатар імя Горкага
**27** (чц) — «Зьвеставаньне Марыі».
**28** (пт) — «Перад захадам сонца».
**3** (чц) — «Адзіны спадчыньнік».
**6** (ндз) — «Дзядзькаў сон».
**Музычны тэатар**
**27** (чц) — «Баядэра».
**28** (пт) — «Жанчына–кажан».
**30** (ндз) — «Каралева чардашу».

**3-ці Міжнародны тэатральны фэстываль «Залаты Віцязь»**
*На сцэне Тэатру юнага гледача*
**28** (пт) — «Я — твая нявеста» *(Магілёўскі драматычны тэатар).*
**2** (ср) — «Ванька, глядзі» («Да трэціх пеўняў» В.Шукшына, *Іркуцкі муніцыпальны тэатар народнай драмы*).
**3** (чц), 12.00 — «Хатні тэатар нянечкі Арыны» *(Ленінградзкі абласны тэатар лялек).*
**3** (чц), 19.00 — «Позьняе каханьне» *(Цэнтральны акадэмічны тэатар расейскай арміі).*
**На сцэне Тэатру беларускай драматургіі**
**27** (чц) — «Трыбунал».
**30** (ндз), 12.00 — «Вельмі простая гісторыя» *(Саратаўскі тэатар юнага гледача).*
*На сцэне Тэатру лялек*
**1** (аўт) — «Жураўліныя пёры» *(Мурманскі тэатар лялек).*
**2** (ср) — «Лятаючы парсюк», «Гусі–лебедзі».
**3** (чц) — «Прыстанак» *(Іванаўскі тэатар лялек).*

## СЛАВАЦКІЯ ДНІ

**Тыдзень цэнтральна-эўрапейскага фільму**
Кінапаказы штодзённа з 15–й па 19–ю **з 1 па 7 лістапада** ў Палацы мастацтваў (вул. Казлова, 3). У праграме заяўлены стужкі «118 дзён у палоне лёду», «Прапэлер», «Гэй вы, славакі!», «Я — ніадкуль» і інш.
**2 лістапада** (пачатак а 9.45) у Беларускім дзяржаўным унівэрсытэце культуры (вул. Рабкораўская, 17) прарэктар Вышэйшай школы музычнага мастацтва ў Браціславе Марцін Ціэл прачытае лекцыю «Сучасны дакумэнтальны фільм Цэнтральнай Эўропы». Пасьля лекцыі дэманстрацыя фільму «66 сэзонаў».

## СПОРТ

**Чэмпіянат Беларусі. 25-ты тур**
**30 кастрычніка** (нядзеля)
«Гомель» — БАТЭ (Барысаў).
«Дынама» (Менск) — «Шахтар» (Салігорск).
«Тарпэда» (Жодзіна) — «Дняпро–Трансмаш» (Магілёў).
«Зорка–БДУ» (Менск) — МТЗ–РІПА (Менск).
«Нафтан» (Наваполацак) — «Славія» (Мазыр).
«Дарыда» (Ждановічы) — «Лякаматыў» (Менск).
«Дынама» (Берасьце) — «Нёман» (Горадня).

**Хакей. Чэмпіянат Беларусі**
**28 кастрычніка** (пятніца)
«Юнацтва» (Менск) — «Керамін» (Менск).
«Хімвалакно» (Магілёў) — «Дынама» (Менск).
«Гомель» — «Хімік–СКА» (Наваполацак).
«Нёман» (Горадня) — «Мэталюргс» (Ліепая).
«Берасьце» — «Рыга–2000»
Пачатак а 18.30.



ВЕРАНІКА ДЗЯДОК

## КЛЮБНАЕ ЖЫЦЬЦЁ

**«Bronx»** (288–10–61, 103 і 105 («Velcom»)
**27** (чц) 22.00 — жывая музыка: квартэт «Port Monet» / dj Kudesnikov.
**28** (пт) 22.00 — жывая музыка: «Flat» / dj Top .
**29** (сб) 22.00 — «Sin City»: dj Arram Mantana (SPB), dj Arsenti Tchouprina.
**30** (ндз) 17.00 — нядзельны кінасэанс.
**«Izюм»** (206–66–18, 605–25–25)
**27** (чц) 23.00 — «RNB Royalty Party»: dj Gaamer, dj Induss.
**28** (пт) 21.00 — «Topless party».
**29** (сб) 22.00 — «Halloween»: dj Nevsky (Баўгарыя), dj Lexa, «Horrible Room Show».
**30** (ндз) 21.00 — жывая музыка / дыска–праграма.
**«Белая вежа»** (336–70–75)
**27** (чц) 23.00 — «White Tower»: dj Top, dj Bergamo.
**28** (пт) 23.00 — dj Alex.
**29** (сб) 1.00 — dj Dee.
**30** (ндз) 23.00 — жывая музыка: «Acoustic Band» / dj LP aka Al Paliony, dj Alex.
**«X-Ray»** (203–93–55)
**28** (пт) 23.00 — «X–Ray's Black Sabbath»: dj Andry Nalin (Bush II Bush, DE) dj Noche.
**29** (сб) 22.00 — dj Grey.
**«WestWorld»** (239–17–98)
**28** (пт) 23.00 — dj LP aka Al Palione.
**29** (сб) 23.00 — dj Noche.

## КІНО Ў МЕНСКУ

**«Аўрора»** (253–33–60)
«9–я рота»***: **28** (пт) 13.30, 16.00, 18.30, 21.00; **29, 30** (сб, ндз) 11.00 (іл), 13.30, 16.00, 18.30, 21.00.
«Правілы сэксу–2: хэпі–энд»***: **28** (пт) 18.50, 21.10; **29, 30** (сб, ндз) 16.30, 18.50, 21.10.
«Птушкі–2: падарожжа на край сьвету»: **28** (пт) 17.00; **29, 30** (сб, ндз) 14.50.
**«Бярэсьце»** (272–87–91)
«Саракагадовы нявіньнік»***: **28—30** (пт—ндз) 16.30, 18.50, 19.20, 21.10.
«Турэцкі гамбіт»: **28—30** (пт—ндз) 14.00.
**«Дом кіно»** (266–35–26)
«Калі сьвякроў — монстар»: **28—30** (пт—ндз) 17.00, 19.00, 21.00.
**«Дружба»** (240–90–13)
«Перавозчык–2»: **28—30** (пт—ндз) 16.30 (іл), 19.00, 21.00.
**«Кастрычнік»** (232–93–25)
«9–я рота»***: **28** (пт) 13.40, 16.00, 18.30, 21.10; **29, 30** (сб, ндз) 13.40 (іл), 16.00, 18.30, 21.10.
**«Масква»** (203–14–48)
«9–я рота» (прэм'ера): **28** (пт) 16.00, 18.40, 21.10; **29, 30** (сб, ндз) 13.30 (іл), 16.00, 18.40, 21.10.
**«Мір»** (288–22–33)
«Правілы сэксу–2: хэпі–энд»***: **28—30** (пт—ндз) 17.00, 19.10, 21.30.
«Саракагадовы нявіньнік»***: **28—30** (пт—ндз) 18.20, 20.30.
«Перакладніца»: **28—30** (пт—ндз) 16.00.
**«Перамога»** (203–77–66)
«Мандэрлей»***: **28** (пт) 14.00; **29, 30** (сб, ндз) 13.50 (іл), 16.20.
«Саракагадовы нявіньнік»***: **28** (пт) 16.40, 21.10; **29, 30** (сб, ндз) 19.00, 21.10.
**«Піянэр»** (227–64–87)
«Браты Грым»****: **28** (пт) 18.40, 21.00; **29, 30** (сб, ндз) 16.00, 18.40, 21.00.
**«Цэнтральны»** (200–34–16)
«Перавозчык–2»: **28** (пт) 11.00, 12.50, 14.40, 19.00, 21.00; **29** (сб) 17.00, 19.00, 21.00; **30** (ндз) 12.50 (іл), 14.40 (іл), 19.00, 21.00.
«Красуні»: **28, 30** (пт, ндз) 16.30.

(2с) — кінафільм падоўжанай працягласьці
(іл) — ільготны сэанс (зьніжка 50% для ўсіх гледачоў)
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 гадоў не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 гадоў.


WWW.WOODYOULIKEIT.COM

# Halloween

**31 кастрычніка** а 18–й у клюбе «Рэактар» пройдзе фэст «Halloween» з удзелам гуртоў «Asguard» (Магілёў), «Znich», «Soulsides», «Aeon noctis», «Nasha vajna» (новы праект музыкаў гурту «Камаедзіца»), «Articulo mortis» і інш. У праграме: пэрфомансы, конкурсы. Кожнаму, хто прыйдзе ў касьцюме, ў падарунак касэта з запісамі мэтал–гуртоў!

**Т.: 649-08-88, 766-24-25.**

## ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ

**Тэатар**
**Тэатар лялек**
**29** (сб) **30** (ндз) — «Чараўнік Смарагдавага гораду».
**4** (пт) — «Ганэле».
**5** (сб) — «Прыгоды алавяннага салдаціка, пастушкі і камінара».
**6** (ндз) — «Чароўная лямпа Алядына».
**Тэатар юнага гледача**
**27** (чц) **1** (аўт) — «Каліф–шавец».
**29** (сб), **2** (ср), **4** (пт) — «Залатое сэрцайка».
**30** (ндз) 11.00, 14.00, **5** (сб) — «Сястра мая Русалачка».
**30** (ндз) 19.00 — «Апошняя дуэль».
**31** (пн) — «Рыцар Ордэну Сонца».
**6** (ндз) — «Неймаверныя прыгоды Мішуткі і ягоных сяброў у краіне казак».
**Музычны тэатар**
**29** (сб) — «Айбаліт–2002».
**30** (ндз) — «Бурацiна.by».
**Кіно**
**«Аўрора»**
«Чароўны востраў»: **29, 30** (сб, ндз) 11.30.
«Прышэлец з космасу»: **28** (пт) 14.30; **29, 30** (сб, ндз) 13.10.
**«Бярэсьце»**
«Атлянтыда: згубленая імпэрыя»: **29, 30** (сб, ндз) 12.00.
**«Дом кіно»**
«Шрэк–2»: **28** (пт) 15.00; **29, 30** (сб, ндз) 12.00.
**«Дружба»**
«Лемані Сьнікет: 33 няшчасьці»: **28** (пт) 12.00, 14.30.
«Мой брацік — сабачка» (прэм'ера): **29, 30** (сб, ндз) 11.00, 13.00, 15.00.
**«Мір»**
«Дзеці шпіёнаў 3D: гульня скончана»: **29, 30** (сб, ндз) 13.00.
«Бэтмэн: пачатак»: **29, 30** (сб, ндз) 13.00.
**«Перамога»**
«Мадагаскар»: **29, 30** (сб, ндз) 12.00.
**«Піянэр»**
«Ледавіковы пэрыяд»: **28** (пт) 12.00; **29, 30** (сб, ндз) 12.30.
«Як Майк»: **28** (пт) 14.30; **29, 30** (сб, ндз) 14.20.
«Нязнайка на Месяцы»: **29, 30** (сб, ндз) 10.30.
**«Цэнтральны»**
«Джынсы–талісман»: **30** (ндз) 11.00.

## КІНО НА DVD

**Master Records**
**«Aaltra»**
Дарожны фільм, камэдыя, Бэльгія, 2004, рэж. **Бэнуа Дэльпэн, Густаў дэ Кервэрн.**
У ролях: **Бэнуа Пульвурдэ, Бэнуа Дэлепэн, Гюстаў дэ Кервэрн, Мішэль дэ Гаўр.**
Празь няшчасны выпадак з камбайнам «Aaltra» два галоўныя героі сталіся нерухомымі інвалідамі. Яны адпраўляюцца ў вандроўку па ўсёй краіне…
Прыз «Фіпрэсі», намінацыі Ратэрдамскага і Капэнгагенскага кінафэстываляў.

**Менск, Кісялёва, 12, 643-21-08**

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# Расейскі «Ўзвод» называецца «Ротай»

**«9-я рота».**

Расея—Украіна, 2005, каляровы, 140 хв.

**Жанр:** ваенны фільм.

**Адзнака:** 6 (з 10).


WWW.KINOMANIA.RU

1980–я. Аўганістан. 9–я рота мусіць трымаць вышыню да праходу калёны. Але на вайскоўцаў забываюць.

Фёдар Бандарчук абапіраўся на кінаспадчыну свайго славутага бацькі. І на «Ўзвод» Олівэра Стоўна. А таксама на Зыгмунда Фройда, якога згадвае навабранец–мастак. Палкавая німфаманка Беласьнежка, узмакрэлыя целы, размовы пра дзявочыя спаднічкі. Імпульсы жыцьця й сьмерці пад маскамі выпісаных тыпажоў: дзетдомавец, кантужаны прапаршчык… Эпізадычную ролю вайскоўца стомлена сыграў Станіслаў Гаварухін.

Знакаміты пецярбурскі перакладчык фільмаў Гоблін абвінавацiў стужку Ф.Бандарчука ў паражэнскіх настроях і недакладнасьці. Дарэмна. Калі ў амэрыканскіх карцінах героі сьцьвярджаюць індывідуалізм насуперак мясарубцы, то сучасны расейскі герой ратуецца ў савецкім калектывізьме. «Мы перамаглі», — кажа адзіны, хто выжыў. 9–я рота здольная перамагаць і далей, вось толькі Гарбачоў войскі павыводзіў.

У цэлым — гэта адзін з найлепшых расейскіх фільмаў апошніх гадоў.

**Андрэй Расінскі**

# Вяртаньне хулігана

ЛЕВЫМ ВОКАМ



З пачуцьцём глыбокага задавальненьня выслухаў прэзыдэнцкую справаздачу аб раскрыцьці віцебскай справы. З таямнічымі выбухамі піўных бляшанак пакончана.
Фэльетон **Лёліка Ушкіна**.

Больш за ўсё ў прэзыдэнцкім «Элемэнтарна, Уотсан» прыкалола ня тое, што фраяркоў так хутка ўпакавалі, а сацыяльная прырода злачынства.

За тэрактамі стаялі не варагі-чачэнцы і ня Нэо з Марфээм — баевікі з «Народна-вызваленчага войска», якія нарэшце знайшлі выхад з матрыцы. Віцебскімі Равашолямі аказаліся нейкія «ахламоны».

У сьвятле сказанага віцебскія выбухі можна лічыць новай старонкай у гісторыі беларускага тэрарызму. Раней матывы несьці пiратэхніку ў масы былі выключна палітычнымі або матэрыяльнымі. Грынявіцкі, кідаючы «machine infernale» ў царскі членавоз, марыў пра народніцкі сацыялізм. Кілер 1990-х, чакаючы ў засадзе кліента, будаваў паветраны замак — прыкінуцца ў малінавы лапсэрдак і ахамуціцца залатым ланцугом. Віцебскімі тэрарыстамі рухала жаданьне чыста псыхалягічнай сатысфакцыі. Такое пачуцьцё немагчыма атрымаць, адкапаўшы Аўгустоўскі канал, зрабіўшы з ворага біфштэкс у «Mortal Kombat: Shaoling Monks» ды выкаціўшы 0,7 «крыжачка». Прыход кайфу гарантуе толькі парушэньне артыкулаў крыміналкі. Ва ўсім сьвеце такая сацыяльная зьява называецца хуліганствам.

Паглядзіце на файл братоў М., якія падазраюцца ў арганізацыі выбухаў: адзін гарбаціцца на заводзе, другі — на рынку. Калі прыняць вэрсію шызы, трэба ўтылізаваць усю сыстэму адукацыі і сацыялізацыі, якая плодзіць тэрарыстаў, а потым яшчэ ўладкоўвае іх на прадпрыемства. Напэўна, трэба даць поўху і БРСМ, сябрамі якога, хутчэй за ўсё, былі віцебскія браты Гафс.

У прынцыпе, дзяржава павінна толькі вітаць рэнэсанс хуліганства. Хуліган — неад'емны спадарожнік добрых савецкіх часоў, куды так прагне Лукашэнка. У каўбасныя часы Брэжнева самым модным паратункам ад нудоты было спаліць кнопкі ў ліфце і накрэмзаць угары: «Фантамас».

Змагацца з хуліганамі немагчыма: іх крыніца — сама сыстэма. Таму ў саўку прыдумалі вельмі клясны ход — раскручвалі вобраз «патрыятычнага хулігана»: дробны злачынец, апынуўшыся перад дылемай: прадаць Радзіму і зарабіць мех грошай або застацца верным рашэньням зьезду КПСС, — выбіраў апошняе.

Нашы мандарыны таксама асуджаны заняцца стварэньнем «ляяльнага ахламона». Першым крокам можа быць судовы працэс над М. У працэсе слуханьняў раптам магло б усплыць, што адна зь пякельных бляшанак прызначалася фашыстам зь віцебскага «Фонду Сапегі», якія хацелі замуціць відавочна антыбацькоўскі «сэмінар рэдактараў незалежных бюлетэняў».



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Ад зімовага грыпу можна засьцерагчыся. На фота: прышчэпку дзеткам робяць у Менскай паліклініцы №1, што на Залатой Горцы.**

**Турыстычная кампанія Smart**
Ліцэнзія №02310/0278094 выдадзеная 4.04.2005
Паважанае спадарства!
Запрашаем усіх у цікавае падарожжа.
**Тры дні ў памаранчавым КІЕВЕ!**
Разам мы пабачым Майдан Незалежнасьці, Пячорскую лаўру, Сафійскі сабор…
Усё гэта адбудзецца з **4 па 8 лістапада**.
Кошт: 65 у.а.+ 5000 рублёў.
**Т. 284–74–79, 288–29–54.**

**ЗАПРАШАЕМ У ПАДАРОЖЖА**
**30 кастрычніка** (нядзеля):
Глыбокае—Дзісна—Дрыса (Верхнядзьвінск)—Бігосава—Вопытнае—Росіца—Шар'я—Асьвея
**5—6 лістапада:**
Вільня—Трокі—Меднікі
**12—13 лістапада:**
Вільня—Трокі—Меднікі
**т.: 232-54-58, 622-57-20 (Зьміцер), 264-12-38, 776-24-35 (Павал)**

Ліцэнзія №02310100189 ад 24 траўня 2001 году
**АЛЬТУС ПЛЮС**
**Край азёраў, касьцёлаў, паркаў**
**30 кастрычніка**
**Мядзел—Нарач—Камаі—Паставы**
Камаі — касьцёл Сьв.Яна Хрысьціцеля (1603—1606 гадоў), помнік абарончай архітэктуры Беларусі. У нашыя дні тут гучыць арганная музыка...
Паставы — вадзяны млын. Палац Тызэнгаўза.
Касьцёл Сьв.Антонія Падуанскага.
І пад канец — заезд на стравусіную фэрму, дзе ў адкрытых вальерах пасьвяцца стравусы, бегаюць рознакаляровыя трусы і нават жыве горны казёл Боцік.
Побач — кавярня, дзе можна набыць экалягічна чыстыя сыры, масла, стравусіныя яйкі і мяса.
**Кошт туру — 35000**
**«Альтус Плюс» г. Менск, вул. Кастрычніцкая 5-320 (к/з «Менск»), т. 222 46 51, GSM 762 72 33, www.vandrouka.com**

## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

### ВІТАНЬНІ

**Віншуем вэтэрана** «Нашай Нівы» Севярына Квяткоўскага і яго жонку Вольгу з нараджэньнем сына Дамініка. Нашаніўцы

**Горадня віншуе** Валеру Кісяля з днём народзінаў!

**Veranička!** Vinšuju Ciabie z Dniom narodzinaŭ! Ździajśnieńnia ŭsich tvaich maraŭ i usiaho Tabie samaha najlepšaha! Cudoŭnaha nastroju! Kachaju! Michaś

**Vinšuju** Nadzieju Radziuk z Dniom narodzinaŭ! Žadaju joj ździajśnieńnia ŭsich maraŭ i ŭsiaho samaha najlepšaha! Cudoŭnaha nastroju! Michaś

### КАНТАКТЫ

**Мянчук**, 44 гады (выглядаю маладзей), рост 170, в/а, пазнаёміцца зь беларускай (узрост да 40 гадоў)! Магчыма стварэньне сям'і. А/с 6, 220012. Менск

**Калі Вы маеце** жаданьне атрымаць дыплём, які прызнаецца ў краінах ЭЗ, цікавіцеся культурнай спадчынай і турызмам, валодаеце нямецкай ці францускай мовай, зазірніце на сайт ehu-international.org, вывучыце прапанову, а затым зарэгіструйцеся на сайце ehu.elearn.ru і вучыцеся дыстанцыйна

**За Беларусь** пад сьцягам Хрыста! www.mfront.net. Т.: 755–69–90, 383–48–14

### КНІГІ, МУЗЫКА

**Беларускія дакумэнтальныя** ды мастацкія фільмы на CD, мультфільмы на відэакасэтах, музычныя CD ды касэты, кнігі, слоўнікі, энцыкляпэдыі, навучальныя дапаможнікі на Румянцава, 13 (ТБМ). Панядзелак—пятніца (15.00—19.00). Т.: 234–93–71, 707–40–01

**Прадам кнігі**: «Беларуска–польскі размоўнік», «Энцыкляпэдыя гісторыі Беларусі», 1—5 т., «Беларуска(крыўска)–расейскі слоўнік» Ластоўскага, «Беларуска–расейскі слоўнік» Байкова й Некрашэвіча (1926), «Быкаў на Свабодзе», «Этымалягічны слоўнік беларускай мовы», 6–ты том, ды шмат іншага, багаты выбар кнігі па гісторыі, архітэктуры; паэзія, мастацкія. Т.: 753–70–05

**Кнігаабмен:** Т.: 753–91–96

**Беларускае аўдыё**. «Старажытная зямля», калекцыя беларускіх касэт, CD, у тым ліку аўтэнтычны фальклёр, «Я нарадзіўся тут», сучасная і архаічная музыка. Т.: 753–91–96

**Пэрыёдыка**: шматгадовы камплект часопісаў «Крыніца», розныя нумары «Студэнцкай думкі», «ARCHE», газэты «Новы час», «Наша слова», беластоцкай «Нівы», што–небудзь падару. Т.: 753–91–96

**Прапаную**: «Беларускі клясычны правапіс», «Наша Ніва» (факс. выд.), «Матэматычную энцыклапэдыю», дзіцячыя кніжкі, пісаныя клясычным правапісам, камплект падручнікаў па старабеларускай, старарускай мовах і іншае. Т.: 753–91–96

**«Сьпіс землеўладальнікаў Менскай губэрні»**, «Міндаў, кароль Літовіі» (стасункі ВКЛ і Паўночнага ордэну), мэтрыкі. Т.: 753–91–96

**Пераклады**: кнігі, перакладзеныя з польскай, ангельскай, нямецкай, расейскай моў, у тым ліку «Дзяды», «Санэты» Міцкевіча, падручнікі па журналістыцы і іншае. Т.: 753–91–96

### ПРАЦА

**Якасна выканаю** пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя пасьля 17.00. Т.: 235–18–72. Юры

**Шукаю майстроў** для рамонту ваннага пакою ды туалету (пакласьці кафлю, зьмяніць сантэхнічнае абсталяваньне) у менскай кватэры. Чакаю прапаноў. Алесь Кушнер. Пішыце на aliaksandr_kushner@me.by

## «НН» 100 ГАДОЎ З ВАМІ

### Зь Беларусі й Літвы

В.**Прыдруйск**, Віцебск. губ. Дрыс. пав. Пачтовы аддзел у Прыдруйску заменены цяпер на пачтова–тэлеграфічны. Гэта справа даўно ляжала на сэрцы нашым жыцелям, бо выходзіла вялікая невыгода ад няхваты тэлеграфу.

**Пінск**, Менск. губ. Памешчык Завадзкі рупіцца, каб адкрыць у Пінскім павеце Вышэйшую сельска–гаспадарчую школу. Завадзкі дае на гэта дом і 40 дзесяцін зямлі.

### З усіх старон

У **Луганску** гарадавы Носач, катарага судзілі за зьдзекаваньне над 60–гадовай старухай, засуджаны на 4 гады ў турму.

**1910, №40**

## ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Г.В. зь Менску.** Ваш водгук на артыкул А.Фядуты пра кнігі Р.Барадуліна цалкам асабісты. Да таго ж, здаецца, Вы няўважліва прачыталі артыкул, які Вас абурыў. Друкаваць ня будзем, перадамо аўтару.

**Наша Ніва**
незалежная газэта
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фотарэдактар | Арцём Лява |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| мастацкі рэдактар | Сяргей Харэўскі |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**
© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.
**Наклад 3382**. **Газэта выдаецца 48 разоў на год**.
Нумар падпісаны ў друк 20.00 26.10.2005.
Замова № 6160.
Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а